ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Літаратура і мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 26 (2812) • Пятніца, 25 чэрвеня 1976 г. • Цана 8 кап.

*Партыйны падыход да пытанняў літаратуры і мастацтва спалучае чулыя адносіны да мастацкай інтэлігенцыі, дапамогу ў яе творчых пошуках з прынцыповасцю. Галоўным крытэрыем ацэнкі грамадскай значнасці любога твора, зразумела, была і застаецца яго ідэйная накіраванасць.*

Л. І. БРЭЖНЕЎ.

(Са Справаздачнага даклада ЦК КПСС XXV з'езду партыі).

## VI З'ЕЗД ПІСЬМЕННІКАЎ СССР

**Г. М. МАРКАЎ: «Савецкая літаратура ў барацьбе за камунізм і яе задачы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС».**

(Стар. 3–5).

**МАКСІМ ТАНК: «Слова служыць народу».**

(Стар.7).

У час адкрыцця VI з'езда пісьменнікаў СССР. Тэлефота ТАСС—БЕЛТА.

Пятрусь БРОЎКА

## ЖЫВУ ЗАДУМАМІ ТВАІМІ

Жыву задумамі тваімі,
З табой раблюся маладым.
Трымай мяне, трымай, Радзіма,
Заўсёды ў спісе баявым.

Я непахіснае натуры,
І не застыла ў сэрцы кроў,
Я не збаяўся злоснай буры,
А трэба — выстаю ізноў.

Твой дзень — мой дзень.
Жыву адзіным —
Дзе б я ні быў, хай збліз, здалёк,
Хачу ў тваёй хадзе няспыннай
Пачуць і свой упарты крок.

А ты ўзляцела ў паўнакрыллі,
Перад табой увесь Сусвет;
Калі ж чаго не дарабілі
Рабочы, творца, я, паэт, —

Даробім, створым, каб надзейна
Наш красаваўся новы дом.
Радзіма, будзь у гэтым пэўна,
Клянёмся мы табе жыццём.

І я з задумамі тваімі
Жадаю быць перадавым.
Трымай мяне,
Трымай,
Радзіма,
Заўсёды
У спісе баявым.

# БІБЛІЯТЭКА—ПРАПАГАНДЫСТ

Вялікую прапагандысцкую работу праводзіць Магілёўская бібліятэка № 7. У вусным часопісе «Наш лад жыцця—савецкі», прынялі ўдзел дэлегат XXV з'езда КПСС кавалер ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР прадзільшчыца вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» імя У. І. Леніна З. Бандарэнка і дэлегат XXVIII з'езда КПБ, Герой Сацыялістычнай Працы брыгадзір будтрэста № 12 А. Старавойтаў. Яны падзяліліся ўражаннямі ад работы з'ездаў, расказалі пра тое, як дабіліся працоўных поспехаў.

Аб заслугах будаўнікоў у аднаўленні роднага Магілёва ішла гаворка на вечары «У тваім багацці, Радзіма,—багацце кожнага з нас», які адбыўся ў інтэрнаце будтрэста № 12. Тэматычная канферэнцыя «Ленін, час, мы» прайшла ў сярэдняй школе № 2, а для работнікаў абутковай фабрыкі быў падрыхтаваны ленінскі ўрок «КПСС — выхавацель новага чалавека».

У прапагандзе гістарычных рашэнняў партыі актыўны ўдзел прымаюць работнікі бібліятэкі Л. Чугай, І. Безчарэўных, Н. Левіна.

І. ПРОНІНА.

# ДАСЛЕДВАЛІСЯ ЎЗАЕМАСУВЯЗІ

Трэцяя навуковая канферэнцыя, прысвечаная пытанням беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемасувязей, адбылася нядаўна ў Сумах. У яе рабоце прынялі ўдзел вучоныя Украіны і Беларусі, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў і даследчых інстытутаў.

З дакладамі і паведамленнямі выступілі доктар філалагічных навук, прафесар Сумскага педінстытута імя А. С. Макаранкі П. Ахрыменка, кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык Брэсцкага педінстытута імя А. С. Пушкіна Ц. Ліякумовіч, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Запарожскага педінстытута В. Чабаненка і іншыя.

Удзельнікі канферэнцыі пазнаёміліся са славутымі мясцінамі Сумшчыны.

# ШЛЯХІ БАЦЬКОЎ—ДАРОГІ СЫНОЎ

Больш за тысячу юных ленінцаў Беларусі—пасланцоў лепшых піянерскіх дружын—сабраліся ў Мінску 22 чэрвеня на свой урачысты збор. На гэта выдатнае свята да вучняў прыйшлі дарагія госці — дэлегаты XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, байцы батальёна беларускіх арлянят, спартсмены-алімпійцы, школьнікі з мужнага горада Газлі, якія адпачываюць у піянерскіх лагерах нашай рэспублікі.

Ля слаўных піянерскіх сцягоў рапартавалі Радзіме, партыі, камсамолу чырванагальштучныя камісары аб тым, што зроблена на пройдзеным ужо этапе ўсесаюзнага марша «Бяром з камуністаў прыклад!»

Удзельнікі збору звярнуліся да равеснікаў усёй краіны з заклікам падтрымаць пачынанне піянераў горада Пінска, якія аб'явілі дзесятую пяцігодку пяцігодкай ударных піянерскіх спраў, яшчэ больш актыўна ўдзельнічаць у аперацыях па збору металалому і макулатуры «Піянерскія рэйкі БАМу» і «Мільён—Радзіме!»

Моцная дружба звязвае вучняў нашай рэспублікі з першым беларускім ударным камсамольска-маладзёжным імя Героя Савецкага Саюза Мікалая Кедышкі атрадам, які працуе на будаўніцтве Байкала-Амурскай магістралі. На ўрачыстым зборы школьнікі вырашылі дапамагчы сваім старэйшым сябрам сабраць сродкі на будаўніцтва лакаматыва «Камсамолец Якуціі» і на ўзвядзенне помнікаў Герою Савецкага Саюза беларусу Мікалаю Кедышку і Герою Савецкага Саюза якуту Фёдару Папову, які загінуў пры вызваленні Беларусі, а таксама ў стварэнні школьных бібліятэк, вырабе наглядных дапаможнікаў для юных бамаўцаў.

БЕЛТА.

# ЮБІЛЕЙ САМАДЗЕЙНАГА ТЭАТРА

Далёка за межамі нашай рэспублікі ведаюць такія калектывы мастацкай самадзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, як народны ансамбль танца «Крыжачок», народны аркестр народных інструментаў, харавую капэлу.

Любяць студэнты і свой тэатр, якім кіруе заслужаны артыст Латвійскай ССР А. Озераў. Нядаўна калектыў адзначыў сваё дзесяцігоддзе пастаноўкай трагедыі Шэкспіра «Ромэо і Джульета». За гэты час тэатрам пастаўлены дзесяткі спектакляў, інсцэніровак, літаратурна - драматычных кампазіцый і праграм. Студэнцкі тэатр заўсёды ў гушчыні жыцця. І сведкай таму такія пастаноўкі, як «Далёкая дарога» А. Арбузава, «Маладая гвардыя» А. Фадзеева, паэма М. Алігер «Зоя» (спектакль «Казка аб праўдзе»), п'еса «Маці» класіка чэшскай літаратуры Карэла Чапека. А за спектакль «Закаханая» Т. Ян, высокае выканаўчае майстэрства і шматгадовую работу па камуністычнаму выхаванню моладзі калектыў быў узнагароджаны Ганаровай граматай ЦК ЛКСМБ.

У тэатры іграюць студэнты розных факультэтаў і курсаў. Аб'ядноўвае іх адно — любоў да мастацтва, жаданне несці цудоўнае людзям.

М. ПРЫГОДЗІЧ,
аспірант БДУ імя У. І. Леніна.

# АБ ДЗЕЦЯХ—ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

У нашай дзетвары шмат верных сяброў сярод беларускіх кінематаграфістаў, якія ўсімі даступнымі кіно сродкамі вядуць з юным гледачом захапляючую, сур'ёзную размову аб самым галоўным і запаветным — аб любві да Радзімы, інтэрнацыяналізме, аб гонары і абавязку, стойкасці і гуманізме. Не выпадкова такія фільмы як «Дзяўчынка шукае бацьку» і «Паланез Агінскага» Л. Голуба, «Зімародак» В. Нікіфарава, «Іван Макаравіч» І. Дабралюбава і іншыя карыстаюцца любоўю ў дзяцей і юнацтва. Многія работы «Беларусьфільма» атрымалі міжнароднае прызнанне.

Можна гаварыць ужо аб традыцыі кінематаграфістаў Беларусі ў стварэнні востраасюжэтных, рамантычна прыўзнятых, праўдзівых, хвалюючых фільмаў для юнага гледача на патрыятычную тэму. Гэта акалічнасць з'явілася адной з прычын таго, што савецка-балгарскі творчы сімпозіум «Праблемы развіцця сучаснага кіно для дзяцей і юнацтва» было вырашана правесці ў Мінску, сказала карэспандэнту БЕЛТА прэзідэнт Міжнароднага цэнтра фільмаў для дзяцей і юнацтва, доктар мастацтвазнаўства прафесар К. К. Парамонава.

У сімпозіуме, які 21 чэрвеня ўрачыста адкрыў старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі У. В. Мацвееў, удзельнічаюць вядомыя савецкія і балгарскія сцэнарысты, рэжысёры, кінакрытыкі.

Сярод прадстаўнікоў брацкай краіны—аўтары многіх карцін, адзначаных міжнароднымі прызамі, — Дзімітр Пятроў і Іванка Грыбчава, рэжысёр-мультыплікатар Радка Бынварава, вядомы кінакрытык Атанас Свіленаў і галоўны рэдактар дзіцячага тэлебачання Хрыста Арсенцьеў.

У праграме сімпозіума—прагляд і абмеркаванне савецкіх і балгарскіх фільмаў, творчыя сустрэчы з беларускімі кінематаграфістамі, паказ балгарскіх фільмаў у піянерскіх лагерах, знаёмства з выдатнымі мясцінамі Мінска.

Форум кінематаграфістаў працягнецца да канца тыдня.

БЕЛТА.

*Толькі што выдадзена*

# АБ МІНУЛЫМ, ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ

Адлюстраванню ваенна-патрыятычнай тэмы ў савецкай літаратуры прысвечана кніга Валерыя Касалапава «Летопись мужества», што папоўніла серыю «Народны універсітэт» выдавецтва «Знание». Аўтар разглядае творы, у якіх ярка занатаваны бяспрыкладны подзвіг нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Вялікую ўвагу ён удзяляе творчасці лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР В. Быкава. У раздзеле «Аб мінулым дзеля будучыні» В. Касалапаў падрабязна спыняецца на аповесцях «Абеліск» і «Воўчая зграя», зазначаючы, што творы Васіля Быкава аб мінулай вайне востра сучасныя. Сапраўды, яны напісаны аб мінулым дзеля нашага сённяшняга і дзеля будучыні. Праблемы, якія ў іх даследуюцца — праблемы вернасці свайму абавязку, грамадзянскай мужнасці, сумлення, гонару, чалавечай годнасці — гучаць антуальна і ў нашы дні. Кнігі Быкава сапраўды дапамагаюць фарміраванню духоўнага вобліку і характару сучаснага чалавека».

# ФОТАІНФАРМАЦЫЯ



У кніжным магазіне г. Любань заўсёды мнагалюдна. На гэтым здымку вы бачыце пакупнікоў ля выстаўкі «Навінкі літаратуры».
Фота С. ДАРОЖКІ.

Лепшая ткачыха Светлагорскага завода штучнага валакна Раіса Ламінская. Яна абслугоўвае трынаццаць станкоў.
Фота І. ЮДАША. (БЕЛТА).



У Мінску вырас новы адміністрацыйны будынак завода халадзільнікаў.
Фота І. ПАЎЛАВА.



Адзін з кутоў чытальнай залы Віцебскай абласной бібліятэкі.
Фота Н. СІВАКОВА.

# У НАШЫХ ЛІТОЎСКІХ СЯБРОЎ

## СВЯТА ДРУЖБЫ

Сотні гасцей прыбыло ў Зарасай на традыцыйнае свята дружбы. Сюды прыехалі прадстаўнікі Ігналінскага і Пыльваскага раёнаў Эстоніі, Браслаўскага—з Беларусі, Даўгапілскага—Латвіі, Любамільскага — Украіны. Дэлегацыі братніх рэспублік ушанавалі памяць герояў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны пры вызваленні Зарасайскага раёна ад гітлераўскіх акупантаў.

Пасля адбыўся вялікі канцэрт. Свята вылілася ў яркую дэманстрацыю дружбы народаў нашай Радзімы.

## ВЫСТАЎКА ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА

У Вільнюсе, у Палацы мастацкіх выставак адкрыта рэспубліканская выстаўка прыкладнога мастацтва, на якой экспануецца 600 работ. Гэта—насценныя дываны, вітражы, мазаіка, кераміка.

Аб развіцці прыкладнога мастацтва ў час адкрыцця выстаўкі гаварылі намеснік міністра культуры рэспублікі Д. Трынкунас і старшыня праўлення Саюза мастакоў Літоўскай ССР акадэмік І. Кузмінскіс.

## НОВЫ КІНАФІЛЬМ

На тэрыторыі калгаса «Лайсве» Зарасайскага раёна Літоўская кінастудыя здымае новы мастацкі фільм «Вянок з дубовага лісця» па матывах адной з навел рамана Ю. Балтушыса «Праданыя гады». Раней некаторыя эпізоды стужкі былі зняты ў мястэчку Дзебякяй Анікшчайскага раёна, дзе прайшлі маладыя гады народнага пісьменніка Літвы Ю. Балтушыса.

## КОНКУРС ТАНЦА

Два дні ў Гаргджайскім гарадскім парку працягвалася традыцыйнае свята-конкурс калектываў народнага танца. Аматары танца з Цяльшай, Кельме, Шылале, Краціні, Плунге і іншых раённых і сельскіх дамоў культуры дэманстравалі літоўскія танцы, а таксама танцы другіх народаў.

## ЗАСЛУЖАНАЯ АЦЭНКА

Ансамблю народнай песні і танца Вільнюскага педагагічнага інстытута «Швеса» прысвоена званне заслужанага калектыву рэспублікі. Цяжка знайсці ў Літве Дом культуры, дзе б не выступаў гэты ансамбль. Літоўскія песні і танцы ансамбль «Швеса» дэманстраваў у Балгарыі, Югаславіі, Грэцыі, Турцыі, Францыі, Італіі, ГДР.

## РАЗМОВА ПРА КІНО

У Кельмскім раёне пабываў вядомы рэжысёр Літоўскай кінастудыі Г. Шаблявічус. Ён сустрэўся з рабочымі і калгаснікамі, расказаў аб шляхах развіцця сучаснага дакументальнага кіно, падзяліўся сваімі творчымі планамі.

Для ўдзельнікаў сустрэчы былі паказаны работы Г. Шаблявічуса «Аранжавая легенда», «Апалінарыс» і іншыя дакументальныя стужкі.

# ЛІТАРАТУРА БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМУ

Непарыўная сувязь савецкай літаратуры з партыяй, з народам. Іх справы, здзяйсненні — невычэрпная крыніца натхнення для мастакоў слова, якія ствараюць творы, вартыя нашай вялікай эпохі. Гераічная гісторыя Радзімы і слаўны сённяшні дзень, савецкі чалавек — творца новага грамадства — вось галоўныя тэмы, што хвалююць розум і сэрца майстроў шматнацыянальнай літаратуры. Сваёй творчасцю яны ўносяць усё больш важкі ўклад у справу будаўніцтва камуністычнага грамадства

За апошнія гады ва ўсіх братніх саюзных рэспубліках створаны новыя творы сацыялістычнага рэалізму, у якіх знайшло яркае адлюстраванне ўсё тое, важнае і значнае, чым жыве краіна, савецкі народ. Высокая ацэнка дзейнасці творчай інтэлігенцыі дадзена ў Справаздачным дакладзе ЦК КПСС, з якім на XXV з'ездзе партыі выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў. Натхнёныя гэтай ацэнкай, з пачуццём глыбокай зацікаўленасці аб лёсах савецкай літаратуры сабраліся ў Маскве на VI з'езд пісьменнікаў СССР 550 дэлегатаў.

З'езд адкрыўся 21 чэрвеня ў Вялікім Крамлёўскім палацы.

10 гадзін раніцы. Зал пасяджэнняў Палаца запоўнілі дэлегаты і госці з'езда, дзеячы культуры, прадстаўнікі грамадскасці.

Бурнымі, працяглымі апладысментамі, стоячы, сустрэлі прысутныя таварышаў **Л. І. Брэжнева, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, А. П. Кірыленку, А. М. Касыгіна, Ф. Д. Кулакова, А. Я. Пельшэ, М. В. Падгорнага, М. А. Суслава, Д. Ф. Усцінава, Б. М. Панамарова, М. С. Саломенцава, У. І. Далгіх, К. Ф. Катушава, М. В. Зімяніна, К. У. Чарненку.**

З'езд адкрыў старэйшы савецкі пісьменнік, Герой Сацыялістычнай Працы М. С. Ціханаў.

З найвялікшым уздымам дэлегаты і госці выбралі ганаровы прэзідыум у складзе Палітбюро ЦК КПСС на чале з Генеральным сакратаром ЦК КПСС таварышам Л. І. Брэжневым.

Выбіраюцца рабочыя органы з'езда.

Зацвярджаецца павестка дня: справаздачны даклад праўлення Саюза пісьменнікаў СССР; даклад Цэнтральнай рэвізійнай камісіі Саюза пісьменнікаў СССР; выбары кіруючых органаў Саюза пісьменнікаў СССР.

Мінутай маўчання прысутныя ўшанавалі памяць пісьменнікаў, якія памерлі за перыяд паміж з'ездамі.

М. С. Ціханаў паведаміў, што на з'езд прыбылі дэлегацыі саюзаў пісьменнікаў братніх сацыялістычных краін, пісьменнікаў з многіх краін Еўропы, Азіі, Афрыкі, і Амерыкі, прадстаўнікі міжнародных пісьменніцкіх арганізацый. Ён прадставіў зарубежных гасцей.

Далей М. С. Ціханаў сказаў:

— Мы сабраліся ў гэтай гістарычнай зале Крамля на VI з'езд пісьменнікаў СССР, каб абмеркаваць вынікі нашай творчай і грамадскай работы за прайшоўшае пяцігоддзе, намеціць шляхі нашай дзейнасці на наступныя гады ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС.

Пяцігоддзе, якое мы пражылі, было поўна вялікіх спраў савецкага народа. Самай знамянальнай падзеяй у жыцці нашай Радзімы з'явіўся XXV з'езд КПСС. У глыбокім, навукова-абгрунтаваным дакладзе Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева падведзены вычэрпныя вынікі стваральнай працы нашага грамадства ў гады дзевятай пяцігодкі, дадзена натхняльная перспектыва нашага развіцця.

У Справаздачным дакладзе ЦК КПСС выключная ўвага ўдзелена пытанням развіцця літаратуры і мастацтва. Мы, савецкія пісьменнікі, як і ўся творчая інтэлігенцыя, з глыбокім натхненнем успрынялі высокую ацэнку нашай працы, нашага ўкладу ў справу будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Дазвольце ад імя ўсіх дэлегатаў з'езда, якія прадстаўляюць шматнацыянальную літаратуру Савецкага Саюза, выказаць сардэчную ўдзячнасць Камуністычнай партыі, ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту, асабіста Генеральнаму сакратару ЦК КПСС Леаніду Ільічу Брэжневу за пастаянны клопат і ўвагу да савецкай літаратуры, да пісьменніка, да работнікаў творчай працы.

Пісьменнікі высока ацэньваюць унутраную і знешнюю палітыку партыі, гіганцкі асабісты ўклад таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева ў справу барацьбы за мір, супрацоўніцтва, шчасце народаў, іх дружбу.

Таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ён ведае на сваім асабістым вопыце, наколькі дарагі людзям мір, наколькі неабходны ён вялікай краіне сацыялізму, у якой грандыёзныя планы мірнага будаўніцтва. Мы ведаем, што наша партыя і ўрад пастаянна клапоцяцца аб тым, каб Савецкія Узброеныя Сілы, што стаяць на абароне міру, мелі ўсё неабходнае для выканання гэтай ганаровай задачы. Мы горача віншуем Леаніда Ільіча Брэжнева з высокім воінскім званнем Маршала Савецкага Саюза, жадаем яму добрага здароўя і новых поспехаў ва ўсіх сферах выдатнейшай дзейнасці. (Слова ўдзячнасці роднай партыі, таварышу Л. І. Брэжневу, сардэчныя віншаванні з прысваеннем Леаніду Ільічу звання Маршала Савецкага Саюза прысутныя сустрэлі стоячы, бурнай авацыяй).

Савецкая літаратура—знамяносец новых перамог у духоўным жыцці савецкага народа, працягваў М. С. Ціханаў, паспяхова развіваецца, дабіваецца новых творчых поспехаў. Умовы для творчай работы ў нашай краіне выключна спрыяльныя; у поспехах савецкіх літаратараў зацікаўлена ўсё грамадства, увесь народ.

У наступным годзе спаўняецца 60 гадоў Савецкай улады. Гэта ўзрост не толькі нашай краіны, але і літаратуры, якая прадстаўляе сабой унікальную з'яву ў гісторыі сусветнай культуры. Літаратура гэтая, якая ўзнікла разам з Вялікім Кастрычнікам, аб'ядноўвае дзесяткі і дзесяткі нацыянальных культур і ўяўляе сабой прыклад сапраўднага сацыялістычнага інтэрнацыяналізму.

І мы ўпэўнены ў тым, што да 60-годдзя Краіны Саветаў наш пісьменніцкі калектыў прыйдзе з новымі слаўнымі дасягненнямі.

Савецкая літаратура ажыццяўляе шырокія сувязі з прагрэсіўнымі замежнымі дзеячамі культуры. За апошнія гады яшчэ больш умацавалася наша яднанне з пісьменнікамі сацыялістычных краін. Наша літаратура нясе чалавецтву ідэі міру і сацыялізму, умацоўвае ўпэўненасць у будучым, супрацьстаіць пропаведзі гвалту і чалавеканянавісці.

Наш пісьменніцкі з'езд адкрываецца ў дні, калі ўся краіна працуе, увасабляючы ў жыццё рашэнні, якія паставіў XXV з'езд КПСС. Адчуваючы сваю кроўную сувязь з творчым, працоўным жыццём нашага народа, мы памятаем свой галоўны абавязак — занатаваць вобраз нашага сучасніка, стварыўшы мастацкі летапіс нашага гераічнага часу.

Дазвольце пажадаць дэлегатам VI з'езда пісьменнікаў, усім літаратарам краіны новых поспехаў ва ўдзячнай справе стварэння новых яркіх твораў, якія служаць справе партыі, народу.

Прамоўца паведаміў, што ў адрас пісьменніцкага форуму паступілі цёплыя віншаванні ад К. А. Федзіна і М. А. Шолахава, якія па стану здароўя не змаглі прысутнічаць на з'ездзе.

Затым са справаздачным дакладам праўлення Саюза пісьменнікаў СССР «Савецкая літаратура ў барацьбе за камунізм і яе задачы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС» выступіў першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Г. М. Маркаў.

# Даклад першага сакратара праўлення СП СССР Г. М. МАРКАВА

З часу V з'езда пісьменнікаў СССР, сказаў ён, прайшло пяць гадоў. Усе гэтыя гады савецкая шматнацыянальная літаратура працавала інтэнсіўна і плённа і дасягнула новых значных поспехаў. Самае галоўнае ў тым, што літаратура развівалася ў цеснай сувязі з жыццём народа, актыўна ўдзельнічала ў яго стваральнай барацьбе за камунізм, дзейсна дапамагала партыі ў камуністычным выхаванні працоўных.

У палітыцы партыі, у яе гераічных дзеяннях і планах усе мастакі чэрпаюць натхненне, праўду жыцця, грамадзянскую страснасць. Справа партыі, яе ідэі, увайшлі ў свядомасць пісьменнікаў, яны рухаюць вобразнае мышленне, вызначаюць творчыя пошукі і накіраванне талентаў. Савецкія пісьменнікі моцна трымаюць і ўпэўнена нясуць сцяг роднай Камуністычнай партыі. Радуючыся вялікім заваёвам народа ў вобласці эканомікі і культуры, адчуваючы пачуццё гонару за выдатнейшы ўклад нашай Радзімы ў справу міру і супрацоўніцтва народаў, пісьменнікі, як і ўсе савецкія людзі, натхнёны новымі гіганцкімі планамі і прадвызначэннямі партыі, яе новымі найвялікшымі задумамі, якія прагучалі з трыбуны XXV з'езда КПСС.

Усе мы, работнікі савецкай культуры, працягваў дакладчык, з хваляваннем думаем аб той значнай ролі, якую адводзіць партыя мастацкай творчасці, рабоце майстроў літаратуры і мастацтва, аб той увазе, якую партыя пастаянна ўдзяляе пытанням сацыялістычнай культуры. Усе мы па сваёй уласнай рабоце ведаем, які найвялікшы спрыяльны ўплыў аказалі на развіццё літаратуры рашэнні XXIV з'езда КПСС у прайшоўшае пяцігоддзе, як дапамаглі яны нам, пісьменнікам, выйсці ў сваёй творчасці, на самы стрыжань жыцця, звярнуцца да самых сучасных праблем сучаснасці, яшчэ выразней убачыць перспектывы нашага творчага шляху. Менавіта таму так акрыляе нас ацэнка работы творчай інтэлігенцыі ў цэлым, якая дадзена на XXV з'ездзе КПСС.

У Справаздачным дакладзе ЦК КПСС Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў сказаў: «Для мінулых гадоў характэрна далейшая актывізацыя дзейнасці творчай інтэлігенцыі, якая ўносіць усё больш важкі ўклад у агульнапартыйную, агульнанародную справу будаўніцтва камуністычнага грамадства». І далей: «Гэты станоўчы жыватворны працэс адбіўся, натуральна, у тых новых творах сацыялістычнага рэалізму, якія былі створаны ў нас у краіне, за апошнія гады. У іх усё часцей, а галоўнае — глыбей, знаходзіць водгук тое асноўнае, істотнае, чым жыве краіна, што стала часткай асабістага лёсу савецкіх людзей». Мы ўдзячны партыі за такую высокую ацэнку. Слова партыі, яе адабрэнне і падтрымка валодаюць вялікай сілай натхнення і нараджаюць ў душы кожнага пісьменніка жаданне працаваць яшчэ больш, яшчэ лепш, заявіў першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР.

Шырокі і дынамічны працэс, вялікае, амаль неабдымнае тое, што мы называем нашай літаратурнай гаспадаркай, працягваў ён. У любым жанры і відзе літаратурнай творчасці час паміж пятым і шостым з'ездамі, быў часам цікавых творчых пошукаў і прынцыповых дасягненняў.

Апошнія гады прынеслі новыя доказы павышэння ролі літаратуры ў жыцці сацыялістычнага грамадства. Паглыбіўся працэс адукацыі, асветы мас, працягваў расці попыт насельніцтва на кнігі, павялічылася імкненне працоўных да яднання з мастацтвам, з пісьменнікамі. Адначасова пісьменнікі, літаратурнае асяроддзе, як і дзеячы іншых сфераў мастацтва, выразна выявілі сваю з кожным годам узрастаючую арганічную патрэбнасць да больш пастаянных і ўстойлівых сувязей з народам, з яго грамадскім і працоўным жыццём.

Культура, мастацтва, літаратура, па справе сталі ў нас састаўнымі звенямі агульнанароднай барацьбы за камунізм.

У класава-антаганістычным грамадстве, якое пабудавана на сацыяльнай эксплуатацыі, становішча культуры, у тым ліку мастацкай, такім чынам, і літаратуры, непасрэдна залежыць і ў многім вызначаецца карысталюбівымі інтарэсамі пануючых класаў, а гэтыя інтарэсы знаходзяцца ў рэзкіх супярэчнасцях з інтарэсамі мас. Менавіта ў такіх сацыяльна-грамадскіх умовах і складваюцца, як вучыў Ленін, дзве культуры ў кожнай нацыянальнай культуры.

Сацыялізм здымае сацыяльную расколатасць культуры, яе класавую абмежаванасць. Менавіта сацыялізм— грамадства раўнапраўных і свабодных працаўнікоў, стварае нябачны прастор для развіцця гуманістычнай культуры, забяспечвае яе дзеячам рэальную свабоду тварыць у імя чалавека і чалавечага шчасця. Створаны ў нашай краіне новы тып культуры — культуры сацыялістычнай, стаў маяком для стваральных намаганняў іншых народаў.

У апошнія гады, сказаў далей Г. М. Маркаў, грамадская роля літаратуры і мастацтва стала асабліва відавочнай, вырасла і абнавілася ў сваім значэнні пастаяннай адзнакі савецкага вобраза жыцця. У Справаздачным дакладзе ЦК КПСС на XXV з'ездзе гэтае палажэнне ахарактарызавана так: «Ідзе жыватворны працэс ўзбагачэння мастацтва веданнем жыцця і, з другога боку, далейшага далучэння шматмільённых мас працоўных да каштоўнасцей культуры».

Якія ж працэсы схаваны за гэтай формулай?

Па-першае, умацаванне гарманічных адносін паміж партыяй і творчай інтэлігенцыяй на глебе глыбокага даверу партыі да майстроў літаратуры і мастацтва і бязмежнай адданасці савецкіх мастакоў справе Камуністычнай партыі, яе ідэям.

Па-другое, умацаванне марксісцка-ленінскага светапогляду, паглыбленае асэнсаванне пісьменнікамі прынцыпу партыйнасці, што азначае ўмацаванне ідэйна-мастацкіх асноў нашай літаратуры, якія абумоўліваюць яе сацыяльна-маральны пафас. І, нарэшце, — актыўнае мастацкае спасціжэнне жыцця ў свеце камуністычных ідэалаў. Гэта выражаецца ў шырыні і смеласці творчых пошукаў і выбары мастацкіх рашэнняў, у рознабаковасці стыляў і жанраў, у барацьбе супраць схематызму, прымітывізму, літаратурнай шэрасці.

Мы з поўнай асновай і з адкрытым сэрцам можам сказаць сёння на нашым з'ездзе: усе гэтыя гады мы, пісьменнікі, працавалі ў абстаноўцы, якая як ніколі спрыяе мэтанакіраванай працы.

Прайшоўшае пяцігоддзе, адзначыў дакладчык, характарызуецца актыўным жыццём усіх жанраў сучаснага мастацтва слова.

Усе мы, работнікі літаратуры і мастацтва, асабліва востра адчуваем неабходнасць шматмільённага чытача ў творах, якія даюць шырокаахопнае адлюстраванне жыцця — падзей, канфліктаў, праблем, характараў. З задавальненнем адзначым, што літаратура ўлоўлівае гэтую патрэбнасць, ідзе насустрач ёй і, як ужо гаварылася на з'ездах пісьменнікаў у рэспубліках, у першы

(Працяг на 4—5 стар.).

# ЛІТАРАТУРА БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМУ

Праця г. Пачатак на 3 стар.

шэраг літаратурных дасягненняў вылучыўся менавіта шырокаахопны, шматпланавы, панарамны са стэрэаскапічнай глыбінёй раман.

Прыемна адзначыць, што форма вялікага рамана атрымала развіццё не толькі ў літаратурах, якія маюць моцныя і даўнія традыцыі такой прозы, — у рускай, украінскай, беларускай, грузінскай, латышскай, літоўскай і г. д., але і ў іншых нашых літаратурах, нават у новапісьменных.

Мы перажываем сёння сапраўдны росквіт літаратур колькасна малалікіх народаў нашай краіны. І паглядзіце, які вынік: побач з кнігамі, напрыклад, рускіх пісьменнікаў, сталі кнігі Сямёна Курылава, Грыгорыя Ходжара, Юрыя Рытхэу, Уладзіміра Сангі, Ювана Шасталава і іншых пісьменнікаў.

Калі ў думках аглядаеш ваенныя эпапеі К. Сіманава і А. Чакоўскага, «Палескую хроніку» І. Мележа, раманы «Гарачы снег» і «Бераг» Ю. Бондарава, гісторыка-рэвалюцыйныя раманы А. Нурпеісава, С. Залыгіна, В. Смірнова, В. Закруткіна, М. Прылякаевай, С. Сартакова, А. Капцелава, Джалола Ікрамі, І. Шыхлы, раманы аб ваенным і пасляваенным часе І. Авіжуса, Ф. Абрамава, М. Аляксеева, Ш. Рашыдава, В. Кажэўнікава, М. Стэльмаха, А. Іванова, А. Ганчара, Б. Палявога, А. Первенцава, П. Праскурына, В. Бубніса, Я. Пермяка, А. Ананьева, А. Кешокава, С. Дангулава, І. Стаднюка, П. Куусберга, С. Бабаеўскага, П. Сажына і іншых, то пры ўсёй іх індывідуальнай непадобнасці знаходзіш у іх адну галоўную тэндэнцыю, якая выразна бачыцца ў раманнай літаратуры, — імкненне да сінтэзу, да авалодвання мастацкай паўнатой, той паўнатой, якая робіць творы спалучэннем думкі і пачуцця, паэзіі і праўды, адлюстроўвае і час, і чалавека, і народ.

І раману аб сённяшніх днях патрэбен сінтэз, — такі самы сінтэз думкі і пачуцця, праніклівасці і страснасці, якімі для свайго часу былі, напрыклад, «Вайна і мір», «Бацькі і дзеці», «Маці», «Ціхі Дон», «Маладая гвардыя».

Мы рады, працягваў дакладчык таму, што пэўныя станоўчыя зрухі адбыліся ў рамане аб рабочым класе, яго сённяшнім жыцці. Сваю стымулюючую ролю ў гэтым адыгралі і конкурсы, што праводзяцца сумесна ВЦСПС і Саюзам пісьменнікаў. Успомнім некаторыя кнігі, якія ўдастоены прэмій, — Ул. Папова, Р. Файзі, В. Сабко, М. Калеснікава, Ш. Бікчурына, С. Ханзадзяна, М. Бубеннага і іншых. І ўсё ж трэба пажадаць прозе аб рабочым класе больш настойлівага імкнення да такога мастацкага сінтэзавання рэчаіснасці, пры якім больш бы з'яўлялася твораў з шырокім грамадскім гучаннем.

Гэтая тэндэнцыя да сінтэзу праглядаецца і ў іншых формах прозы. У прыватнасці, у аповесці. Як вядома, маштабнасць твора не абавязкова мае на ўвазе шматтомнасць. Апошнія гады прынеслі нам у гэтым сэнсе доказныя прыклады. Успомнім аповесці Ч. Айтматава, В. Астаф'ева, Г. Траяпольскага, В. Быкава, В. Казачэнкі, С. Баруздзіна, Д. Граніна, Ул. Цендракова, Б. Васільева, Ю. Нагібіна, В. Ардамацкага, Н. Думбадзе, Я. Носава, А. Алексіна, В. Ліпатава, Ю. Сямёнава, С. Круціліна, Ю. Грыбава, В. Распуціна, Г. Панджыкідзе і многіх іншых таварышаў, адзначаныя псіхалагічным драматызмам і імкненнем да шырокіх абагульненняў.

Вядома, як і ў рамана, у аповесці ёсць і свае складанасці, і свае слабасці. Выдадзена нямала аповесцей аб нашым сучасніку, чалавеку грамадска-актыўным, мэтанакіраваным ў працы, з шырокім мышленнем, прынцыповым і патрабавальным, якія палюбіліся чытачам.

Але нярэдка яшчэ аповесць аб сучаснасці будуецца галоўным чынам на бытавым матэрыяле ў замкнёнай, адарванай ад навакольнага свету сферы сям'і і быту.

Пісьменнік, безумоўна, можа свядома абмежаваць сваё поле бачання для таго, каб **выдзеліць, скіраваць** увагу чытача на тым, што адлюстроўваецца. Але пры гэтым мы павінны адчуваць, што аўтар ведае аб жыцці нешта большае, нешта больш шырокае, чым тое, што ён свядома выказаў у канцэнтраваным выглядзе. Так адбываецца ў Айтматава ў «Белым параходзе» і ў Трыфанава ў «Абмене». Аднак у таго ж Трыфанава ў «Доме на Набярэжнай» сюжэтна-структурная аснова аповесці па сутнасці так замкнута ў выбранай аўтарам форме, што ні героям, ні чытачам не заўсёды даецца з неабходнай паўнатой адчуць прысутнасць сіл, якія здолелі парваць безвыходнасць некаторых лёсаў і сітуацый. У падобных выпадках гэта пытанне ўжо не толькі формы, не толькі жанру як такога, а пытанне і філасофскага погляду пісьменніка.

Гады дзевятай пяцігодкі, сказаў Г. М. Маркаў, адзначаны каласальнай стваральнай дзейнасцю партыі, народа, аказалі свой вялікі станоўчы ўплыў на мастацка-публіцыстычныя жанры. Відавочны рост шматграннасці літаратуры гэтага тыпу. Нарыс-партрэт, нарыс-даследаванне, нарыс-успамін, нарыс-жыццяапісанне, нарыс, які ставіць эканамічныя і маральныя праблемы; праблемныя артыкулы; памфлеты на міжнародныя тэмы, кіно-тэле-радыё нарысы — вось далёка не поўны пералік формаў работы нашых публіцыстаў. У справаздачны перыяд да вялікіх вышынь у гэтым жанры падняліся такія майстры, як Георгій Радаў, Марыэта Шагінян, Леанід Іваноў, Юрый Жукаў, Аляксандр Крывіцкі, Канстанцін Сіманаў, Мікалай Грыбачоў, Грыгорый Медынскі, Уладзімір Чывіліхін, Антаніна Капцяева, Анатоль Аграноўскі; ёсць і ў іншых пісьменнікаў-публіцыстаў прыкметныя поспехі. Аказалася ўдачнай, жывой, вельмі вынікова́й такая форма работы, як літаратурнае шэфства над важнейшымі аб'ектамі пяцігодкі: «БАМам, КамАЗам, Курскай магнітнай анамаліяй, Заходне-Сібірскім нафтагазавым комплексам, Нурэкскай ГЭС, будаўніцтвам чыгуначнай дарогі Цюмень — Сургут, Чэбаксарскім заводам прамысловых трактараў. Кнігі, падрыхтаваныя рэдакцыямі часопісаў аб некаторых з гэтых аб'ектаў, выклікалі вялікую цікавасць чытачоў.

Вышыня сучаснай думкі мастака сацыялістычнага рэалізму, сказваецца і ў тым, як ён бачыць мінулае, што ў ім яго цікавіць, у імя чаго ён бярэцца яго адлюстроўваць. Думка аўтара накіравана часцей за ўсё на драматычныя моманты гісторыі, калі выяўляецца сутнасць, гістарычна непераходзячае значэнне падзей і дзеячаў мінулага.

У творах, якія выражаны класава-выразным падыходам да мінулага, становіцца па-мастацку адчувальным вялікі марксісцкі вывад аб рашаючай ролі народа, народных мас у гістарычным працэсе. Так адчувальны ён, напрыклад, у рамане В. Шукшына пра Разіна, у тэтралогіі Паўла Заграбельнага аб Кіеўскай Русі, у новых кнігах Мікалая Задорнага аб асваенні рускімі людзьмі прастораў Далёкага Усходу, у рамане Ю. Трыфанава аб народавольцах «Нецярпенне», у рамане А. Баршчагоўскага аб рускім генерале Джоне Турчыне «Дзе паселіцца каваль».

За гады Савецкай улады ў нас створана цудоўная літаратура для дзяцей. Гэта сапраўды так, гэта, бясспрэчна, наша вялікае багацце. Мы заўсёды будзем ганарыцца сваёй дзіцячай літаратурай — сапраўды гуманістычнай, пранізанай высокай камуністычнай ідэйнасцю, разумнай, яркай, захапляльнай.

І ўсё ж, улічваючы задачы сённяшняга дня, мы чакаем ад гэтай літаратуры куды большага ўкладу ў нашу агульную справу. Сур'ёзнага, удумлівага паляпшэння патрабуе літаратура для самых маленькіх чытачоў, хоць хутчэй за ўсё яшчэ слухачоў. Асаблівую ўвагу неабходна праявіць аб падлетках. Больш павінна быць створана кніг аб рамантыцы прафесій, аб сэнсе і прыгажосці любой работы на карысць людзей.

Далей дакладчык адзначыў, што не малых поспехаў дасягнула ў прайшоўшыя гады савецкая шматнацыянальная паэзія. Ёсць у нас паэтычныя дасягненні, што прагучалі на ўсю краіну і далёка за межамі нашай Радзімы. Ёсць поспехі ў паэзіі больш «лакальныя». Абапіраючыся на суміраваныя назіранні крытыкі, на вывады і ацэнкі, зробленыя на рэспубліканскіх з'ездах пісьменнікаў, мы можам сказаць, што найбольш значныя зрухі адбыліся ў паэме.

Тут, відавочна, сказалася тая самая прага мастацкага мышлення і бачання, як і ў вобласці рамана. Паэма выяўляла рысы сённяшняй рэчаіснасці і яе сувязь з папярэднімі часамі. Вялікую шырыню выяўленчых сродкаў і прыёмаў паказалі паэты М. Луконін, М. Бажан, Р. Гамзатаў, Э. Межэлайціс, В. Фёдараў, С. Смірноў, Я. Еўтушэнка, Я. Далматоўскі, Р. Раждзественскі, С. Васільеў, Д. Кугульцінаў, Я. Ісаеў, А. Вазнясенскі, А. Шасцінскі, А. Межыраў, М. Канаат, Р. Бабаджан, С. Вікулаў, Б. Алейнік, Набі Хазры, А. Вацыецыс...

Цікавае ў гэтым сэнсе адно прызнанне, аб якім хочацца нагадаць. Юсцінас Марцінкявічус выказаў думку аб тым, што развіццю паэмы сёння будзе моцна садзейнічаць увядзенне элементаў драмы.

Думка паэта пацверджана практыкай нашых відных майстроў паэзіі. Так, Аркадзь Куляшоў побач з лірычнымі паэмамі выступіў з драматычнай паэмай пра Кастуся Каліноўскага; яркія паэтычныя драмы для тэатра стварыў Мустай Карым; увёў драматычныя элементы ў паэму «Васіль Буслаеў» Сяргей Нараўчатаў. Вялікіх поспехаў дабіўся сам Ю. Марцінкявічус. Яго драмы-паэмы, прысвечаныя тэмам нацыянальнай гісторыі, гучаць вострасучасна, у іх спрацаваны істотныя, важныя маральныя праблемы нашага часу.

Усё сказанае аб паэме зусім не азначае, што паэты рашылі ўсе свае задачы. Бо галоўная паэма пра савецкага чалавека 70-х гадоў, пра яго працу і подзвіг, яшчэ не створана.

Па даволі распаўсюджанай думцы крытыкаў, паэтаў і чытачоў, у лірычнай творчасці вялікіх, прыкметных поспехаў нябачна. Хоць поспехаў асобных сустракаецца нямала. Вызываюць заклапочанасць зніжэнне тонусу грамадзянскасці ў паўсядзённай паэтычнай практыцы. Мала таго, атрымала распаўсюджанне «версія», згодна якой цяпер адразу за нейкім «эстрадным» перыядам развіцця паэзіі прыйшоў быццам бы перыяд паэзіі «ціхай». Мы павінны заўсёды памятаць, што традыцыі баявітасці, мужнасці, грамадзянскай актыўнасці — гэта наша нержавеючая зброя.

Мабыць, ніколі яшчэ за ўсю гісторыю існавання савецкай літаратуры не ўзнікала такая вялізная патрэбнасць у драматургічнай літаратуры, як гэта было ў справаздачны перыяд, сказаў Г. М. Маркаў.

Акрамя тэатраў і кінематографа, попыт на драматургію павышала самадзейнае мастацтва — народныя тэатры, драматычныя студыі дамоў культуры, драматычныя гурткі. Новыя сур'ёзныя патрабаванні прад'явілі да драматургіі бесперапынна растучыя аб'ёмы літаратурна-драматычнага вяшчання па тэлебачанню і радыё.

Мабыць, ніякія іншыя жанры літаратуры не падвяргаліся столькім папрокам у адставанні, як драматургічныя. Мы перажылі такі перыяд, калі паміж патрабаваннямі тэатра і тым, што давала драматургія, узнікла дыспрапорцыя. Але вось на сцэну выйшлі Чэшкоў І. Дварэцкага, сталявары Г. Бокарава, а потым Друянаў і Семяняка А. Вейцлера і А. Мішарына. Іх урыванне ў тэатр абазначыла сур'ёзныя перамены ў ім.

«Вытворчая тэма» загучала як тэма нашага народнага жыцця, нашага грамадска-маральнага жыцця. Дасягнуўшы вялікай мастацкай напоўненасці характару, драматургія і тэатр здолелі паказаць сённяшняга савецкага чалавека ў шырокім развароце яго грамадскіх, вытворчых, псіхалагічна-асабістых сувязей, як дзеяча, творцу, чалавека, эпохі развітага сацыялізму.

Важна цяпер у драматургіі не растраціць гэты творчы запал, утрымаць заваяванае, больш таго, зрабіць новы рух наперад. Нядаўняе з'яўленне кінакарцін «Прэмія», і п'ес «З пасяджэння парткома» А. Гельмана, «Дзень прыезду — дзень ад'езду» В. Чарных, а таксама іншых твораў пра сённяшні дзень абнадзейвае.

Галоўная змена, якая адбылася ў нас у літаратурнай крытыцы за справаздачны перыяд, — працягваў дакладчык, — яе актывізацыя. Пастанова ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы» сыграла ў гэтым працэсе рашаючую ролю: гэта дапамога партыі, яе мудрае слова дапамаглі ўсёй савецкай шматнацыянальнай літаратуры, усім яе жанрам, не толькі літаратурнай крытыцы. Актывізацыю работы крытыкі і ўсё большую перспектыўнасць яе, а ў сувязі з гэтым узмацненне ўсёй ідэалагічнай работы ў літаратуры можна прасачыць літаральна па ўсіх лініях, якія намеціла пастанова ЦК КПСС. Крытыка шмат зрабіла ў паглыбленні аналізаў працэсаў руху літаратуры, асабліва ў такой важнай частцы, як узаемаўзбагачэнне і рух культуры сацыялістычных нацый.

У пастанове ЦК КПСС гаварылася як аб характэрнай слабасці нашай крытычнай работы — «аб няўменні суадносіць з'явы мастацтва з жыццём». Сказаць сёння, што мы поўнасцю пераадолелі гэты недахоп — азначала б паспяшацца з вывадамі, але не адзначыць сур'ёзнага зруху ў гэтай вобласці было б таксама несправядліва. У крытыцы вырасла цікавасць да сацыялагічных аспектаў, да ўключэння ў літаратурна-крытычны аналіз уражанняў рэальнага жыцця, да праверкі эстэтычных крытэрыяў супастаўленнем з рэчаіснасцю, з праблемамі развіцця грамадства.

У самы апошні час добрыя кнігі крытыкаў і літаратуразнаўцаў з'яўляюцца ўсё часцей і часцей. Дакладчык праілюстраваў гэта палажэнне прыкладамі. Ён адзначыў таксама, што вялікую цікавасць выклікалі кнігі крытычнага і літаратуразнаўчага плану, створаныя празаікамі, паэтамі, драматургамі.

Але іх усё-такі не хапае. Апошнія гады даюць пераканаўчы прыклад прыкметнага ўздыму літаратуры сацыялістычнага рэалізму, багатай і шматграннай па жанрах і стылях. Тэарэтычная думка магла б больш глыбока раскрываць перспектыўнасць і наватарскую сутнасць нашага мастацкага метаду.

Дакладчык спыніўся на праблемах мастацкага перакладу, які з'яўляецца выпрабаваным сродкам абмену паміж народамі духоўнымі каштоўнасцямі. Ён напомніў, што Савецкая дзяржава далучылася да Сусветнай канвенцыі аб аўтарскім праве. У сувязі з гэтым наша сістэма аховы аўтарскіх правоў была перабудавана.

Прайшоўшыя гады прынеслі шмат перамен не толькі самой літаратуры, але і моцна абнавілі нашы пісьменніцкія кадры, сказаў Г. М. Маркаў. Адзін з найбольш неаспрэчных доказаў вялікай жыццёвасці савецкай літаратуры — ідэйная садружнасць, творчае яднанне пакаленняў, іх сумесная работа па ажыццяўленню задач, пастаўленых перад пісьменніка-

мі партыяй. Маладыя пісьменнікі ў справаздачны перыяд унеслі ў савецкую літаратуру вялікі ўклад. Каб адчуць, якія свежыя таленавітыя патокі ўліваюцца ў літаратуру, дастаткова прачытаць зборнік аповесцей «Доўгія вёрсты», выдадзены «Роман-газетой», ці раман геолага А. Куваева «Тэрыторыя», ці аповесць шахцёра А. Плетнёва «Дзіўная справа».

Прайшоўшыя ў рэспубліках з'езды пісьменнікаў несумненна сыграюць вялікую ролю ў паляпшэнні ўсёй работы з маладымі. Амаль усюды праяўляецца клопат аб маладых, аб удасканаленні іх даравання, аб уцягненні іх у грамадскае жыццё нашага саюза.

І так — больш творчай смеласці і дзёрзкасці, заявіў дакладчык! Пісьменніцкая прафесія прадумоўлівае гэтую якасць, патрабуе яе ад чалавека, які ўзяўся за пяро. Яскрава мне ўяўляецца ў сувязі з нашай размовай малады Шолахаў. Бязмежныя данскія стэпы, казацкія станіцы, па якіх увесь час праносяцца, як смяротныя мяцелі, астаткі белагвардзейскіх бандаў, ад адчаю і поўнай бесперспектыўнасці здольныя на любыя злачынствы. І вось на хутарах і станіцах калясіць юны прадработнік, ахоплены адным жаданнем: набольш, як можна набольш узяць хлеба для галоднай, разбуранай краіны.

Вакол — ні рэдакцый, ні выдавецтваў, а ў хлопца ў думках спее задума «Ціхага Дона». Будучы наш праслаўлены раманіст адкладвае да пары да часу ў памяці то адну падрабязнасць, то другую дэталь, якіх яму спатрэбіцца потым невычэрпнае мноства. Уявіце на мінуту: спасаваў бы малады мастак перад грандыёзнасцю сваёй задумы; перад складанасцю канфліктаў і калізій часу. Смеласць і дзёрзкасць — гэта мускулы таленту, і як усё жывое, якое рухаецца, яны сатканы з плоці, нерваў і крыві. І патрабуюць яны да сябе клопату і ўвагі — і самога пісьменніка, і крытыкі, і чытачоў.

У роднай савецкай літаратуры, сказаў далей Г. М. Маркаў, хочацца бачыць усё больш твораў, напоўненых сапраўдным натхненнем, ідэйна і па-мастацку значных, маштабных.

Многіх тэм і праблем нашага жыцця і жыцця ў мінулым каснулася літаратура, а ўсё-такі не слабее жаданне чытачоў атрымліваць новыя і новыя кнігі аб народным жыцці, аб вялікай стваральнай сіле нашай рэвалюцыі, аб беззапаветнай барацьбе нашай партыі, аб цудах творчай энергіі савецкіх людзей, аб іх магутным адзінстве, якое сакрушыла сацыяльныя, нацыянальныя, расавыя супроцьлегласці і перажыткі і тым самым павялічыўшы духоўны патэнцыял нашага грамадства да неахопных памераў.

Ёсць яшчэ адзін важнейшы аспект гэтай праблемы: клопат аб маральным клімаце грамадства. Уся творчасць савецкіх пісьменнікаў, пранізаная высокімі ідэаламі камунізму, супрацьстаіць растленнай маралі буржуазнага свету.

Безупынная парнаграфія, пропаведзь гвалту і жорсткасці, агалцелы расізм літаральна захлёстваюць кніжныя прылаўкі капіталістычных краін, унушаючы чалавеку нявер'е ў свае сілы, пераконваючы яго ў нікчэмнасці ўласнага існавання, ўсяляючы ў яго душу адчай, і слушную пакорлівасць лёсу, тым нецярпімей, актыўней і вастрэй павінна быць наша барацьба з буржуазнай ідэалогіяй, з усімі яе разнавіднасцямі і адгалоскамі.

Мы — сучаснікі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, прывыклі цяпер да аднаго вельмі напоўненага вызначэння — навука стала вытворчай сілай. За гэтым схаваны вялікія якасныя змены не толькі матэрыяльныя ўласцівасці, але і ідэйна-маральныя, псіхалагічныя, чалавечыя. Стаў іншым чалавек, узрасла яго ўлада над прыродай; змяніліся прылады працы, умовы працы. Па сутнасці, рабочы клас стаў саратнікам навукі, яе творцам.

Нашы пісьменнікі — і асабліва майстры навукова-мастацкага жанру, так ці інакш ужо закраналі гэтыя бакі савецкай рэчаіснасці. Але калі акінуць гэты мацярык жыцця поглядам шырэй, дык на ім ляжаць яшчэ гіганцкія пласты, да якіх рукі літаратараў пакуль што не дацягнуліся. А хіба не прыцягальныя для пісьменніка ўсе тыя перамены, якія з такой хуткасцю адбываюцца ў сучаснай вёсцы?..

Ніколі ў памяці народнай не будзе забыты подзвіг савецкіх людзей, нашай гераічнай арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Савецкая літаратура стварыла шмат выдатных твораў аб гэтым часе, аб людзях, якія заваявалі для нас шчасце мірнага жыцця і стваральнай працы. І за гэта народ і партыя не раз выказвалі сваім пісьменнікам пачуццё ўдзячнасці. Аднак, як немагчыма вычарпаць акіян, так немагчыма вычарпаць тэму гераізму савецкага народа ў суровую гадзіну вайны.

Пісьменніку ёсць чым натхняцца, яму ёсць у імя чаго набываць творчую смеласць і дзёрзкасць! Праца пісьменніка ўзнята на небывалую вышыню. На гістарычным форуме партыі Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў сказаў выразна і дакладна: «Сапраўдны талент сустракаецца рэдка. Таленавіты твор літаратуры і мастацтва — гэта нацыянальны здабытак».

Здаўна літаратура і мастацтва прыцягваюць людзей сваёй непаўторнасцю, арыгінальнасцю мастацкіх рашэнняў, шматграннасцю стыляў, почыркаў, манер, індывідуальнага гучання мовы, асобым выбарам гукаў і фарбаў. Леў Талстой, Някрасаў, Чарнышэўскі, Тургенеў жылі ў адзін час, асэнсоўвалі адзін гістарычны час, але як жа яны былі не падобныя адзін да аднаго! І больш блізкія да нас прыклады гавораць аб тым жа: М. Горкі і А. Серафімовіч. Ул. Маякоўскі і С. Ясенін, Аляксей Талстой і А. Фадзееў — кожны непаўторны, у кожнага свае рысы.

Угледземся ў партрэты і тых, хто сёння з намі: М. Шолахаў, Л. Леонаў, К. Федзін, М. Ціханаў, В. Катаеў, М. Шагінян, А. Суркоў, С. Шчыпачоў, Кандрат Крапіва, П. Броўка, Ю. Смоліч, С. Рагімаў, Г. Мусрэпаў, А. Такамбаеў, К. Яшэн... Нашы слаўныя старэйшыны, людзі, якія аддалі дзесяцігоддзі натхнёнай працы роднай савецкай літаратуры. Зробім яшчэ крок да нашых дзён:

С. Міхалкоў, М. Турсунзадэ, А. Ганчар, А. Барто, С. Рустам, М. Танк, Л. Мартынаў, А. Хінт, Г. Абашыдзе, А. Арбузаў, А. Сальнскі, В. Розаў, І. Абашыдзе, А. Сафронаў, І. Касумаў, А. Штейн, А. Лупан, М. Дудзін, С. Капуцікян. За кожным імем стаіць не толькі свая біяграфія, свой жыццёвы шлях, але і свае, не супадаючыя з іншымі рысы таленту. Многія з маладых ідуць тым жа шляхам.

І ці трэба агаворваць тут, у гэтай аўдыторыі, што барацьбой за своеасаблівасць і непаўторнасць таленту мы ўмацоўваем ідэйныя пазіцыі нашай літаратурнай моладзі. Бо ясна ж, што ніякі талент не можа плённа развівацца, калі яго не апладатварае вялікая, правільная ідэя! У гэтых адносінах усе мы, савецкія пісьменнікі — і старыя, і пажылыя, і маладыя — шчаслівыя людзі: нас натхняюць ідэалогія камунізму, ідэі ленінскай партыі, якая на справе ажыццявіла вялікія рэвалюцыйныя пераўтварэнні, што сталі прыкладам для ўсяго чалавецтва.

Далей дакладчык сказаў, што зарубежныя антысаветчыкі і сярод іх нікчэмныя адзіночкі-перабежчыкі не перастаюць агалцела паклёпнічаць на савецкіх пісьменнікаў і на наш творчы саюз.

Тысячы разоў аб'яўляючы Саюз пісьменнікаў распаўшымся, а літаратуру сацыялістычнага рэалізму ліквідаванай, яны любяць пафарсіць перад сваімі чытачамі і слухачамі звонкімі слоўцамі аб «свабодзе» друку і сумлення, аб «незалежнасці» таленту ў буржуазным грамадстве. Прычым усё гэта пускаецца ў абарот з абавязковай мэтай напаклёпнічаць на Савецкую краіну. Але гэта — пустыя словы, брахня, як кажуць у нас у народзе. Толькі ў нашай краіне, у сацыялістычных краінах пад паняццем свабоды друку і таленту падведзена не ўяўная, а сапраўдная база, моцная матэрыяльная аснова, сапраўдная зацікаўленасць грамадства, яго падтрымка.

Антысаветчыкі і антыкамуністы ўныла і назойліва бармочуць, палохаючы замежных абываталяў, нагнятаючы абстаноўку недаверу і падазронасці: «Савецкія пісьменнікі былі і застаюцца ва ўладзе камісараў. Камісары ўсё за іх робяць — і кнігі друкуюць, і часопісы выдаюць, і нават раманы пішуць». Што ж, таварышы, суцешым паноў, скажам ім праўду: сапраўды, у Саюзе пісьменнікаў шмат камісараў. Іх восем тысяч! Усе мы, савецкія пісьменнікі па перакананню, па духу, па складу жыцця неўтаймаваныя чырвоныя камісары, для якіх няма нічога даражэй ленінскай праўды на зямлі, вялікай справы нашага гераічнага народа і роднай Камуністычнай партыі!

Г. М Маркаў падкрэсліў, што Саюз пісьменнікаў СССР, уносячы свой уклад у ажыццяўленне Праграмы міру, выпрацаванай XXIV з'ездам КПСС, імкнуўся заўсёды дзейнічаць у духу палітыкі нашай партыі і дзяржавы. Савецкія пісьменнікі адчуваюць глыбокае задавальненне ад поспехаў у ажыццяўленні знешнепалітычнага курсу КПСС, ад вынікаў Нарады ў Хельсінкі.

Мы рады, што ў дасягненнях мірнай палітыкі Савецкай дзяржавы ёсць доля намаганняў і савецкай шматнацыянальнай літаратуры, якая заўсёды, з першых дзён свайго ўзнікнення, была пранізана духам актыўнай барацьбы за гуманізм і сацыяльны прагрэс, за мір і дружбу паміж народамі.

Развіваючы міжнародныя літаратурныя сувязі згодна з рашэннямі XXIV і XXV з'ездаў КПСС, Саюз пісьменнікаў СССР імкнецца аказваць належнае ўздзеянне на розум і настрой замежнай інтэлігенцыі. Мы дабіваемся згуртавання прагрэсіўных замежных пісьменнікаў на платформе барацьбы народаў за мір, дэмакратыю і сацыялізм, уцягнення літаратурных арганізацый у актыўную барацьбу за аздараўленне міжнароднай абстаноўкі, за разрадку напружанасці.

У выніку гэтых намаганняў Саюз пісьменнікаў СССР значна расшырыў літаратурныя сувязі з пісьменнікамі розных краін і кантынентаў. Савецкая літаратура цяпер займае ў свеце віднае палажэнне і валодае моцным, усё ўзрастаючым аўтарытэтам і ўплывам.

Пісьменнікі Савецкай краіны былі, ёсць і будуць вернымі памочнікамі партыі, яе апорай ва ўсіх пачынаннях, заявіў у заключэнне Г. М. Маркаў. Палітыка Камуністычнай партыі, гіганцкая кіпучая дзейнасць ленінскага Цэнтральнага Камітэта партыі, яе Палітбюро, Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева выклікаюць у нашых сэрцах гарачае пачуццё адабрэння, падтрымкі, нараджаюць новы прыліў творчай энергіі, умацоўваюць рашучасць аддаваць усе свае сілы, здольнасці, усё сваё жыццё трыумфу перамаганоснага вучэння марксізму-ленінізму, поўнаму выкананню планаў і прадвызначэнняў Камуністычнай партыі.

Пісьменнікі Савецкай краіны прыйшлі да свайго VI з'езда з немалымі дасягненнямі, ідэйна моцнымі, цесна згуртаванымі вакол КПСС, пад яе ленінскім сцягам. Асновай нашых поспехаў была і застаецца гераічная дзейнасць партыі і народа, умацаванне грамадства развітага сацыялізму, паспяховае будаўніцтва матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму, гіганцкі рост сіл і аўтарытэту сусветнай сістэмы сацыялізму, інтэрнацыянальная згуртаванасць усіх сіл сацыяльнага прагрэсу, дэмакратыі, сацыялізму і камунізму.

Няма сумнення ў тым, што і надалей, імкнучыся авалодаць самымі складанымі праблемамі сучаснасці, знайсці для ўзнаўлення герояў нашага часу самыя яркія мастацкія рашэнні савецкія пісьменнікі, бясконца ўдзячныя КПСС і народу за пастаянную дапамогу і клопаты, створаць новыя творы, здольныя натхняць сучаснікаў і перадаць нашчадкам, як вобразна сказаў Леанід Ільіч Брэжнеў на XXV з'ездзе КПСС, «памяць сэрца і душы аб нашым пакаленні, аб нашым часе, яго хваляваннях і здзяйсненнях».

●

З дакладам Цэнтральнай рэвізійнай камісіі Саюза пісьменнікаў СССР выступіў яе старшыня В. П. Цельпугоў.

Затым на з'ездзе пачаліся спрэчкі.

За час паміж пісьменніцкімі з'ездамі, сказаў Міхаіл Луконін (Масква), савецкая літаратура дасягнула вялікіх вышкаў. У справаздачным дакладзе праўлення знайшла адлюстраванне шырокая панарама развіцця прозы, паэзіі, крытыкі. У развіццё роднай літаратуры немалы ўклад унесла Маскоўская арганізацыя, якая аб'ядноўвае амаль 1.800 пісьменнікаў. Не можам мы не радавацца, што ў нашым Саюзе пісьменнікаў у цяперашні час — рабочая, творчая абстаноўка.

Вялікае месца ў выступленні было ўдзелена тэме сучаснасці, якая, як сказаў прамоўца, з'яўляецца жывой душой літаратуры. Сучаснасць самы складаны, цяжкі і разам з тым найудзячнейшы матэрыял для мастацкага асваення рэчаіснасці. І ўвага, якую мы ўдзяляем творам усіх жанраў на сучасную тэму, прадыктавана нашым перакананнем, што без глыбокага пранікнення ў жыццё не можа быць і сур'ёзных, глыбокіх твораў аб працы і жыцці нашых сучаснікаў.

Для мінулага пяцігоддзя, падкрэсліў Васіль Казачэнка (Украіна), ва ўсёй галоўнейшай творчай дзейнасці нашага рэспубліканскага творчага саюза, як і ўсёй нашай шматнацыянальнай літаратурнай сям'і, адзіным, характэрным было далейшае паглыбленне камуністычнай ідэйнасці літаратуры, яе выхаваўчай ролі, яе інтэрнацыянальнага пафасу, далейшае ўмацаванне братняга адзінства літаратур Савецкага Саюза і літаратур краін сацыялізму.

Найбольш, мабыць, інтэнсіўна праявіла сябе ў літаратурным працэсе тэндэнцыя прыцыпова больш глыбокага ўмацавання сувязей мастацкай інтэлігенцыі з жыццём народа, непасрэдны і прамы ўдзел яе ў будаўнічатворчых буднях пяцігодкі. Прамоўца гаварыў аб павышэнні грамадзянскага пафасу літаратуры, баявітасці, непасрэдным урыванні ў жывыя працэсы народнага жыцця.

Вялікае мастацтва, прасякнутае агульначалавечай думкай, не мае нацыянальных абмежаванняў, хоць у яго ёсць месца і час нараджэння, непаўторныя асаблівасці эпохі і роднага прытулку, сказаў, дзелячыся сваімі думкамі аб ролі літаратуры і месцы мастака ў век навукова-тэхнічнай рэвалюцыі 70-х гадоў, Юрый Бондараў (Масква). У той жа час у сталую пару яно выходзіць за межы бацькоўскага дома і тады належыць усяму чалавецтву. Мастак як індывідуальнасць, што прапускае праз сябе галоўнейшыя праблемы мінулай і сённяшняй гісторыі, уносіць уласныя светацені, акцэнтыроўкі і абагульненні, улоўліваe штуршкі акаляючай рэчаіснасці, з'яўляючыся па сутнасці выказнікам дум, пачуццяў свайго народа.

Наша літаратура жыве вялікай ідэяй чалавека, барацьбой за чалавека, за яго духоўнае ўдасканаленне. Гэтыя апоры трымаюць на сабе сэнс жыцця і сэнс літаратуры ў нашым грамадстве, якое спавядае самую гуманную філасофію — марксізм.

Як у кожнай тоне выплаўленага металу, здабытага вугалю, як у кожнай жменьцы вырашчанага хлеба ёсць працоўны ўклад усіх савецкіх людзей, сказаў Максім Танк (Беларусь), так і ў савецкай літаратуры, у нашых песнях пераліваюцца фарбы неабсяжнай нашай роднай зямлі, яе рэк і горных вяршынь, усё мацней гучаць галасы усіх братніх народаў і чуецца біццё сэрца сям'і адзінай.

(Выступленне М. Танка друкуецца сёння.)

Выступіўшыя на з'ездзе Барыс Васільеў (Масква), Імран Касумаў (Азербайджан), Мікалай Грыбачоў (Масква), старшыня Дзяржкамвыда СССР Б. І. Стукалін, Асхат Мірзагітаў (Уфа) гаварылі аб найвялікшым значэнні рашэнняў XXV з'езда КПСС для развіцця савецкай літаратуры, клопаце партыі аб росквіце духоўнай культуры народа. Ніштo так не акрыляе мастака, як прызнанне важнасці і карыснасці яго працы, падкрэслівалі дэлегаты пісьменніцкага форуму.

Грунтоўна, з пазіцый высокай патрабавальнасці яны абмеркавалі праблемы ўмацавання сувязі літаратуры з жыццём, пытанні павышэння ідэйнага і мастацкага ўзроўню і мастацкага майстэрства твораў прозы, паэзіі, драматургіі, публіцыстыкі, гаварылі аб необходнасці павышэння ролі крытыкі ў развіцці літаратурнага працэсу.

З дакладам мандатнай камісіі з'езда выступіў яе старшыня А. Я. Рэкямчук.

**ТАСС.**

# ДУХОЎНАЕ БАГАЦЦЕ НАРОДА

22 чэрвеня працягваў работу з'езд пісьменнікаў СССР. Дыскусіі аб дасягненнях і шляхах развіцця савецкай літаратуры праходзілі ў гэты дзень у розных залах сталіцы — на пасяджэннях дзесяці творчых камісій. Такая форма работы пісьменніцкага з'езда дазволіла глыбей і ўсебаковей абмеркаваць праблемы літаратурнай працы, падрабязней разгледзець творчы вопыт мастакоў слова розных пакаленняў. У абмеркаванні дакладаў відных празаікаў, паэтаў, драматургаў, крытыкаў прынялі ўдзел многія дзесяткі аратараў — прадстаўнікі пісьменніцкіх арганізацый усіх саюзных рэспублік.

На камісіі «Увасабленне ў мастацкай літаратуры тэмы рабочага класа горада і вёскі і праблем навукова-тэхнічнага прагрэсу» дакладчык Вадзім Кажэўнікаў і іншыя прамоўцы падкрэслівалі, што асабліва важнае значэнне гэтай тэмы вызначаецца кіруючай роллю рабочага класа ва ўсіх гістарычных, рэвалюцыйных, сацыяльных пераўтварэннях грамадства. Яны адзначалі, што чалавек працы ў нашай краіне выступае як носьбіт і актыўны праваднік ідэй інтэрнацыяналізму, міру, дружбы і салідарнасці працоўных усіх краін.

Сучасная савецкая рэчаіснасць дае пісьменнікам багацейшы матэрыял для таго, каб рабочая тэма паўстала ў кнігах як філасофскае абагульненне часу, як глыбокае даследаванне асобы савецкіх людзей — актыўных удзельнікаў найвялікшых здзяйсненняў стагоддзя. Гэтыя палажэнні былі праілюстраваны шматлікімі прыкладамі з творчасці пісьменнікаў розных пакаленняў.

Удзельнікі дыскусіі падкрэслівалі, што наша літаратура не баіцца гаварыць аб адмоўных з'явах жыцця, крытыкаваць недахопы. Яна робіць гэта ўпэўнена, абапіраючыся на сілу дасягненняў савецкага народа. Рабочая тэма ў нашай літаратуры — гэта расказ аб сацыялізме, што перамог, аб духоўным багацці, якое сацыялізм даў чалавеку працы.

Любая тэма ў мастацтве не можа быць асэнсавана паза маральнымі яе «параметрамі». Таму заканамерна, што пытаннямі фарміравання камуністычнай асобы і сацыяльна-маральным праблемам ў жыцці і літаратуры была прысвечана работа спецыяльнай камісіі з'езда. На ёй падкрэслівалася, што савецкая літаратура пераймае ў класікаў эстафету гуманізму і шукае новыя вобразныя сродкі, каб узвысіць свет пачуццяў людзей, садзейнічаць самаўдасканаленню асобы.

Многія пісьменнікі паставілі перад сабой мэту, як адзначаў дакладчык Віталій Озераў і іншыя выступаючыя, — паказаць гістарычную радаслоўную тых маральных стымулаў, якія рухаюць нашым сучаснікам. Маральныя імкненні будаўніка камунізму праяўляюцца ў справах, у яго сацыяльнай актыўнасці. У лепшых творах на першым плане — шматмерныя вобразы людзей, якія ў цэху, калгаснай брыгадзе, навуковай лабараторыі здзяйсняюць учынкі, прадыктаваныя іх маральнымі якасцямі.

Праз сябе, але для ўсіх — вось тыя ўнутраныя высновы жыццёвага крэда, якое спавядае камуніст, калектывіст, спалучаючы вернасць грамадзянскаму абавязку з увагай да людзей.

У век навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, гаварылася на абмеркаванні, наша літаратура прызвана выхоўваць гарманічна развітых людзей з шырокім спектрам пачуццяў.

Іх каштоўнасць вызначаецца вернасцю камуністычным ідэалам, духам таварыскасці, творчай працай. Мастацтва сацыялістычнага рэалізму арыентуе мастака на глыбокае пазнанне чалавека ў гістарычна-рэальных і псіхалагічна-праўдзівых адносінах з грамадствам, з сацыяльным асяроддзем.

Шматнацыянальная савецкая літаратура як частка агульнапартыйнай справы прызвана глыбока і натхнёна ўзнаўляць характар маладога героя нашага часу — будаўніка камунізму. На пасяджэнні камісіі «Вобраз маладога чалавека — будаўніка камунізму» падкрэслівалася, што савецкай літаратурай накоплены багацейшы вопыт і традыцыі ў адлюстраванні маладога героя нашага часу. Цяпер яго вобраз ускладніўся, сказаў дакладчык Анатолій Ананьеў, прыкметна ўзраслі культура і адукаванасць моладзі, якая самааддана працуе ў самых розных сферах вытворчасці, прыўмножаючы славу і магутнасць сваёй сацыялістычнай дзяржавы.

Проза, паэзія, драматургія занатавалі маладога чалавека — вучонага ці рабочага, інжынера ці калгаснага механізатара, што сёння жыве і працуе ў атмасферы, якая ў многім адрозніваецца ад умоў, у якіх знаходзіліся яго равеснікі, скажам, трыццатых ці пяцідзесятых гадоў. Змяніўшаяся рэальнасць, змест літаратурных твораў, які змяніўся, патрабавалі напружанага пошуку новых мастацкіх формаў.

Абвостраная цікавасць пісьменнікаў да такіх якасцей маладога героя эпохі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, як прафесіянальная кампетэнтнасць, эмацыянальная стрыманасць, разумнае размеркаванне сіл, сведчаць аб істотных зрухах у нашых меркаваннях аб часе і аб сабе, адзначалі ўдзельнікі дыскусіі. Аднак пры ўсіх станоўчых момантах гэтай літаратурнай традыцыі варта было б больш сур'ёзна падумаць аб тым, што часта не хапае падобным творам гераічных фарбаў, эмацыянальнага багацця, нарэшце, паэтычнасці і адкрытага, завостранага пафасу.

За гады Савецкай улады ў нас створана, як сказаў таварыш Л. І. Брэжнеў, цудоўная літаратура для дзяцей. Яна не ведае сабе роўных ні ў адной краіне свету. Маральная чысціня нашай дзіцячай і юнацкай літаратуры, яе ідэйнае багацце і мастацкая шматграннасць, яе аптымізм і святочнасць формы, шчасліва адпавядаючыя юнаму светаадчуванню, арганічна выцякаюць з гуманістычнай сутнасці нашага грамадства. Гэтай думкай былі пранізаны многія выступленні пісьменнікаў, якія прынялі ўдзел у рабоце творчай камісіі па праблеме «Літаратура ў камуністычным выхаванні юнага пакалення, у дзейнасці сярэдняй школы і ПТВ».

У дакладзе Сяргея Міхалкова, у выступленнях падкрэслівалася, што выхаваўчай мэтай дзіцячай і юнацкай літаратуры з'яўляецца выпрацоўка маральных норм чалавека, які жыве ў сацыялістычным грамадстве. Размова ідзе аб усведамленні свайго месца ў «рабочым страі», аб высокай маральнай патрабавальнасці да сябе, аб гатоўнасці да працы, подзвігу дзеля агульнай справы.

Гаворачы аб спецыфіцы дзіцячай і юнацкай літаратуры, аратары падкрэслівалі, што чалавек працы з самага пачатку і па сённяшні дзень застаецца яе галоўным героем. Фарміраванне чалавечай асобы — складанейшая, шматгранная справа. І роля літаратуры — гэта роля першага і галоўнага памочніка школы і ПТВ, камсамола і піянерскай арганізацыі ў выхаванні грамадзянскім, маральным, этычным, эстэтычным, інтэлектуальным.

Слаўная гісторыя нашага народа, стварыўшага першую ў свеце сацыялістычную дзяржаву рабочых і сялян, адстаяўшага яе свабоду і незалежнасць, невычэрпная крыніца для савецкіх пісьменнікаў.

У апошнія 10—15 гадоў, гаварылася на камісіі «Праблемы мастацкага адлюстравання Кастрычніцкай рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны», назіраецца прыкметны росквіт гістарычнага рамана. Такія перыяды мінулага абуджаюць творчую думку пісьменніка, прызываюць да ўсё новага і новага, больш глыбокага ўсведамлення гэтых падзей з вышыні пройдзеных намі гадоў. Значэнне гісторыка-рэвалюцыйнай літаратуры для выхавання пакаленняў будаўнікоў камунізму—бясспрэчна, адзначыў дакладчык Аляксандр Чакоўскі. Па-ранейшаму застаецца актуальнай, займае ў ёй важнейшае месца ленінская тэма. За апошнія гады ўнесены новы ўклад у мастацкую «Ленініяну», створаны значныя творы, прысвечаныя правадыру рэвалюцыі.

У гістарычнай літаратуры, гаварылі ўдзельнікі дыскусіі, важнае месца займае і тэма подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Абавязак пісьменнікаў перад гісторыяй, перад далёкімі пакаленнямі — правільна, з партыйнага, марксісцкага пункту гледжання апісаць калізіі, складанасці і цяжкасці вайны, паказаць прыроду, паходжанне здзейсненага цяперашнім, яшчэ жывучым пакаленнем савецкіх людзей, подзвігаў. Яны не маюць права на суб'ектывісцкае тлумачэнне ўсяго, што было звязана з вайной. Адбіраючы факты, пісьменнік павінен выходзіць з разумення гістарычнай заканамернасці.

Аб задачах шырокага кола літаратараў, якія выкарыстоўваюць экран як форму кантакту з тымі, для каго яны пішуць, ішла гаворка ў дакладзе Канстанціна Сімонава і выступленнях дэлегатаў на пасяджэнні секцыі «Мастацкая літаратура ў кіно, на тэлебачанні і радыё». Патрабаванні, якія прад'яўляе партыя да людзей, што маюць адносіны да мастацтва, кінематаграфіі і тэлебачання, вялізныя. Гэтая патрабавальнасць тым больш справядлівая цяпер, калі мастацтва выходзіць не толькі на кінаэкран, але і адрасавана самым шырокім масам тэлегледачоў.

Неабходна, гаварылі выступаючыя, крута павярнуцца тварам да кіно, тэлебачання і радыё, якія звязаны з штодзённым уздзеяннем на мільёны людзей, уключыўшы тэмы ў лік сваіх важнейшых творчых планаў. Партыйнасць і прынцыповасць мастака, няхай ён пісьменнік ці рэжысёр, праяўляюцца і ў выбары тэмы, і ў падыходзе да яе, у імкненні да праўдзівага адлюстравання жыцця, у рашучасці дабівацца ў сваёй рабоце высокай якасці, адзначалі ўдзельнікі дыскусіі.

Гэтыя патрабаванні справядлівыя і актуальныя наогул для мастацкай творчасці. Аб іх, у прыватнасці, гаварылася і на камісіі «Літаратура і праблемы развіцця савецкага шматнацыянальнага тэатра». Лепшыя творы драматургіі па глыбіні спасціжэння актуальных праблем сучаснасці, па літаратурнаму ўзроўню, прафесіянальнаму майстэрству адпавядаюць высокім крытэрыям мастацтва. На думку дакладчыка Афанасія Салынскага і іншых выступаючых, гэта сведчыць аб росце ідэйна-мастацкага ўзроўню савецкай драматургіі ў цэлым. Прамоўцы адзначалі, што зварот да тэмы працы — даўняя і плённая традыцыя савецкага тэатра. Дыялектычная цэласнасць асобы, індывідуальнасць, сапраўдная гуманістычнасць, самаадданае служэнне грамадскім ідэалам — усё гэта складае прынцыпова важныя рысы сучаснага героя драматургіі і тэатра.

На дыскусіі гаварылася аб вялікай ролі драматургіі ў інтэнсіўным культурным абмене, ва ўзаемаўзбагачэнні мастацтва ўсіх братніх народаў Савецкага Саюза.

Але, на жаль, драматургі нярэдка пазбягаюць творчай рызыкі і таму не захапляюць гледача дзёрзкасцю задумы. Жанравую шматграннасць нашай драматургіі неабходна пастаянна ўзбагачаць. Асабліва звярталася ўвага на тое, што мала вясёлых і вострых камедый і ўжо зусім рэдкія камедыі сатырычныя.

Пасяджэнне камісіі, прысвечанай абмеркаванню працэсаў узаемаўзбагачэння літаратур савецкіх народаў і праблем мастацкага перакладу, адкрыў Мікола Бажан. І дакладчык, і іншыя выступаючыя адзначылі, што за час паміж пятым і шостым з'ездамі пісьменнікаў, паглыбіліся, развіліся, умацаваліся тыя працэсы жыцця савецкай шматнацыянальнай, але адзінай па свайму сацыялістычнаму зместу і камуністычнай накіраванасці літаратуры, якія і прывялі яе цяпер да яшчэ больш важнай ролі ў нашым грамадстве развітага сацыялізму, ды і ва ўсім свеце.

У свеце рашэнняў XXV з'езда асабліва ярка бачна, наколькі ўзвысілася сёння значэнне — палітычнае, партыйнае, дзяржаўнае, а не толькі літаратурнае — адказнай працы пісьменніка—майстра перакладу. Няма ў свеце краіны, якая б магла параўнацца з нашай Радзімай па размаху, колькасці перакладных кніг і па агульнай ідэйнай і мастацкай якасці перакладчыцкай працы савецкіх пісьменнікаў.

Савецкія літаратары паўсядзённа і арганічна звязаны з народам, з усімі яго радасцямі і трывогамі. Іх творчасць толькі тады набывае дзейсную сілу, калі яна абапіраецца на ленінскія прынцыпы партыйнасці і народнасці мастацтва. Аб гэтым зноў і зноў гаварылі ўдзельнікі творчай размовы на камісіі «Пісьменнік — кніга — чытач». Яны адзначалі, што кніга — вынік творчага роздуму пісьменніка. І яна — кожны раз чарговая прыступка да новага цудоўнага ўзыходжання, калі з'яўляецца высокамастацкай і напоўнена грамадскім зместам.

У пісьменніка шмат добрых памочнікаў і дарадчыкаў. Партыйны і творчы калектыў, з якімі ён звязан арганізацыйнымі і духоўнымі сувязямі, рэдакцыі часопісаў і выдавецтваў, друк, літаратурная крытыка, бібліятэкі, кніжныя магазіны, нарэшце, самі чытачы.

Літаратура ствараецца для народа і народ жа стварае сваіх пісьменнікаў і літаратуру, падкрэсліў дакладчык Сяргей Сартакоў. Пісьменнік працуе не для сябе, а для чытача. І было б вельмі важна, каб пядаўна створанае таварыства кнігалюбаў побач з рашэннем многіх задач, якія стаяць перад ім, стала б добрым пасрэднікам ў перадачы пісьменнікам чытацкага меркавання.

Размах кнігавыдавецкай і часопіснай, значыць і літаратурнай справы ў нашай краіне грандыёзны. Пісьменніцкая праца ганаровая, а любоў народа да чытання здзіўляючая і нястомная. І гэта натхняе літаратараў Краіны Саветаў на новыя творчыя здзяйсненні.

«Сучасная літаратура сацыялістычнага рэалізму, сусветны літаратурны працэс і пытанні крытыкі», — вось тэма, што ўключае шмат важных праблем і аспектаў і якая абмяркоўвалася на камісіі, дзе з дакладам выступіў яе кіраўнік Міхаіл Храпчанка.

Дакладчык і выступаючыя падкрэслівалі, што месца і значэнне літаратуры сацыялістычнага рэалізму ў сусветнай літаратуры абумоўлена яе рэальнымі творчымі заваёвамі, рэальным укладам у скарбонку сусветных мастацкіх каштоўнасцей. Савецкая літаратура стала важнейшым кампанентам цэласнай, шматграннай, дынамічнай ідэйна-мастацкай сістэмы — сацыялістычнай літаратуры сучаснасці.

Характэрнымі асаблівасцямі нашай літаратурнай крытыкі апошніх гадоў, адзначалася на камісіі, з'яўляецца ўзмацненне яе актыўнасці, істотнае павышэнне агульнага ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню крытычных работ, узрастанне ролі і аўтарытэту крытыкі. Пры ўсіх відавочных поспехах, якія дасягнуты літаратурнай крытыкай, удзельнікі дыскусіі звярталі ўвагу, што яшчэ не ў поўнай меры выкарыстаны тыя выключна спрыяльныя ўмовы і магчымасці, якія створаны для творчай работы крытыкаў, пастановай ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы». Паспяховы рост нашай літаратуры і крытыкі патрабуе безупыннай распрацоўкі тэарэтычных праблем і перш за ўсё пытанняў сацыялістычнага рэалізму.

З'езд пісьменнікаў СССР працягвае работу.

**І. ВЕКСЛЕР, П. КАСАЛАПАЎ, В. ПЯТРУНЯ, М. РАЖДЗЕСТВЕНСКАЯ, З. ХРОМАВА — спец. кар. ТАСС.**

# СЛОВА СЛУЖЫЦЬ НАРОДУ

## *Выступленне Максіма ТАНКА на VI з'ездзе пісьменнікаў СССР*

VI з'езд пісьменнікаў нашай краіны праходзіць у незабыўныя дні небывалага працоўнага і творчага ўздыму ўсяго савецкага народа, які акрылены гістарычнымі рашэннямі XXV з'езда КПСС і ўпэўнена ідзе па ленінскаму шляху будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Грандыёзныя планы дзесятай пяцігодкі для кожнага з нас з'яўляюцца баявой праграмай дзейнасці, а ўдзел у эпахальных пераўтварэннях, якія ўсталёўваюць новыя, самыя справядлівыя прынцыпы і нормы жыцця на зямлі, — вялікім шчасцем для кожнага работніка сацыялістычнай культуры.

І мы, пісьменнікі, ад усяго сэрца ўдзячныя ЦК КПСС, таварышу Леаніду Ільічу Брэжневу за высокую і натхняючую ацэнку нашай работы на фронце культурнага будаўніцтва і за пастаянныя клопаты аб развіцці нашай шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

Як у кожнай тоне выплаўленага металу, здабытага вугалю, як у кожнай жмені вырашчанага збожжа ёсць працоўны ўклад усіх савецкіх людзей, так і ў савецкай літаратуры, у нашых песнях пераліваюцца фарбы неабсяжнай роднай зямлі, усіх яе рэк, мораў і горных вяршынь, гучаць галасы ўсіх брацкіх народаў, чуецца біццё сэрца сям'і адзінай.

Аб гэтым гаварылася на рэспубліканскіх з'ездах пісьменнікаў і аб гэтым пераканаўча гавораць творы, адзначаныя Ленінскімі, Дзяржаўнымі і рэспубліканскімі прэміямі, творы, якімі за апошнія гады значна папоўніўся залаты фонд савецкай літаратуры.

Ужо стала ў нас добрай традыцыяй штогод праводзіць Дні паэзіі ў Міхайлаўскім, на радзіме Шаўчэнкі, Руставелі, Данелайціса, Райніса, Вільдэ і ў нас у Беларусі — на радзіме Купалы і Коласа, а таксама ва ўсіх рэспубліках, краях і абласцях — Дні савецкай літаратуры, якія становяцца святамі дружбы нашых літаратур, нашымі пісьменніцкімі справаздачамі перад шматлікімі аўдыторыямі працоўных. Так, у нас у рэспубліцы сталі знамянальнымі падзеі, якія пакінулі глыбокае ўражанне, Дні і дэкады літаратур Расійскай Федэрацыі, Узбекістана, Літвы і дэкада літаратуры і мастацтва Украінскай ССР, якая прайшла напярэдадні нашага з'езда. А на падыходзе — сустрэчы з балгарскімі пісьменнікамі, Дні польскай літаратуры.

Вось чаму ўсё большую і большую ролю ў нашым культурным і творчым жыцці адыгрываюць пераклады. Дзякуючы перакладам на рускую мову сёння шматнацыянальная наша літаратура ва ўсім сваім буйным росквіце, разнастайнасці форм і тэматычным багацці і адзінай ідэйнай накіраванасці выходзіць на шырокую ўсесаюзную і сусветную арэну.

У сувязі з гэтым зноў паўстае пытанне аб якасці перакладаў твораў брацкіх літаратур, таму што значэнне перакладаў, якія дапамагаюць нашаму збліжэнню, узвядзенню новых мастоў паміж краінамі і кантынентамі, усё больш узрастае і будзе ўзрастаць.

І калі ўзровень перакладаў на рускую мову, як правіла, адпавядае сучасным патрабаванням, то не ўсё добра абстаіць з перакладамі на нацыянальныя мовы, бо пераклады гэтыя ў большасці выпадкаў мы робім з рускіх перакладаў, хоць усе ведаюць, што такая практыка прыводзіць да непапаўняльных страт не толькі мастацкіх якасцей арыгінала.

Сёння ўзаемаўзбагачэнне нашых літаратур ідзе па некалькіх лініях: па лініі выхаду за рамкі сваіх «мясцовых» тэм і па лініі выкарыстання, скажам, у беларускай паэзіі разам са сваімі і класічнымі формамі, якія ўжо даўно прывіліся, таксама форм і размераў рубаі, шаіраў, газел, айрэнаў і ўзнікаючых на прагрэсіўных традыцыях мінулага, новых, народжаных нашай савецкай рэчаіснасцю.

І спрэчкі, якім размерам і формам аддаць перавагу, напэўна, не маюць рашаючага значэння, таму што ўсё залежыць не ад кананізацыі якой-небудзь формы, а ад ідэйнага, паэтычнага эмацыянальнага зараду, які нясе ў сабе той або іншы твор. Ды і нараджэнне кожнага новага мастацкага твору, нягледзячы на ўсе рэцэпты таго, як рабіць вершы, усё яшчэ застаецца тайнай, бо цяжка, як хтосьці гаварыў, даць дэфініцыю паэзіі, як і дэфініцыю жырафы, але калі вы яе сустрэнеце, самі здагадаецеся, што гэта яна.

Бадай, галоўную ролю ва ўмацаванні нашых брацкіх сувязей адыгрываюць друкаваныя органы саюзаў пісьменнікаў.

І вельмі хацелася б, каб гадавы альманах «Сузір'е» і такі ж беларускі «Далягляды» сталі нарэшце часопісамі дружбы нашых літаратур, якія друкуюць пісьменнікаў брацкіх рэспублік і нашых зарубежных сяброў.

На жаль, гэтыя жыватворныя працэсы збліжэння, узаемаўплыву, узаемаўзбагачэння, у якіх удзельнічаюць і літаратуры краін сацыялізму, усё яшчэ недастаткова прасочваюцца і абагульняюцца нашай крытыкай, якая рэдка калі ў сваіх даследаваннях выходзіць за рамкі агульных канстатацый гэтых працэсаў.

Мінулае пяцігоддзе было даволі ўраджайным і для беларускай літаратуры. Гэта былі гады далейшага яе ідэйнага і мастацкага росту, інтэнсіўных пошукаў новых выразных сродкаў і прыходу ў яе вялікага атрада таленавітай моладзі, вернай купалаўска-коласаўскай традыцыі — «з цэлым светам весці размову», беларуская літаратура асвойвала ўсё новыя і новыя тэматычныя пласты жыцця.

Хацелася б адзначыць, што з лепшых твораў беларускай прозы прыходзяць да нас па-сапраўднаму светлыя вобразы герояў нашага часу, якія надзелены высокай чалавечай абаяльнасцю і камуністычнай перакананасцю. Я падкрэсліваю — з лепшых, таму што сёння нельга таксама не сказаць, што стварэнне вобраза камуніста, рабочага ўсё яшчэ востра стаіць перад нашай прозай.

Па-ранейшаму наша літаратура шмат увагі ўдзяляе гераічнай гісторыі свайго народа, азоранай нягаснучым святлом рэвалюцыі. Асабліва яркае адлюстраванне знайшлі гэтыя падзеі ў вядомай «Палескай хроніцы» І. Мележа, трэцяя частка якой «Завеі, снежань» надрукавана ў апошніх нумарах часопіса «Полымя», а таксама ў апавяданнях П. Броўкі «Разам з камісарам» і ў трылогіі М. Машары «Ускраіны змагаюцца», што з'яўляецца нібыта працягам рэвалюцыйнай тэмы, якая ў свой час магутна прагучала ў вядомым рамане П. Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах».

У мінулым годзе ў Мінску праходзіла Усесаюзная нарада пісьменнікаў і крытыкаў, прысвечаная 30-годдзю з дня Перамогі, удзельнікі якой пацвердзілі велізарнае выхаваўчае значэнне гэтай тэмы, што раскрывае веліч подзвігу савецкага народа, яго мужнасць, вернасць ідэям партыі, інтэрнацыянальнай ленінскай дружбе народаў.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў нашай беларускай літаратуры была і застаецца адной з галоўных. І гэта не дзіўна. Наша ж літаратура — голас той зямлі, дзе загінуў кожны чацвёрты з яе сыноў і дачок, дзе чуецца незмаўкальны, заклікаючы да пільнасці голас званоў Хатыні, дзе на ўсіх дарогах і партызанскіх сцежках стаяць незлічоныя курганы і абеліскі ратнай славы савецкага народа.

На гэту хвалюючую тэму напісаны В. Быкавым выдатныя аповесці «Абеліск», «Дажыць да світання», за якія ён быў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР. Быкаў верны сваёй тэме. Ён у кожнай новай аповесці ставіць цікавыя, глыбокія праблемы паводзін чалавека на вайне. Апошнія аповесці «Воўчая зграя» і «Яго батальён» сведчаць аб далейшым росце яго выдатнага таленту.

Мележ, Быкаў, Шамякін, Брыль, Адамовіч, Кулакоўскі, Карпаў, Навуменка, Асіпенка, Чыгрынаў, Пташнікаў, Сачанка, Кругавых, Аляксееў, Марціновіч — у прозе, Броўка, Куляшоў, Панчанка, Лужанін, Пысін, Аўрамчык, Кірэенка, Гілевіч, Вярцінскі, Барадулін — у паэзіі — вось толькі некаторыя імёны пісьменнікаў, якія адкрываюць усё новыя і новыя старонкі гераічнага летапісу Айчыннай вайны, каб сапраўды ніхто не быў і нішто не было забыта.

Асаблівае месца сярод твораў аб Айчыннай вайне займае кніга Адамовіча, Брыля і Калесніка — «Я — з вогненнай вёскі». На нарадзе, прысвечанай 30-годдзю Перамогі, К. Сіманаў гаварыў, што ніхто не можа прэтэндаваць на тое, што ён ведае аб вайне ўсю праўду, усю праўду ведае народ. Кніга «Я — з вогненнай вёскі» пацвярджае глыбокую ісціну гэтых слоў. Подзвіг герояў у Вялікай Айчыннай вайне будзе вечна жыць у памяці народа, нават калі знікне небяспека паўтарэння трагедый вайны, бо ён і быў здзейснены, каб мір усталяваць назаўсёды.

За апошнія гады нямала было напісана твораў на сучасныя тэмы. Гэта і новы цікавы раман І. Шамякіна «Атланты і карыятыды» аб будаўніках новага сацыялістычнага горада, «Сотая маладосць» У. Карпава аб жыцці рабочых, раман «Песні Дзвіны» Т. Хадкевіча аб будаўніках нафтаперапрацоўчага завода і некаторыя іншыя творы Асіпенкі, Сіпакова, Навуменкі, Скрыгана, Васілевіч, Віткі, Кулакоўскага, публіцыстыка Новікава, Гілтаран, Дуброўскага.

І ўсё ж, нягледзячы на колькасны і якасны рост твораў на рабочую, на так званую вытворчую тэму, мы ўсё яшчэ знаходзімся на подступах да вялікай і сапраўднай творчай удачы.

Немалых поспехаў дабілася і наша паэзія, паўнакроўнаму развіццю якой садзейнічала і тое, што ў ёй актыўна і дружна працуюць прадстаўнікі розных пакаленняў. І сёння наша крытыка з поўным правам называе ў шэрагу вядомых майстроў слова такіх розных па ўзросту паэтаў, як Броўка, Куляшоў, Панчанка, Лужанін, Кірэенка, Вялюгін, Пысін, Гілевіч, Макаль, Барадулін, Бураўкін, Вярцінскі, Грачаніхаў, Зуёнак, Сіпакоў, і іншых.

Адной з асаблівасцей сучаснага развіцця нашай паэзіі з'яўляецца ўзмацненне яе грамадзянскасці і гуманістычнай сутнасці. Трэба толькі прачытаць такія паэтычныя кнігі, як «Удзень і ўначы» П. Броўкі, «Сасна і бяроза» А. Куляшова, «Снежань» П. Панчанкі, «Прага крыла» М. Лужаніна і іншыя, каб пераканацца, з якой мастацкай непаўторнасцю кожны з іх увасабляе гэта імкненне перадаць дыялектыку прыватнага і агульнага, асабістага і грамадскага, сувымераць кожны крок нашых дзеянняў маштабамі гістарычнага прагрэсу, перспектывай будаўніцтва камуністычнай будучыні.

Нямала зроблена за апошнія гады і ў галіне драматургіі. Гэта перш за ўсё глыбока філасофская і, як назваў яе аўтар, фантастычная камедыя «Брама неўміручасці» К. Крапівы, пабудаваныя на гарачым злабадзённым матэрыяле «Заціюканы апостал», «Трыбунал», «Таблетку пад язык» і «Святая прастата» — п'есы А. Макаёнка, востра публіцыстычныя п'есы «Амністыя» і «Апошняя інстанцыя» М. Матукоўскага, «Адкуль грэх», «Трывога», «Укралі кодэкс» А. Петрашкевіча, а таксама п'есы Дзялендзіка, Маўзона, Махнача, Караткевіча і іншых.

За апошнія гады пасля вядомай пастановы ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы» значна павысіўся ідэйна-прафесіянальны яе ўзровень, больш глыбокімі і аб'ектыўнымі сталі яе абагульненні, вывады, ацэнкі. Тут можна было б назваць цэлы рад цікавых работ Адамовіча, Мальдзіса, Кісялёва, Пашкевіча, Бярозкіна, Гніламёдава, Бугаёва, Казекі, Юрэвіча, Арочкі, Каваленкі, Шкрабы і многіх іншых. Але мы не можам не адзначыць і таго, што крытыка наша ўсё яшчэ адстае ад бурнага і дынамічнага развіцця нашай літаратуры, усё яшчэ недастаткова смела гаворыць аб недахопах многіх нашых твораў, якія з'яўляюцца на старонках часопісаў, газет, а некаторыя творы маладых, якія патрабуюць больш пільнай увагі, выпадаюць з поля зроку.

Мы жывём у знамянальны час, калі дзякуючы міралюбівай палітыцы Савецкага Саюза, краін сацыялістычнай садружнасці і велізарнаму асабістаму ўкладу Леаніда Ільіча Брэжнева зроблены рашучы крок да разрадкі міжнароднай напружанасці, устанаўлення супрацоўніцтва еўрапейскіх дзяржаў на асновах мірнага суіснавання краін з розным сацыяльным ладам.

Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў вялікай хартыі міру, падпісанай у Хельсінкі ўсімі краінамі Еўропы, а таксама ЗША і Канадай.

Наша партыя і ўрад робяць усё, каб ажыццявіць гэтыя ідэі. Але, на жаль, на Захадзе ёсць яшчэ ўплывовыя сілы, якія хацелі б затармазіць гэты няўхільны працэс міжнароднай разрадкі.

Гэта мы адчуваем і на сваім літаратурным участку. Калі Савецкі Саюз шырока расчыняе дзверы для культурнага абмену і супрацоўніцтва, аб чым гавораць мільённыя тыражы твораў пісьменнікаў усяго свету, якія выдаюцца на рускай мове, а таксама на мовах народаў нашай краіны, то другі бок больш ахвотна расчыняе свае дзверы для розных палітычных авантурыстаў, якія даўно не маюць нічога агульнага з літаратурай і якім ахвотна прадастаўляюць друк, радыё, тэлебачанне ўсе сродкі сучаснай прапаганды для ідэалагічнай дыверсіі і атручвання міжнароднай атмасферы.

Савецкая літаратура — адна з самых перадавых наватарскіх і багатых сучасных літаратур свету. Яна актыўна ўдзельнічае ў стваральнай працы свайго народа, у барацьбе за свабоду, за сацыяльную і нацыянальную сгравядлівасць, за мір і шчасце, за светлую будучыню чалавецтва і яго культуры. Усё гэта надае нашай літаратуры выключна прыцягальную сілу, якая аказвае ўплыў на творчасць многіх віднейшых сучасных зарубежных пісьменнікаў.

І беларускія пісьменнікі — адзін з атрадаў нашай шматнацыянальнай літаратуры, верныя ленінскім прынцыпам партыйнасці і народнасці, нястомна павышаюць мастацкі ўзровень і ідэйнае гучанне сваіх твораў, аддаюць усе свае сілы і здольнасці ажыццяўленню вялікіх прадвызначэнняў нашай роднай партыі. **(Апладысменты).**

**Выкладчыца музычнай школы Ала Бойчанка з горада Ваўкавыска звярнулася ў рэдакцыю «ЛіМа» з пытаннем пра Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР: «Хоць калектыў гэты рэдка наведвае Гродзеншчыну, але мы заўсёды з цікавасцю слухаем у яго выкананні творы сучасных кампазітараў і класікаў. Раскажыце, калі ласка, на старонках газеты пра яго сённяшняе творчае аблічча і пра асобныя групы музыкантаў». Рэдакцыя папрасіла адказаць чытачам журналіста-музыканаўцу Ул. Шэліхіна.**

# ДЗЯРЖАЎНЫ СІМФАНІЧНЫ...

ГЭТА — творча сталы калектыў, якому пад сілу вырашэнне самых складаных выканаўчых задач. Што датычыцца яго гісторыі, то, мабыць, лепш за ўсё пра яе даведацца з БелСЭ або з кніг аб мастацтве Беларусі. Я ж дазволю сабе расказаць пра сённяшні дзень аркестра.

Запрашаю чытачоў у залу філармоніі ў Мінску. Давайце разам наведаем хоць бы рэпетыцыю аркестра, якім цяпер кіруе Юрый Яфімаў, галоўны дырыжор, выхаванец Ленінградскай кансерваторыі, дыпламант Усесаюзнага конкурсу, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Дарэчы, ад кіраўніка шмат залежыць і ў фарміраванні творчага аблічча калектыву. Страсна ўлюбёны ў музыку, Ю. Яфімаў імкнецца перадаць гэтую любоў і аркестрантам. Шкада, што публіка не бачыць твару дырыжора ў момант выканання. Якая безліч настрояў адбіваецца на ім. А красамоўныя рукі! Яны — выказнікі яго натхнёных намераў. Па сутнасці, імі дырыжор «іграе на аркестры», як любы выканаўца на сваім інструменце. Але адна справа іграць на адным інструменце, і зусім іншая падпачыніць сабе каля сотні розных індывідуальнасцей, прымусіць іх з усёй дакладнасцю і дасканаласцю ўвасобіць у гучанні музычныя вобразы, народжаныя ў выніку паглыблення гэтага дырыжорскага «я» ў задуму і выяўленчыя сродкі, скарыстаныя кампазітарскім «я». А калі дадаць яшчэ, што бывае прадугледжаным удзел у выкананні твора хору і салістаў!..

Складаная прафесія! Чалавек за пультам дырыжора гэта — мастак, які мае багатую творчую фантазію, волю, густ. Ён дае тлумачэнне складаным філасофскім і лірычным думкам, што «гучаць» на нотнай паперы... Наш аркестр мае па сваім рахунку выдатныя выкананні твораў Шастаковіча і Шчадрына, Бетховена і Равеля, Мусаргскага і Рахманінава, Брытэна і... Пералічаць можна многіх. Дыяпазон рэпертуару вялікі. І да гонару дырыжораў трэба аднесці змястоўную інтэрпрэтацыю розных твораў.

**Бліжэйшым аднадумцам кіраўніка аркестра, яго творчым камертонам з'яўляецца канцэртмайстар — першая скрыпка калектыву. Улоўліваючы імпульсы, што выходзяць ад дырыжора, ён павінен імгненна перадаць іх усяму аркестру. Ён своеасаблівы запявала. Пачэсную і адказную гэту пасаду трыццаць гадоў займае заслужаны артыст БССР Сямён Асновіч, які працуе ў аркестры з першых дзён яго існавання. Як часта мы былі сведкамі натхнёна-паэтычнага выканання імсольных фрагментаў у аркестравых творах. Ды вось і из так даўно, калі выконваўся манументальны твор геніяльнага І. С. Баха «Страсці па Матфею». Уступ да арыі альта, у якой Пётр горка раскайваецца ў сваёй здрадзе, давераны скрыпцы. А потым яна разам з голасам і ўмольвае, і плача, і імкнецца душу ачысціць. Піпшчотны, пявучы голас скрыпкі С. Асновіча, яго дасканалае тэхнічнае майстэрства глыбока і пранікнёна выказалі незвычайную прыгажосць і філасофскую ўзвышанасць бессмяротнай музыкі Баха. А калі ў першай частцы Шостай сімфоніі Чайкоўскага скрыпічная група іграе знаёмую напеўную тэму, ці ў фінале перадае настрой нястрыманага адчаю, задача канцэртмайстра дабіцца, каб група гучала як адзін інструмент.**

Праводзячы сваю лінію, група другіх скрыпак, якой кіруе М. Бараноўскі, адпавядае другому голасу ў дуэце. Як тонка павінна яна адчуваць характар гучання першых скрыпак, каб быць іх дастойным партнёрам! І, зноў-такі, важная роля тут належыць канцэртмайстру другіх скрыпак.

Групу альтоў узначальвае адзін са старэйшых артыстаў аркестра — Б. Гофман. Голас альта можна лёгка ўзнавіць у памяці, калі прыгадаць адажыо з балета Адана «Жызель». Фрагмент гэты можна нярэдка ўбачыць па тэлебачанню ў канцэртным выкананні і, натуральна, у спектаклі. Тэмбр альта найлепшым чынам адпавядае сэнсу падзей. Жызель у другім акце—гэта ўжо мроя. І скрыпка, напрыклад, дала б тут фарбы жыццёвыя, светлыя. Такім чынам, альт хаця і не так ужо часта, але бывае незаменным салістам.

Нельга застацца абыякавым, калі ў пэўных эпізодах гучыць аксамітны голас групы віяланчэлей на чале з канцэртмайстрам В. Хальфіным. Фундамент, аснову гучання струнным інструментам надаюць кантрабасы. Упэўнена вядзе за сабой усю групу музыкант з вялікім стажам і вопытам В. Глугоўскі. Кантрабас рэдка бывае салірующым інструментам у аркестры. Але, калі даводзіцца, уся група робіць гэта даволі важка і, нягледзячы на масіўнасць інструмента, іншы раз і рухома, імкліва, як, напрыклад, у скерца з Пятай сімфоніі Бетховена.

Струнны квартэт бадай, з'яўляецца асноўнай, вядучай групай сімфанічнага аркестра.

Думкі гэтыя і музычныя прыклады прыгадваюцца таму, што па ходу рэпетыцыі Юрый Яфімаў неадпойчы спыняе ігру аркестра, нешта тлумачыць музыкантам, дамагаецца найлепшага гучання, і мы маем магчымасць працягваць знаёмства з нашым аркестрам.

На рэпетыцыі прысутнічае і другі дырыжор Анатоль Энгельбрэхт. Ён таксама выхаванец Ленінградскай дырыжорскай школы, дыпламант Усесаюзнага конкурсу. Зараз, відаць, прыкідвае, як бы ён трактаваў той ці іншы эпізод, ці твор цалкам. А, можа, і робіць для сябе пэўныя вывады і марыць пра выкананне якога-небудзь твора. Рэпертуар Анатоля Энгельбрэхта ўвесь час пашыраецца.

**На другім плане пасля скрыпак і віяланчэлей мы бачым групу духавых інструментаў. Мяккаму ласкаваму гучанню струнных духавая група ў аркестры надае як быццам новы характар, калі яны іграюць адначасова. У групе драўляных духавых флейта, відаць, адпавядае скрыпцы. Артыст аркестра Г. Гедыльтэр вельмі натуральна перадае на флейце голас птушкі ў сімфанічнай казцы Пракоф'ева «Пеця і воўк». Але тая ж флейта далёкая ад легкадумнай птушкі, напрыклад, у папулярнай «Мелодыі» Глюка. Тут Г. Гедыльтэр выказвае задуменныя пачуцці, узнёсла сумуе яго флейта. Наогул, флейце, як нам здаецца, не даводзіцца скардзіцца на недахоп рэпертуару. А вось флейту пікала В. Грыгор'ева можна смела параўнаць з каларатурным сапрана—гарэзлівы, вясёлы інструмент.**

Габой і англійскі ражок — блізкія родзічы. Гэта красамоўна пацвярджаюць выканаўцы на гэтых інструментах В. Фралоў і Я. Шаблоўскі. Іх перакліч ў «сцэне ў палях» з фантастычнай сімфоніі Берліёза нагадвае гукі пастуховых дудак. Ды толькі нешта сумныя думкі выклікае гэты задуменны дуэт. Што ж, артысты імкнуцца як мага глыбей перадаць характар і настрой музыкі вядомага французскага кампазітара.

У групе валторнаў мы бачым старэйшых артыстаў аркестра Э. Фарберава і М. Гурэвіча. Шаноўны інструмент — валторна. Яго задушэўны матавы тэмбр здольны выказваць сур'ёзныя глыбокія пачуцці. Калі Э. Фарбераў іграе славуты маналог валторны ў другой частцы Пятай сімфоніі Чайкоўскага, міжволі прыгадваецца фільм выдатнага рэжысёра Пратазанава «Беспасажніца». Менавіта гэты фрагмент сімфоніі палічыў ён найбольш адпавядаючым самым трагічным момантам жыцця гераіні п'есы Астроўскага.

У кларнета больш рознабаковы характар — ён можа быць і вясёлым, рухомым, і даволі задуменным, сур'ёзным. Глыбокі сум ахоплівае душу, калі чуеш трагічны расказ Франчэскі ў віхуры грэшнікаў дантаўскага «Пекла». Менавіта кларнету даверыў Чайкоўскі ў сваёй сімфанічнай паэме «Франчэска да Рыміні» споведзь душы пакутнай дзяўчыны. Канцэртмайстар групы кларнетаў нашага аркестра—Р. Ігнацьеў.

У оперы Р. Вагнера «Валькірыя», у эпізодзе «Палёт валькірый», напрыклад, мы можам і не ўбачыць непасрэднага палёту закаваных у латы ваяўнічых дачок бога Вотана, але гукі трамбонаў пры падтрымцы іншых інструментаў малююць вельмі ўражлівую карціну імклівага палёту. Не раз даводзілася выконваць гэты фрагмент і валтарністу П. Вайналовічу, які вельмі даўно працуе ў Дзяржаўным сімфанічным аркестры БССР.

Фагот А. Новікава не адрозніваецца характарам ад сваіх аднапляменнікаў. Як і ў іх, характар яго бурклівы, недаверлівы. А вось труба В. Волкава заўсёды жыццесцвярджальная, бадзёрая.

Прыгадайце ўсе энергічныя заклікі ў операх Рымскага-Корсакава «Залаты пеўнік» альбо «Казка пра цара Салтана», ці ўспомніце, як урачыста спявае гэты інструмент у хуткіх частках кантат Баха — гучыць ад радасці літаральна ў нябёсах, і вы зразумееце, што трубе Волкава сумаваць няма калі. Затое туба Я. Мельнічука лічыць, што няма чаго мітусіцца. Яна іграе не шмат нот, але якія яны важкія, фундаментальныя. Акурат як бас прафунда ў хоры. Адзін са старэйшых інструментаў аркестра — арфа. На ім даўно і па-майстэрску іграе наша арфістка А. Шухман. Часцей за ўсё стыхія арфы—усплёскі хваль. Прыгадайце балет «Лебядзінае возера». Але спытайце ў А. Шухман, ці толькі водную стыхію малюе яе інструмент, і яна з поўнай падставай адкажа, што арфа здольна перадаваць розныя пачуцці. І падмацуе сваю думку прыкладам з «Фантастычнай сімфоніі». Там у вальсе арфа сваімі радаснымі пасажамі, бадай, красамоўней за іншыя інструменты малюе настрой светлы, жыццесцвярджальны, бо да сумнага фіналу яшчэ далёка.

**Цяпер давайце пазнаёмімся з групай ударных інструментаў. Гэта царства гукаў самых разнастайных. Тут і літаўры, і барабан, і магутны там-там, і жвавыя званочкі, і ксілафоны, і безліч самых розных інструментаў, якія надаюць асаблівы каларыт гучанню аркестра. Чаго вартая была б тая ж «сцэна ў палях» з фантастычнай сімфоніі без раскатаў грому, якія з вялікім майстэрствам перадае на літаўрах ветэран аркестра Л. Капілаў. Гэта не проста гром, гэта прадвеснік трагічнага лёсу героя.**

**...Наша знаёмства з Дзяржаўным сімфанічным аркестрам можна параўнаць з паступовым нарастаннем гучання розных інструментаў у славутым «Балеро» Равэля. З зайздроснай дасканаласцю на працягу семнаццаці мінут гучання бесперапынна вядзе свой строга рытмічны пошчак на малым барабане адзін са старэйшых музыкантаў Л. Гурэвіч.**

Мы не заўважылі, што перапынак закончыўся, аркестру трэба працягваць рэпетыцыю.

Пакінем залу філармоніі, дзе працягваюцца творчыя пошукі, спынімся ў вестыбюлі. Папросім яшчэ некалькі слоў сказаць пра аркестр яго артыста А. Іёду. Даведваемся, што большасць аркестрантаў — выхаванцы мінскай кансерваторыі і музычных вучылішчаў. Ветэранамі аркестра можна лічыць скрыпачоў Р. Асновіча, Р. Мядзведзева, Я. Ходаша, Р. Альтшулера, А. Маеўскую, С. Мышкоўскага, Ю Гершовіча, В. Баткіну, С. Кельмана, М. Бака, альтыста А. Зуева, які з'яўляецца і бібліятэкарам аркестра, віяланчалістку Р. Батвіннік, кантрабасіста Ю. Талесніка, трубача А. Куціка, С. Розенмана (ён жа інспектар калектыву), фагатыста С. Ажыгіна, валтарніста Я. Агурчанкава і іншых. Нядаўна ўвайшлі ў склад аркестра маладыя музыканты — скрыпачы Б. Берэнштэйн, М. Альтшулер, валтарніст У. Сакалоў, кларнетыст І. Забара. Нярэдка ў канцэртах выступае дырыжор-стажор У. Андропаў.

Вось цяпер можна лічыць, што вы пазнаёміліся з Дзяржаўным сімфанічным аркестрам БССР. Фрагменты з твораў мы нагадалі, каб вы ўявілі сабе і гучанне інструмента, а не толькі даведаліся прозвішча музыканта, які на ім іграе.

**Уладзімір ШЭЛІХІН.**

**Слонімскі народны драматычны тэатр нядаўна парадаваў гледачоў спектаклем па п'есе І. Козела «Папараць-кветка». Рэжысёр і мастак яго—заслужаны работнік культуры БССР М. Варвашэвіч. На здымку: сцэна са спектакля.**

Фота М. ЖЫТКЕВІЧА.

# НА БЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ

На наступным тыдні глядзіце перадачы Беларускага тэлебачання для аматараў літаратуры і мастацтва.

**28 чэрвеня, у панядзелак,** у **14.45** па першай праграме пазнаёмцеся з творчасцю У. Лугаўскога. Перадача падрыхтавана да 75-годдзя з дня нараджэння паэта.

У **19.55** глядзіце 4-ю серыю прэм'еры тэлевізійнага шматсерыйнага мастацкага фільма «Чырвонае і чорнае».

80-годдзю з дня нараджэння П. Антакольскага прысвечана праграма «Паэзія», якая адбудзецца ў **21.30**. У **22.20** слухайце музыку А. Пятрова ў выкананні ленінградскіх артыстаў.

**У аўторак, 29 чэрвеня,** па першай праграме ў **11.05** запрашаем па фільм-балет «Вобразы танца». Канцэрт Дзяржаўнага Кубанскага казачка народнага хору глядзіце ў **19.05.**

5-я серыя прэм'еры тэлевізійнага шматсерыйнага мастацкага фільма «Чырвонае і чорнае» у **19.50**

**30 чэрвеня, у сераду,** па першай праграме ў **19.35** прапануем тэлевізійны спектакль В. Суглобава «Асабістая справа». У **21.30** — канцэрт народнай артысткі СССР І. Архіпавай.

**У чацвер, 1 лігеня,** па першай праграме ў **19.00** запрашаем на «Музычны абанемент». Спявае народны артыст СССР Ю. Гуляеў. Уступнае слова народнай артысткі СССР Б. Рудэнка.

У **21.30** глядзіце перадачу, прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння К. Транёва, «Расказы пра тэатр». Весці яе будзе Н. Абалкін.

**2 ліпеня, у пятніцу,** па першай праграме ў **16.00** прапануем школьнікам паглядзець «Літаратурны тэатр». Будзе паказана «Балада Брэсцкай крэпасці» Р. Барадуліна.

У **18.25** — прэм'ера дакументальнага фільма «Вайна скончылася — барацьба працягваецца».

**3 ліпеня, у суботу,** у **11.00** па першай праграме пазнаёмцеся з жывапісам Францыі XVII—XVIII стагоддзяў у перадачы «Па музеях і выставачных залах», якая будзе трансліравацца з Дзяржаўнага музея выяўленчых мастацтваў імя Пушкіна.

У **16.00** «Слова — паэзіі». Выступае паэт М. Лужанін, дэлегат VI з'езда пісьменнікаў СССР. Канцэрт салісткі Беларускага тэлебачання і радыё Т. Раеўскай слухайце ў **16.20.** У **20.15** запрашаем на аднаактовы балет «Іспанскія мініяцюры». Спектакль Новасібірскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета. Пастаноўка Віана Херарда.

**У нядзелю, 4 ліпеня,** па першай праграме ў **12.00** глядзіце спектакль Маскоўскага акадэмічнага тэатра імя Массавета «Вячэрняе святло». У **18.50** — на экране фільмы з удзелам Ч. Чапліна: «Знаёмства, якое адбылося», «Маскарадная маска» і «Бадзяга».

У **21.30** — «Гадзіна Вялікага сімфанічнага аркестра». У праграме творы Я. Сібеліуса і Э. Грыга. Выконвае Вялікі сімфанічны аркестр Цэнтральнага тэлебачання і Усесаюзнага радыё. Дырыжор — народны артыст РСФСР В. Федасееў. Вядучая Вольга Дабрахотава.

Па другой праграме ў **11.30** запрашаем на «Літаратурныя гутаркі». Вядучы — паэт А. А. Суркоў. У **12.10** — «Іграе лаўрэат міжнародных конкурсаў В. Камышоў». У праграме вы пачуеце творы Ф. Ліста.



# БЕЛАРУСКІЯ АРХІТЭКТАРЫ — СЁЛАМ РАСІІ

Праектныя работы інстытута «БелНДІгіпрасельбуд» шырока вядомы ў нашай краіне. Тут працуюць у творчай садружнасці як маладыя спецыялісты, так і архітэктары, якія ўжо дзесяткі гадоў праектуюць нашы сёлы і гарады. У інстытуце распрацоўваюцца культурна-бытавыя, грамадскія будынкі, жылыя дамы для сельскай мясцовасці. Гэтыя збудаванні маюць высокія архітэктурныя і эстэтычныя якасці, гарманічна ўпісваюцца ў ландшафт мясцовасці.

Паводле праектаў Інстытута «БелНДІгіпрасельбуд» за апошні час пабудавана шмат новых, прыгожых, адпавядаючых сучасным архітэктурна-мастацкім патрабаванням культурна-бытавых будынкаў, жылых дамоў і вытворчых памяшканняў. Калектыў інстытута ўжывае новыя прыёмы ў планіроўцы і забудове сельскіх пасёлкаў. У праектах улічваецца і перспектыўнае развіццё сельскіх населеных пунктаў на будучыню. Работы «БелНДІгіпрасельбуда» не раз атрымлівалі на конкурсах дыпломы і прэміі.

У 1975 г. калектыў супрацоўнікаў інстытута ўдзельнічаў ва Усесаюзным адкрытым конкурсе на распрацоўку эскізнага праекта планіроўкі і забудовы пасёлка і грамадскага цэнтра калгаса імя Леніна (пасёлак Краменкі Калужскай вобласці). Конкурс быў аб'яўлены Дзяржбудамі СССР і РСФСР, Саюзам архітэктараў СССР. Мэта — выявіць найбольш эканамічныя, рацыянальныя і выразныя архітэктурна-планіровачныя і аб'ёмна-прасторавыя вырашэнні планіроўкі і забудовы пасёлкаў нечарназёмнай зоны Расіі.

У распрацоўцы конкурснага эскізнага праекта ўдзельнічалі супрацоўнікі інстытута: лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР архітэктар В. Н. Емяльянаў, маладыя архітэктары і вучоныя А. І. Старасценка, Р. І. Белагорцаў, Т. Е. Галіота, Ф. В. Слівінскі, Е. Я. Гарцуева, А. П. Анацэнка, А. М. Акулёнак. Іх работа ўдастоена першай прэміі.

Аўтары праекта выязджалі ў пасёлак Краменкі. Яны азнаёміліся з прыроднымі ўмовамі, вытворчай дзейнасцю, бытавымі патрэбамі калгаснікаў. І толькі пасля такога знаёмства пачалі работу.

Рацыянальнае размяшчэнне будынкаў культурна-бытавога абслугоўвання дало магчымасць правільна вырашыць і функцыянальна - планіровачны прынцып пасёлка. Аўтарам удалося арганічна злучыць забудову з акаляючай прыродай.

І не выпадкова, па жаданню Калужскага аблвыканкома распрацоўка тэхнічнага рабочага праекта планіроўкі пасёлка Краменкі таксама даручана гэтаму аўтарскаму калектыву.

У інстытуце «БелНДІгіпрасельбуд» архітэктарам А. В. Гедройцам распрацаваны і тэхнічны праект цэнтральнага пасёлка саўгаса «Беларускі» Пыталоўскага раёна Пскоўскай вобласці.

Неўзабаве калектыў інстытута пачне стварэнне іншых праектаў для сёл братняй Расіі.

**НА ЗДЫМКУ:** праект забудовы пасёлка Краменкі Калужскай вобласці.

**С. АЦЕНКОЎ.**

# ВУЛІЦЫ ДАРАГІХ ІМЁН

На вуліцы імя М. В. Гогаля ў г. Бабруйску.
Малюнкі Ул. СІБІРАКОВА.

# ГАЛЕРЭЯ ГЕРОЯЎ

ПА ПАЖАЎЦЕЛЫХ ад часу фатаграфіях даўно мінулых гадоў, паводле расказаў родных і блізкіх, а то і проста добрых знаёмых стварэў галерэю партрэтаў герояў Айчыны, навечна залічаных у спісы часцей і падраздзяленняў Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, мастак Мікалай Іванавіч Валынец. І трэба аддаць належнае — ён бліскуча справіўся з гэтай нялёгкай задачай. Яму дапамаглі шматгадовы вопыт і тое, што сам мастак прайшоў франтавыя дарогі.

Перад самай вайной закончыў М. І. Валынец Віцебскі мастацкі тэхнікум. Затым ваяваў на франтах Вялікай Айчыннай вайны, прымаў удзел у бітвах супраць імперыялістычнай Японіі на Далёкім Усходзе. Ратныя подзвігі салдата адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі, падзякамі камандавання.

А калі закончылася вайна, М. Валынец вярнуўся да сваёй любімай справы.

Мастак шмат ездзіць па краіне і рэспубліцы, сустракаецца з былымі партызанамі і падпольшчыкамі, наведвае воінскія часці і падраздзяленні, знаёміцца з жыццём і бытам воінаў у мірныя дні. Ён падоўгу затрымліваецца ў некаторых часцях, дапамагаючы ствараць і афармляць музеі і пакоі баявой славы, ўвекавечваць памяць герояў вайны. Так, у адной з праслаўленых авіяцыйных часцей акругі мастак у апошні час напісаў шэсць партрэтаў, якія цяпер экспануюцца ў музеі баявой славы.

У гады свайго юнацтва М. Валынец марыў стаць ваенным лётчыкам, але па стану здароўя не падышоў у гэты род войск. З таго часу і па сённяшні дзень ён моцна сябруе з авіятарамі. У адной з авіяцыйных часцей ЧБВА, асабовы састаў якой у гады Вялікай Айчыннай вайны вылучыўся ў паветраных баях за наш родны Мінск, жывапісец стварыў на грамадскіх асновах галерэю з 19 партрэтаў герояў Савецкага Саюза.

Пэндзлю мастака належаць таксама чатыры партрэты герояў-танкістаў, якія праславіліся ў баях за Барысаў, у тым ліку камандзіра гераічнага экіпажу «Т-34» гвардыі лейтэнанта Паўла Рака, механіка-вадзіцеля гвардыі сяржанта Аляксандра Пятраева і наводчыка гарматы гвардыі сяржанта Аляксандра Данілава. Гэтыя партрэты ў Дзень Перамогі будуць ва ўрачыстай абстаноўцы перададзены падраздзяленню, у спісы якога загадам Міністра абароны СССР героі залічаны навечна.

Нядаўна ў Мінскім акруговым Доме афіцэраў экспанавалася выстаўка М. І. Валынца, на якой было паказана 40 партрэтаў герояў Савецкага Саюза, у тым ліку 14 залічаных навечна ў спісы падраздзяленняў ЧБВА. Гэта — героі бітвы за Днепр, бясстрашныя сокалы Н-скай гвардзейскай авіяцыйнай часці лётчык-штурмавік малодшы лейтэнант Іван Удавенка і штурман лейтэнант Мікіта Гаманенка; ефрэйтар Пётр Купрыянаў і гвардыі радавы Сяргей Роман; камандзіры батарэй самаходных артылерыйскіх установак — брат легендарнай партызанкі Зоі — камсамолец гвардыі старшы лейтэнант Аляксандр Касмадзем'янскі і лейтэнант Пётр Вяршыгара, многія іншыя героі бітваў за Радзіму.

Дзевятнаццаць лётчыкаў і штурманаў Н-скага авіяцыйнага палка за гераізм і мужнасць, праяўленыя на палях бітваў Вялікай Айчыннай вайны, былі ўдастоены вышэйшай узнагароды — звання Героя Савецкага Саюза, а двое з іх — лётчыкі Павел Андрэевіч Таран і Васіль Мікалаевіч Осіпаў — удастоены гэтага звання двойчы. За выдатныя баявыя дзеянні часці прысвоена гвардзейскае званне, а за вызваленне сталіцы Савецкай Беларусі — горада-героя Мінска яна ўзнагароджана баявым ордэнам. Партрэты герояў паветраных баёў, напісаныя мастаком, таксама экспануюцца на выстаўцы.

Некаторыя героі, партрэты якіх дэманстравалі ў экспазіцыі, жывуць і працуюць у Мінску. Адны з іх, як, напрыклад, генерал-маёр танкавых войск Ф. А. Рудской працягвае службу ў арміі, з'яўляецца начальнікам Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча. Былы камбрыг 8-й партызанскай брыгады палкоўнік С. Г. Жунін па стану здароўя выйшаў у адстаўку і займаецца літаратурнай дзейнасцю, піша кнігі пра барацьбу савецкіх людзей у тыле ворага.

На персанальнай выстаўцы М. І. Валынца экспанаваліся таксама карціны, пейзажы, малюнкі, партрэты вядомых людзей арміі і працы, выкананыя аўтарам у час яго паездак па родным краі, па ленінскіх мясцінах ва Ульянаўску, Казані, Шушынскім, Ленінградзе і Маскве.

**Я. МАЛЫ.**

## Поспех выстаўкі

*У Крычаўскім раённым Доме культуры адкрылася выстаўка акварэлей мастакоў Магілёўскай вобласці. Гледачы маюць магчымасць азнаёміцца больш чым з 60 работамі. Гэта і пейзажы, і партрэты, і нацюрморты. Асаблівым поспехам карыстаюцца работы мастакоў В. Кісялёва, В. Васіленкі, І. Ярашчанкі і многіх іншых.*

*І. СЦЯПУРА,*
супрацоўнік Крычаўскай раённай газеты «Ленінскі кліч».

# АПЛАДЫСМЕНТЫ — ГАСЦЯМ

НА СПЕКТАКЛІ Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Массавета немагчыма набыць білеты. І тых «лішніх», на якія ўскладаюцца такія вялікія спадзяванні, таксама не бывае. Дарэмна сотні людзей чакаюць на дальніх подступах да оперпага і да Дома афіцэраў тых, хто ахвяруе ім месца хоць на самым высокім балконе, па галёрцы... Грамадскасць сталіцы Беларусі з вялікай цікавасцю сустрэла выступленні аднаго з праслаўленых калектываў краіны. Гэта адчулі госці. На прэс-канферэнцыі галоўны рэжысёр тэатра Ю. Завадскі адзначыў гэта. Ён прыгадаў словы Уладзіміра Ільіча Леніна аб тым, што працоўныя заслугоўваюць нечага большага за відовішча, яны заслужылі права на сапраўды вялікае мастацтва. «Мы і тут, сярод гасцінных мінчан, яшчэ раз пераконваемся,—сказаў Ю. Завадскі, — што прагнозы скептыкаў адносна таго, што ў эпоху развіцця кіно і тэлебачання тэатру пагражае заняпад, аказаліся заўчаснымі і памылковымі. Мастацтва сцэны цяпер перажывае своеасаблівае адраджэнне, яно прыцягвае да сябе ўладарна, фенаменальна. Дасведчаны і захоплены патокам інфармацыі чалавек прагне і адчувае ўнутраную неабходнасць у жывых і непасрэдных кантактах з жывым прамоўцам, з жывым акцёрам-выканаўцам, з рэальным хваляваннем і роздумам, яму патрэбна быць саўдзельнікам творчага акту. Нашы спектаклі ў Мінску — прыклад менавіта такога ўзаемнага прыцягнення сцэны і глядзельнай залы...»

Для таго, каб так уздзейнічаць на людзей, якія імкнуцца абавязкова наведаць спектаклі Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Массавета, Ю. Завадскаму і яго паплечнікам і вучням давялося шмат працаваць. Рэжысура массаветаўцаў прапануе ў кожным спектаклі самабытнае пастановачнае вырашэнне аўтарскай задумы, і «Пецярбургскія сны» паводле Ф. Дастаеўскага не маюць нічога агульнага з эстэтыкай сцэнічнага ўвасаблення сучаснасці, такіх п'ес, як, напрыклад, «Вячэрняе святло» А. Арбузава або «Дзень прыезду — дзень ад'езду» В. Чарных, а прыёмы раскрыцця чалавечых пакут і радасцей у сцэнічным «перакладзе» мемуарных кніг («Эдзіт Піяф») адрозніваецца ад таго, як «чытае» тэатр прозу Г. Бёля («Вачыма клоўна»)... Сцэнічныя эфекты і пастановачныя сродкі падначалены, аднак, усюды і заўсёды аднаму імкненню, якое, відаць, дарагое Ю. Завадскаму як былому выдатнаму акцёру студыі пад кіраўніцтвам Я. Вахтангава і МХАТа: на першым плане — артыст, выканаўца ролі, мастак, праз якога драматург і наогул тэатр сцвярджае тыя або іншыя ідэі.

Яго вялікасць Акцёр...

**— Так, тэатр прывёз у Мінск цудоўных акцёраў, аб'яднаных нечым агульным, — сказаў карэспандэнту «ЛіМа» лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР рэжысёр тэлебачання Аляксандр Гутковіч, — асобай і творчым абліччам самога мастацкага кіраўніка тэатра — Завадскім. Я гэта адчуў, калі працаваў над тэлевізійным фільмам «Уся каралеўская рацэ» паводле Уорэна. У даволі страматым падборы выканаўцаў Расціслаў Плят, Барыс Іваноў і Георгій Жжонаў нечым вылучаліся. Я сказаў бы нават вытанчанай культурай працы над ролямі. Скажам, здараліся працяглыя перапынкі ў здымках. Здавалася б, акцёр забудзе аб тым, што было папярэдне ім «пражыта» на здымачнай пляцоўцы, што яму будзе цяжка «працягваць» жыццё ў вобразе. На студыю прыходзіў Р. Плят, і мы здзіўляліся: яго суддзя Ірвін дзейнічаў у кадры так, быццам учора былі спынены папярэднія здымкі і абмеркаваны «задачы» і «прыстасаванні» для паказу вось гэтага стану душы героя... Псіхалагічны аналіз становішча, у які персанаж паставіў сябе сам або загнаў яго лёс, — гэта ў акцёра, які прайшоў «універсітэты Завадскага», моцны бок творчай падрыхтоўкі да выступлення на сцэне або на здымачнай пляцоўцы. Мабыць, таму яны так арганічна адчуваюць, хто яны сёння на падмостках: інтэлігент у «Шторме» або англійскі пурытанін у п'есе сучаснага драматурга Пітэра Усцінава «На палове шляху да вяршыні»...**

Звяртаеш увагу на багацце артыстычнага арсенала лепшых у трупе акцёраў. Ад рэалістычнага праўдападабенства да вострага гратэску — ўсё ў іх атрымліваецца натуральным, па-сцэнічнаму яскравым. Адчуваючы тэатр як штосьці адзінае, А. Гутковіч слушна заўважыў тую патрабавальную пачцівасць, з якой Ю. Завадскі ставіцца да сваіх вучняў наогул. Зразумела, акцёру кожны з рэжысёраў, каго запрашаюць у тэатр імя Массавета, давярае перадаць і раскрыць самае запаветнае ў вобразе. Строгі і стрыманы малюнак сцэнічных партрэтаў таго ж Г. Жжонава і тэмпераментная выбуховасць Т. Бястаевай, псіхалагічная праўда ў кожным позірку і кожным подыху гераінь І. Савінай і ўнутраная абгрунтаванасць слова і жэста ў М. Пагаржэльскага, трапяткі нерв «падтэкстаў» В. Талызінай і сакавітыя фарбы ў абмалёўцы характару К. Міхайлава... Якая гэта мазаічная з'ява — тэатр! І бязлітасна валявы творчы імпульс Ю. Завадскага аб'ядноўвае ўсіх, вядзе да агульнай мэты.

**Народны артыст СССР, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР Герой Сацыялістычнай Працы Ю. Завадскі, дырэктар тэатра Л. Лосеў, заслужаная артыстка РСФСР Н. Ткачова, артыстка І. Аленікава, народная артыстка СССР В. Марэцкая і артыст І. Старыгін знаёмяцца з Мінскам.**

Фота Ул. КРУКА.

Вось што гаворыць аб радасці сустрэчы з сапраўды вялікім акцёрскім мастацтвам паэт Аляксей Русецкі:

**— На спектаклі «Дзіўная місіс Сэвідж» я заўважыў той амаль няўлоўны момант, калі В. Марэцкая, пераступіўшы «парог» сцэны, раптам адчула ўзрушаную ўвагу да сябе залы і ў той жа час натхнёна — менавіта натхнёна! — паглыбілася ў перажыванні місіс Сэвідж. І на працягу спектакля жыла імі, не дазваляючы сабе выступаць на першы план, адціскаць іншых выканаўцаў, хоць ведала: да яе прыкаваны позірні большасці з нас. Яна была роўнай сярод роўных на сцэне і, разам з тым, акурат В. Марэцкая была творчым лідэрам, яна вяла за сабой ансамбль, вызначала ўзровень і напал тэмпераментнага напаўнення і інтанацыйнага ладу... Слухаць яе і глядзець на яе ў ролі — эстэтычная асалода. Таму пасля таго, як закрылі заслону, ёй былі адрасаваны самыя гарачыя апладысменты. Але спектакль скончыўся, і В. Марэцкая была сама сабой, і мы ўбачылі, якой працай і якім напружаннем даецца такое майстэрства, філіграннае, я нават сказаў бы, рафініраванае... Вобраз, створаны талентам і майстэрствам В. Марэцкай, надоўга западае ў памяць.**

Гастролі працягваюцца.

В. ІВІН.



# ПОШУК НЕПАЎТОРНАГА

ПРАЗ якіх паўгадзіны фае тэатра запоўняць гледачы — старшакласнікі, рабочая моладзь, студэнты. Пакуль што—тут цішыня. Сціплае святло. Пустыя крэслы. Звонкім рэхам аддаецца кожны крок.

Акцёр спяшаецца да сябе ў грыміравальны пакой. Ён ідзе на спатканне з мастацкім вобразам, з сённяшнім сваім героем. Ён будзе ляпіць яго з «сябе», са свайго тэмпераменту, голасу, пластыкі. Штосьці з таго, аб чым раніцай думалася, што потым было перажыта на працягу дня абавязкова адаб'ецца на персанажы, «праб'ецца» на сцэну. Агульны ж малюнак замацаваны ў садружнасці з рэжысёрам-пастаноўшчыкам, у кантакце з партнёрамі. «Усё» сфарміравалася пад уплывам глядзельнай залы... І ўсё ж кожны спектакль — гэта пошукі нейкіх новых штрыхоў, новых якасцей у абліччы героя.

Аб гэтым міжволі думаеш, калі бачыш на сцэне Кацярыну Доўнар. Чалавечае «я» актрысы нібы раствараецца ў псіхалагічным свеце персанажа. Яна працуе звычайна з такім непасрэдным захапленнем, быццам сама адкрывае для сябе гэтае новае чалавечае «я», тып чалавека, новы духоўны клімат.

Ёсць у яе рэпертуары ролі, дзе дастаткова толькі «крыху» змяніць рытм або дадаць «трошкі» агню ў тэмперамент, — і вось ты ўжо не Кацярына Доўнар, а напрыклад, Муза Зосімава з «Чатырох кропель» В. Розава.

Бывае, роля ставіць актрысу перад праблемай іншага плана — стварыць казачны персанаж, які народжаны фантазіяй аўтара, існуе ва ўяўленні гледача. Прыклад — вядомы драўляны чалавечак Бураціна. Менавіта ў гэтай ролі ёй давялося выявіць сваю акцёрскую вынаходлівасць і падкрэсліць, што яна актрыса «школы перажывання», якой яе і выхоўвалі педагогі па тэатральна-мастацкаму інстытуту Дзмітрый Арлоў і Зоя Свінарская, актрыса, здатная паглыбіцца і ў такі парадаксальны свет.

**Бураціна ў Доўнар раптам «ажыў» на адной з рэпетыцый. Ён быў амаль такім жа хлапчуком з шырока адкрытымі на жыццё вачыма, як і хлопчыкі і дзяўчынкі, што сядзелі ў зале. Жвавы і вясёлы, Бураціна захапляў сваім аптымізмам і радасцю жыцця. Колькі неверагодных і, здавалася б, неблапечных прыгод перажывае Бураціна! Яго лавілі, падманвалі, крыўдзілі, але ён з усіх нягод выходзіць усё ж па-ранейшаму шчаслівы ад таго, што жыве на гэтым свеце. І зноў кідаецца ў неймаверныя прыгоды. Як арганічна паводзіць сябе актрыса ў сцэне спектакля, дзе выступае лялечны тэатр: даверлівымі вачыма глядзіць Бураціна на гэтае відовішча, і дзеці ў зале, паверыўшы ў рэальнасць існавання Бураціна, мала чым адрозніваліся ад свавольнага і вясёлага хлапчука на сцэне. Хіба што ў Бураціна нос быў даўжэйшы...**

**Кацярына Доўнар у гэтай ролі нібы спявала жартоўную і сур'ёзную мелодыю душы—даверлівай, аптымістычнай. Усёй сваёй «чалавечай» істотай гэты Бураціна заклікае беражліва аберагаць радасць дзяцінства, сцвярджае хараство адкрытага жыццю і выпрабаванням сэрца.**

Наогул, мушу сказаць, ведаючы Кацярыну па сумеснай працы ў тэатры, што ёй найбольш блізкія персанажы, здольныя адукацца на чалавечыя патрэбы, заставацца чалавечнымі ў самых жорсткіх абставінах. Яе прываблівае духоўны свет тых гераінь, для якіх дарагія сапраўдныя маральныя каштоўнасці. Тут яна ўпэўнена ідзе да поспеху, асабліва, калі ролі і па характару, і па ўзросту блізкія Кацярыне Доўнар. Вось хоць бы Вера Машко ў спектаклі «Дзяўчынка і красавік» па п'есе Т. Ян.

Дзесяцікласніца сур'ёзна захапляецца біялогіяй, якой і вырашае прысвяціць усё сваё жыццё. Яе апантанасць прадметам амаль фанатычная. Імкненне гераіні да самасцвярджэння актрыса не аддзяляе ад прагі чалавечай цеплыні, і Вера Машко набывае інтэлектуальную глыбіню, робіцца юнай асобай, дзяўчынкай з характарам. Няхай галоўная справа жыцця яшчэ наперадзе, важна тое, што гераіня гатова яе здзейсніць. Актрыса ўводзіць нас у складаны свет па ўсіх прыкметах амаль ідэальнай гераіні. Ловім сябе на думцы, што мы, гледачы, ужо засумавалі па такіх персанажах на сцэне, а ідэальная гераіня К. Доўнар у дадзеным выпадку таксама вельмі цікавы чалавек, які ведае, чаго ён хоча, да якой мэты імкнецца.

У персанажах гэтай актрысы адчуваюцца маральныя пазіцыі самой выканаўцы. Той, хто часта бачыць К. Доўнар на сцэне, можа сказаць, што яна бескампрамісны чалавек. І гэта будзе блізка да ісціны: артыстка ўмее ўзвысіць, умее і асудзіць сваю гераіню.

Кантрастныя па характару і па сцэнічнаму ўвасабленню яе вобразы. Мадлен — простая дзяўчына, сэрца якой так хоча кахаць («З любімымі не расставайцеся»), і Муза — «сучасная гуманістка», якая можа ў сваёй дысертацыі растлумачыць глыбінныя шоансы чалавечых узаемаадносін, а ў жыцці ў пагоні за славай трапіць у сабе ж самой дабрату («Чатыры кроплі»). «Святло» і «цені» ў партытуры ролі К. Доўнар размяркоўвае, зразумела, зусім свядома, рацыянальна, ды толькі гэтага «размеркавання» гледачы звычайна не заўважаюць. Яны ўспрымаюць яе гераінь (і герояў, калі мець на ўвазе таго ж Бураціна) як зусім пэўныя, цэласныя характары.

**Сустрэча з драматургіяй Карла Гоцы, поўнай фантазіі і дзівоснай паэзіі, стала пэўным этапам у творчасці актрысы. Роля Барбарыны ў «Зялёнай птушцы» вымагала рухавай пластыкі, імправізацыйнай лёгкасці, імклівага рытму ў фізічных і псіхалагічных паводзінах. Гледачы помняць, што К. Доўнар выконвала ролю з зайздросным акцёрскім захапленнем. Па-акцёрску ўпэўнена яна паказала два, умоўна кажучы, аблічча сваёй гераіні — нясмелай дзяўчыны з чыстым сэрцам, здольнай пайсці на любую ахвяру дзеля перамогі дабра, якая пасля ўсіх прыгод і памылак усвядоміла ў чым сапраўднае прызванне чалавека, і той Барбарыны, што пад уплывам свайго брата Рэнца захапляецца філасофіяй «разумнага эгаізму». Раптам паўстае перад намі эгаістка, якая нават для самой сябе становіцца цяжарам. Толькі тады, калі Рэнца, выконваючы яе жаданні, ператвараецца ў... статую, Барбарына становіцца сама сабой. Сцэнічнае дзеянне тут далёкае ад бытавой праўдзівасці, і актрыса арганічна паглыбляецца ў паэтыку ўмоўнага тэатра. Яна жыве на сцэне, і думка аб тым, што Барбарына — казачны персанаж, пакрысе саступае месца перакананасці ў тым, што гэта па-свойму гратэскавая і ўсё ж рэальная фігура. Фантастыка і жыццёвая важнасць — спалучэнне, якое дасягаецца па-мастакоўску сталым артыстам!**

Як бачым, амплітуда рэпертуару К. Доўнар шырокая (дарэчы, у казачным спектаклі «На ўсіх адна бяда» па п'есе П. Макаля яна сыграла нядаўна... Мартышку!). І гэтая амплітуда вымагае, каб актрыса была ў пастаянным пошуку, каб яна ўдасканальвала сваё майстэрства. Як кажуць, лепшыя ролі яшчэ наперадзе. Марыць яна іграць гераінь Дастаеўскага, Чэхава, чакае новых п'ес беларускіх драматургаў пра сённяшні дзень. І рыхтуецца да кожнага выхаду на сцэну, як да прэм'еры.

**Вячаслаў РАКІЦКІ,**
**загадчык педагагічнай частні Рэспубліканскага тэатра юнага гледача.**

# КРЫНІЦА НАТХНЕННЯ — СЛОВА ПЕСНЯРА

ЦЯЖКА быць першым, сказаць новае слова ў мастацтве. Імкненне да гэтага — бадай, самая характэрная рыса ў творчасці лаўрэата ўсесаюзных і міжнародных конкурсаў вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры». Кожная сустрэча з гэтым музычным калектывам радуе, прыносіць пачуццё новага, дае адчуванне іх творчага росту.

І вось зроблены новы паспяховы крок. Упершыню ў нашым эстрадным мастацтве створаны песенны спектакль на фальклорнай аснове, або, як яго назвалі самі «Песняры», народная прытча ў 7 карцінах «Песня пра долю».

Паэтычная аснова спектакля — ранняя вершы народнага песняра Янкі Купалы. Музыку да іх напісаў заслужаны артыст рэспублікі Уладзімір Мулявін. Лібрэта і пастаноўка спектакля—аднаго з заснавальнікаў ансамбля, рэжысёра, цяпер аспіранта Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва імя А. В. Луначарскага Валерыя Яшкіна.

**...На сцэне — прывычныя сілуэты электрамузычных інструментаў, мікрафоны, узмацняльнікі. За крыжападобнай сцэнічнай пляцоўкай — вялікі белы экран.**

**Спектакль пачынаецца колерадынамічнай кампазіцыяй, у якой выдатна знойдзены выяўленчы эквівалент музычнай думкі. Быццам працягваючы гэту песню святла, якое пераліваецца на экране, адлікаюцца з залы, пачынаюць весці сваю мелодыю дудачкі, жалейкі, ліры, скрыпкі.**

**У стылізаваным адзенні, у лапцях народныя музыканты ідуць па радах, запрашаючы ўсіх на прадстаўленне, дзе будзе паказана, як горка і цяжка жылося ў мінулым беларускаму селяніну. Ад аўтара спектакль вядзе Уладзімір Мулявін. Яго песні-маналогі, песні-заклікі з'яўляюцца кампазіцыйнай асновай усяго прадстаўлення.**

**З першых жа гукаў увертюры слухачы ясна адчуваюць глыбокую народнасць музыкі. У інтанацыях, рытме, акордавым складзе, у самой манеры выканання відаць яе блізкасць да фальклору.**

**Выдатныя вершы Янкі Купалы, напоўненыя блізкімі ім па духу мелодыямі, загучалі з новай сілай. Мы паглыбляемся ў знаёмы свет купалаўскай паэзіі. Перад намі праходзіць жыццё селяніна ад нараджэння да смерці. Гэта—драматычны расказ пра лёс народа, на долю якога выпалі неймаверныя пакуты і нягоды.**

**Казачныя персанажы беларускай народнай творчасці — Гора, Голад, Холад—ходзяць па пятах за селянінам ад вясны яго жыцця да сівой зімы, калі пад завываніе мяцеліцы заканчваюцца яго хаджэнні па муках, і ён гіне, распяты сіламі змроку і зла.**

**Ад сцэны да сцэны нарастае драматызм дзеі. Як рэха народнага гневу гучыць магутны купалаўскі голас: «Што ты спіш, беларускі мужык...» Ён заклікае да барацьбы, усяляе ў сэрцы людзей спадзяванне на вызваленне.**

**І яна прыйшла, доўгачаканая свабода, урачыста, аптымістычна гучыць фінал спектакля як гімн чалавеку працы, што знайшоў сваё шчасце, сваю светлую долю.**

Зварот «Песняроў» да паэзіі Я. Купалы, да такой складанай формы, падрыхтаваны ўсёй іх творчасцю. Кожны іх канцэрт — гэта маленькі эстрадны спектакль са сваёй стылістыкай, сваёй паэтыкай, у якой вялікае месца займае купалаўская лірыка. «Песняры» не проста ўзялі новую форму, якая развіваецца зараз на сусветнай эстрадзе. Яны пайшлі далей, адшурхоўваючыся ў сваім пошуку не ад модных плыней — «кантры», «фолк», «рок-опера», а ад самой народнай музыкі, ад нацыянальнага літаратурнага матэрыялу.

Спакус лёгкага поспеху было шмат — можна было ўвесці ўстаўныя харэаграфічныя нумары, запрасіць драматычных акцёраў, выкарыстаць фанаграмы, як гэта зрабіў М. Разоўскі, працуючы над зонг-операй «Арфей і Эўрыдзіка». «Песняры» пайшлі самым складаным і, на мой погляд, самым верным шляхам. Яны ўзялі ўсё на сябе. Можна паспрачацца наконт трактовак некаторых сцэн, не абышлося без асобных шурпатасцей ў выкананні. Але гэта— іх спектакль ад пачатку да канца, іх прачытанне вершаў Янкі Купалы, іх драматычныя ролі і народныя танцы. І глядач удзячны ім за гэтую творчую смеласць.

Імкненне ўсяго дабіцца самім — не самамэта; гэта надзейны шлях мастака да майстэрства, да будучых, больш складаных пастановак.

Пра герояў песеннага спектакля — беларускага Мужыка і яго Жонку—яшчэ рана гаварыць як пра канчаткова знойдзеныя сцэнічныя вобразы. З кожным прадстаўленнем Анатоль Кашапараў і Людміла Юсупава знаходзяць у характарах, у паводзінах герояў новыя адценні, нюансы, дэталі. Асабліва хвалююча гучаць у маладых выканаўцаў дуэт Маці і Пастушка, Жаніха і Нявесты ў сцэне вяселля.

Адна з удач спектакля і сцэна «Вясна», дзе лірычны тэнар Леаніда Барткевіча гучыць з асаблівай сілай і прыгажосцю. Малады спявак стварыў музычны вобраз веснавой зямлі, вобраз, які запамінаецца.

Юрый Дзянісаў, Валерый Яшкін, Чэслаў Паплаўскі, Уладзімір Нікалаеў, Уладзіслаў Місевіч звяртаюцца да цікавых, часам гратэскных музычных і пластычных фарбаў для сваіх персанажаў — Восені, Зімы, Лета, Шчасця, Гора, Голаду, Холаду.

Увесь спектакль разгортваецца на фоне музычных дэкарацый. Ідэя перакладу музыкі на мову колера, зразумела, не новая. Яшчэ ў 1910 годзе А. М. Скрабін увёў у сваю сімфанічную паэму «Праметэй» спецыяльную партыю колеру. Але толькі цяпер тэхнічныя сродкі даюць магчымасць выкарыстоўваць не толькі колер, але і яго прасторавую дынаміку. Аўтарам колерадынамічнай кампазіцыі Віктару Осіпаву і Рыгору Шнейдэрману ўдалося стварыць цікавае выяўленчае рашэнне ўсяго спектакля. У гэтым ім дапамаглі і маладыя мастакі Леанід і Валянціна Бартлавы. Танцы, якія выконваюць артысты ансамбля, пастаўлены балетмайстрам Валянцінай Дудчанка.

Празмернае захапленне шматпланавасцю і маляўнічасцю ў некаторых сцэнах стварае ўражанне таго, што пастаноўшчыкі пакуль яшчэ не знайшлі арганічнага адзінства паміж драматычным дзеяннем, музыкай і колерам. Гукарэжысёр занадта часта фарсіруе гучанне. Так што мастацкую гармонію відовішча трэба яшчэ шукаць і рэжысуры, і выканаўцам.

**— З вялікім хваляваннем мы выносілі на суд гледачоў нашу новую работу, — сказаў пасля прэм'еры кіраўнік ансамбля Уладзімір Мулявін. — Я заўсёды захапляўся купалаўскай паэзіяй, і, як вы заўважылі, у нашым рэпертуары шмат песень на яго вершы. Мы імкнёмся ў сваёй творчасці раўняцца на гэты ўзор беларускай паэзіі.**

**Ідэя спектакля ўзнікла не адразу, хоць мы даўно марылі стварыць буйнае музычнае палатно. Вось чаму, калі паўгода назад Валерый Яшкін паказаў лібрэта, усе мы з вялікім запалам прыняліся за работу. Коратка аб гісторыі стварэння «Песні пра долю». Валерый вучыцца ў аспірантуры ў Маскве, і ў самую адказную, экзаменацыйную пару ён «захварэў» паэзіяй Янкі Купалы, напісаў лібрэта і тэрмінова вылецеў ў Мінск. Неўзабаве мы паехалі на гастролі па краіне і штодзённа, пасля канцэртаў, працавалі над спектаклем. У рабоце нам вельмі дапамаглі нашы фальклорныя экспедыцыі па рэспубліцы. «Песнярам» вельмі важна было адчуць, убачыць тое рэальнае жыццё, якое дыктавала Купалу яго песні.**

**Сустрэчы з нашымі гледачамі, іх рэакцыя, іх апладысменты пераконваюць у тым, што наша праца, нашы пошукі былі не дарэмныя. Мы і далей будзем вучыцца ў вялікага мастацтва, у вечна жывой школы народнага фальклору...**

Новая работа ансамбля «Песняры» выклікала вялікую цікавасць ў гледачоў, у работнікаў мастацтваў, стала прадметам ажыўленых спрэчак і дыскусій. Новая з'ява ў эстраднай музыцы нікога не пакінула раўнадушным, і не заўсёды думкі ва ўсім супадаюць.

Вось некалькі кароткіх інтэрв'ю, якія мы ўзялі пасля прэм'еры. Сваімі ўражаннямі дзеліцца галоўны рэжысёр Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Валерый Раеўскі.

**— Не буду судзіць «Песняроў» па законах драматычнага мастацтва. Тое, што яны паказалі, гэта, безумоўна, новы напрамак у эстрадзе, новае слова ў спецыфічнай яе мове. Цікава было паглядзець работу маладога рэжысёра Валерыя Яшкіна. Да таго ж, я сам захоплены паэзіяй Купалы: паставіў на тэлебачанні спектакль «Па сонца, па шчасце» па ранніх вершах паэта. Хачу сказаць, што вакал і наогул выкананне песень пакідаюць прыемнае ўражанне. Але ў выяўленчых сродках дзе-нідзе ёсць перабор. Спектакль яшчэ не выраўнуўся, «не абкатаўся». Некаторыя недарэчнасці могуць быць выпраўлены ў працэсе работы. Увогуле прэм'ера ўдалася: «Песняры» зрабілі ёю добрую заяўку на будучыню...**

Нашу гутарку працягвае заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, кампазітар Ігар Лучанок.

**— «Песня пра долю», безумоўна, стане яркай старонкай беларускай эстрады. Які жанр твора? У ім ёсць рысы оперы, кантаты, сімфоніі, але ў той жа час гэта — песеннае прадстаўленне. Не менш, чым жанр спектакля, самабытная яго музычная мова. Тут асабліва ярка раскрыўся меладызм творчасці У. Мулявіна, які яшчэ раней праявіўся ў яго вядомых песнях «Александрына», «Завушніцы» і іншых. Сучаснае эстраднае мастацтва падтрымлівае больш глыбокі кантакт з народнай творчасцю. Гэтая цікавасць выканаўцаў да фальклорных крыніц дае самыя разнастайныя па зместу і форме творы для сцэны. Сведчаннем гэтаму — «Песня пра долю». Я рады, што «Песняры» звярнуліся да складанага музычна-драматычнага жанру і паказалі, што могуць паспяхова выступаць у гэтым напрамку...**

Свае нататкі мне хацелася б закончыць словамі народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа:

— Я люблю і паважаю мастацтва «Песняроў». Мне падабаецца іх смеласць, іх самастойнасць, іх пастаянны пошук новага. Менавіта ў гэтым я бачу сэнс мастацтва. Паўторы нікому не патрэбны. «Песняры» ідуць сваёй дарогай, дарогай пошуку. Пажадаем жа ім на гэтым шляху самых вялікіх поспехаў!

**Святлана СЫСОЕВА.**

# КАНЦЭРТ МАЛАДОЙ ПІЯНІСТКІ

*У той вечар аматары музыкі, студэнты, вучні і выкладчыкі мінскіх музычных школ і кансерваторыі імя А. В. Луначарскага сабраліся на канцэрт маладой піяністкі Ірыны Шуміліной. Яна яшчэ студэнтка, але ўжо зарэкамендавала сябе як удумлівы і самабытны музыкант. Гэта пацвердзіў і канцэрт дэбютанткі. Слухачам прыемна было, што Ірына эмацыянальна, пераканаўча і дакладна перадавала глыбокі сэнс твораў Моцарта і Чайкоўскага, самастойна адкрывала свет пачуццяў, перададзены Абеліёвічам.*

*Канцэрт юнага музыканта ў зале філармоніі прайшоў паспяхова. Гэта прыемная з'ява ў нашым музычным жыцці.*

*М. ЗАРЭЦКАЯ.*

*НА ЗДЫМКУ: Ірына ШУМІЛІНА са сваім настаўнікам в. а. прафесара Р. ШАРШЭЎСКІМ.*

Фота Г. ГАРБАЦЭВІЧА.

Валянціна Зайцава — адна з актыўных удзельніц мастацкай самадзейнасці, якая арганізавана пры Крычаўскім раённым Доме культуры.

Фота В. БЫСАВА.

*Рэпліка*

## А прэм'ера так і не адбылася

**На пачатку мінулага, 1975 года да мяне звярнуліся супрацоўнікі творчага аб'яднання «Летапіс» студыі «Беларусьфільм». Там рыхтаваўся дакументальны фільм аб дзеячах мастацтва, якія ўдзельнічалі ў партызанскім руху. Стужка мела прыгожую (можа, нават празмерна прыгожую!) назву— «Муза ў партызанскім стане». Мяне як былога партызана папрасілі перад кінакамерай расказаць пра маю кніжку «Слуцкі пояс», што была набрана і выдадзена друкарамі-падпольшчыкамі ва ўмовах варожай акупацыі. Гэта павінна было на экране ілюстравацца пэўнымі эпізодамі баявой дзейнасці народных мсціўцаў. Вядома, я даў згоду.**

**Да мяне прывезлі адпаведную здымачную і асвятляльную апаратуру, і два дні ўзапар рэжысёр С. Лук'янчыкаў і аператар В. Арлоў працавалі над даволі ладным кавалкам будучай стужкі. Рабілі «дублі», прымушалі мяне зноў і зноў чытаць вершы, мянялі «мізансцэны» і г. д. Потым падзякавалі і запрасілі на прэм'еру фільма, якая меркавалася акурат ў дні святкавання 30-годдзя Перамогі. Я сачыў за рэпертуарам кінатэатра «Навіны дня». Але такога фільма ў ім не паказвалі. Ну, думалася мне, пакуль зробяць тыраж...**

**Нядаўна пацікавіўся ў рэдактараў аб'яднання «Летапіс»: ці не праваронілі я прэм'еру? Не, яе на адкрытым экране і не было. Чаму? Можа, па нейкіх прычынах фільм не прынялі на студыі або ў Дзяржкіно БССР? Не, адказваюць, прынялі. Фільм лічыцца зробленым. Дзе ж ён? На «паліцы», кажуць (ёсць такі тэрмін у кінематаграфістаў: на «паліцы» — гэта азначае: у сховішчы нейкім). Чаму ён там апынуўся, калі яго ўхвалілі і студыя, і Дзяржкіно БССР? Высветлілася наступнае: у стужцы трэба было замяніць некалькі забракаваных кадраў новымі. Яго так і прынялі — з умовай, што аўтары зробяць тое, аб чым і спрачацца няма чаго.**

**Не робяць!**

**І ляжыць фільм на «паліцы», і марна пайшла праца рэжысёра і аператара, мантажніц і рэдактараў. І ў мяне два дні выкрэслены, бо ніякай карысці нікому я не прынёс, гаварыў перад кінакамерай штосьці, што паслухалі адны толькі студыйныя супрацоўнікі. А там жа выступалі яшчэ і музыканты, і мастакі, і артысты... Цікава было б даведацца ў Дзяржкіно БССР: ці лічыцца вытворчы план выкананым, калі фільм ёсць, але яго не паказваюць на экранах? Няўжо так можна?**

**Анатоль АСТРЭЙКА.**

# ТРЫВАЛЫ СПЛАЎ

У. Л. ВЕРХАВЕЦ,

*сакратар Брэсцкага абкома КП Беларусі*

ПРАЦОЎНЫЯ Брэстчыны поўныя рашучасці па-ўдарнаму вырашаць вялікія і складаныя задачы, якія паставіў гістарычны XXV з'езд КПСС, значна павялічыць свае вытворчыя дасягненні ў дзесятай пяцігодцы.

Вынікі мінулага пяцігоддзя выклікаюць гонар у рабочых, калгаснікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі вобласці. Паспяхова выкананы планы па ўсіх асноўных паказчыках. Аб'ём прамысловай вытворчасці за 1971—1975 гады павялічыўся на 61,5 працэнта замест 61 па плану. Прадукцыйнасць працы ўзрасла на 39,3 працэнта. Звыш задання прадпрыемствы вобласці рэалізавалі прадукцыі на 176 мільёнаў рублёў. Прыкметна пашырыўся асартымент, палепшылася якасць прадукцыі. Хацелася б адзначыць, што хуткімі тэмпамі развіваліся на Брэстчыне тыя галіны вытворчасці, якія забяспечваюць тэхнічны прагрэс: хімічная, электратэхнічная, прыборабудаванне.

Вялікія сродкі дзяржавы на меліярацыю дазволілі асушыць і ўвесці ў сельскагаспадарчы ўжытак звыш 220 тысяч гектараў забалочаных зямель. Мяняецца панарама палескіх вёсак. Там, дзе раней былі непраходныя балоты, цяпер вырастаюць добраўпарадкаваныя пасёлкі, пралягаюць аўтастрады, на асушаных землях ствараюцца новыя саўгасы.

У вобласці здзейснена шырокая праграма культурна-бытавога будаўніцтва. Гасцінна расчынілі дзверы 112 школ, 6 прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў, 124 дзіцячыя сады, 50 дамоў культуры і клубаў. Пабудавана бальніц на 1.750 ложкаў, дзесяткі магазінаў, сталовак, прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання. Завершаны пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Усяго за мінулую пяцігодку сярэднюю школу закончыла больш як 96 тысяч чалавек, падрыхтавана і накіравана ў народную гаспадарку звыш 26 тысяч спецыялістаў вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі.

У адзіным страі з працаўнікамі вытворчасці і сельскай гаспадаркі ідзе творчая інтэлігенцыя вобласці. Усё больш дзейсным робіцца яе ўклад у вялікую справу камуністычнага выхавання новага чалавека. Як адзначалася ў пастанове ЦК КПСС «Аб рабоце па падбору і выхаванню ідэалагічных кадраў у партыйнай арганізацыі Беларусі», клапатлівыя адносіны і пастаянная ўвага з боку партыйных арганізацый да мастацкай інтэлігенцыі садзейнічалі згуртаванню творчых саюзаў, павышэнню іх ролі ў фарміраванні духоўнага свету чалавека. Гэта ў пэўнай ступені можна аднесці і да дзейнасці абласных творчых саюзаў і аб'яднанняў.

Хацелася б, у першую чаргу, сказаць шмат цёплых слоў у адрас літаратараў Брэстчыны. У жанры дакументальнай публіцыстыкі плённа працуе кандыдат філалагічных навук, дацэнт Брэсцкага педінстытута, пісьменнік Уладзімір Андрэевіч Калеснік. Яго пяру належыць шэраг сур'ёзных літаратуразнаўчых даследаванняў. Прыемна адзначыць, што ён — адзін з аўтараў вядомай кнігі «Я з вогненнай вёскі...», якая заваявала прызнанне шырокай літаратурнай грамадскасці ў краіне і за яе межамі. Уладзімір Андрэевіч вось ужо два дзесяткі гадоў кіруе абласным літаратурным аб'яднаннем пры газеце «Заря». Шмат сіл, душэўнай цеплыні і энергіі ён аддае падрыхтоўцы і выхаванню творчай моладзі, раскрыццю яе талентаў. Прыйшліся да спадобы чытачам вершы Міхася Рудкоўскага, Ніны Мацяш, Івана Арабейкі і іншых паэтаў. Усё большае прызнанне сваёй маральнай тэматыкай набываюць апавяданні Святланы Курылёвай — педагога з Камянца. Пра людзей глыбінкі Палесся цікава і займальна ў сваіх нарысах расказвае рэдактар ганцавіцкай раённай газеты «Савецкае Палессе» Васіль Фёдаравіч Праскураў.

У гэтым годзе адзначаць трыццацігоддзе абласной арганізацыі нашы мастакі. Іх творчай справаздачай з'явілася абласная выстаўка, прысвечаная XXV з'езду КПСС. У экспазіцыі выстаўкі зліліся ў адно гераічнае мінулае з працоўнымі справамі сённяшніх дзён. Пра подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны расказваюць работы Івана Рудчыка «Партызанскія зямлянкі», Мікалая Дударава «Партрэт удзельніка штурму Берліна Я. Гэлабародзькі», скульптура Генадзя Пясецкага «Партрэт партызана Чарнака», Мікалая Чурабы «Цішыня». Тэма многіх карцін — пафас мірнай працы, новы воблік Палескага краю. Гэтыя тэмы глыбока адлюстраваны ў творах Марата Клімава, Уладзіміра Пашкова, Пятра Данелія, Іосіфа Крупскага, Генадзя Пясецкага і іншых. Трэба адзначыць, што работы Пятра Данелія, Мікалая Чурабы, Эдуарда Куфко, Васіля Сабалеўскага, Мікалая Дударава экспанаваліся на рэспубліканскай выстаўцы «Слава працы» ў Мінску.

У пастаянным творчым пошуку знаходзіцца наш абласны драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі. Прытрымліваючыся лепшых традыцый савецкага тэатра — партыйнасці і народнасці, калектыў яго стаў актыўным праваднікам і прапагандыстам марксісцка-ленінскіх ідэй, нясе ў масы высокую эстэтычную культуру. Толькі за апошнія пяць гадоў тэатр паказаў 36 спектакляў, якія прагледзела звыш мільёна чалавек.

Праз усю творчасць тэатра чырвонай ніткай праходзіць героіка-патрыятычная тэма. Спектакль, які апявае гераічную эпапею на берагах Заходняга Буга — «Брэсцкая крэпасць» Канстанціна Губарэвіча, — з вялікім поспехам прайшоў каля 800 разоў. А спектакль па трагедыі В. Бергольц «Вернасць» атрымаў дыплом Усесаюзнага фестывалю, прысвечанага 30-годдзю Перамогі. За героіка-патрыятычную тэму дыпломам заахвочаны і ўвесь калектыў тэатра.

Глыбокай сацыяльнай і грамадскай думкай, светлымі і яснымі камуністычнымі ідэямі, яскравай палітрай сцэнічных фарбаў адзначаюцца спектаклі па п'есах «Беражыце белую птушку» М. Мірашнічэнкі, «Таблетку пад язык» А. Макаёнка, «Даўгі нашы» Э. Валадарскага, «Характары» В. Шукшына, «Апошняя інстанцыя» М. Матукоўскага. У гэтых спектаклях вырашаюцца вострыя праблемы сучаснасці, аб'ёмна прадстаўлены характар савецкага чалавека, героіка яго працоўных будняў, ярка адлюстраваны дух барацьбы за сцвярджэнне высокіх маральных ідэалаў.

У дні з'езда адбылася прэм'ера спектакля па п'есе «Нашчадак» М. Матукоўскага, прысвечанай актуальным праблемам сучаснай вёскі.

У калектыве тэатра выраслі і працуюць два народныя і сем заслужаных артыстаў рэспублікі. Асаблівую папулярнасць сярод гледачоў заваявалі старэйшыя акцёры Ганна Васільеўна Качаткова, Анатоль Канстанцінавіч Логінаў, Юрый Іванавіч Уласаў, Сяргей Пятровіч Юркевіч, галоўны рэжысёр Георгій Андрэевіч Волкаў, рэжысёр Сяргей Іванавіч Еўдашэнка і многія іншыя.

Тэатр праводзіць вялікую работу па эстэтычнаму выхаванню працоўных, прапагандзе тэатральнага мастацтва. Сістэматычна праводзяцца «Дні тэатра» ў Кобрынскім, Жабінкаўскім, Пружанскім, Камянецкім, Бярозаўскім і іншых раёнах. Штогодна даюцца шэфскія спектаклі для працаўнікоў вёскі.

Плённа папрацавалі ў мінулым пяцігоддзі і нашы дойліды. Пабудавана шмат новых, прыгожых будынкаў з цікавымі архітэктурнымі знаходкамі. Гэта — гасцініца «Інтурыст», кінатэатр «Беларусь» у Брэсце, Палац культуры і дзіцячы сад у Пінску і многія іншыя.

Вялікую работу ў эстэтычным выхаванні насельніцтва праводзяць нашы музыканты. Творча, па-баявому працуе абласное аддзяленне Саюза журналістаў БССР.

Пашырылася сетка культурна - асветных устаноў. Амаль на адну трэць павялічыўся кніжны фонд бібліятэк.

Далейшае развіццё атрымала народная творчасць. Адметна тое, што цяпер у харавых, музычных, харэаграфічных, драматычных гуртках займаецца больш за 60 тысяч рабочых, калгаснікаў, служачых. Больш разнастайным стаў іх рэпертуар. Высокага майстэрства дасягнулі народныя харавыя капэлы настаўнікаў і чыгуначнікаў Брэста, народны хор Аблсаўпрофа, Брэсцкі гарадскі народны ансамбль танца «Радасць», народныя танцавальныя калектывы «Палессе» з Пінска, «Лялькі» з Баранавічаў і многія іншыя вядучыя калектывы нашай вобласці.

Наша сацыялістычная сістэма, умовы матэрыяльнага жыцця, усе сродкі ідэйнага і маральнага выхавання дапамагаюць людзям гарманічна развіваць свае лепшыя якасці. Вядучая роля ў гэтым належыць творчай інтэлігенцыі. Мы ганарымся высокай ацэнкай іх працы, дадзенай на XXV з'ездзе КПСС, і бачым свой абавязак перад імі ў тым, каб дапамагчы творчай інтэлігенцыі ў вырашэнні задач, пастаўленых у дакладзе таварыша Л. І. Брэжнева: «стварыць новыя творы, вартыя нашай гісторыі, нашага сучаснага і будучага, нашай партыі і народа, нашай вялікай Радзімы».

Адзін з важнейшых клопатаў — умацаванне радоў творчай інтэлігенцыі, творчых саюзаў, папаўненне іх моладдзю, павышэнне адказнасці пярвічных партыйных арганізацый за ідэйна-мастацкі ўзровень твораў. Абласному камітэту партыі разам з праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР, відаць, неабходна больш канкрэтна заняцца вырашэннем пытання стварэння ў нашай вобласці аддзялення Саюза пісьменнікаў. Гэта ў многім дапамагло б росту творчых сіл Брэстчыны.

Наша грамадства ўвайшло ў перыяд сваёй духоўнай і палітычнай сталасці. Калі ўчытваешся сёння ў дакументы XXV з'езда КПСС, ясна ўяўляеш сабе тыя гіганцкія задачы, якія стаяць перад краінай ва ўсіх галінах — у эканоміцы і будаўніцтве, культуры і выхаванні новага чалавека. Абком партыі, партыйныя камітэты, пярвічныя партыйныя арганізацыі, абапіраючыся на вопыт, будуць і надалей рабіць усё для таго, каб прапаганда духоўных каштоўнасцей савецкага народа вялася пастаянна, служыла дзейсным сродкам выхавання ўсебакова развітай асобы.

# КНІГУ—У КОЖНЫ СЕЛЬСКІ ДОМ

У абстаноўцы высокай працоўнай актыўнасці ўступілі ў першы год дзесятай пяцігодкі работнікі Гомельскага аблкаапкнігагандлю, які ўзначальвае ветэран спажывецкай кааперацыі камуніст Міхаіл Іванавіч Цішчанка.

Радуюць вынікі мінулай пяцігодкі. На працягу гэтага перыяду Аблкнігагандаль неаднаразова выходзіў пераможцам у рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве. План рэалізацыі друкаванай прадукцыі за пяцігоддзе выкананы на 103,8 працэнта, дадаткова да плана сельскаму насельніцтву прададзена літаратуры на 291 тысячу рублёў. Гандлям кнігай займаюцца ў вобласці 53 кніжныя спецыялізаваныя магазіны, 14 кніжных аддзелаў пры універмагах і культмагах, можна набыць патрэбную літаратуру і ў 293 сельскіх магазінах, у якіх абсталяваны кніжныя паліцы. У аддаленыя населеныя пункты кнігі развозяць 34 аўталаўкі.

Большасць кнігагандлёвых работнікаў пастаянна выконваюць даводзімыя ім планы. А ў кніжных магазінах Петрынава, Кармы, Рагачова, Акцябрскага, Стрэшына і Церахоўкі вывешаны плакаты аб тым, што гэтым гандлёвым прадпрыемствам прысвоена званне «Магазін высокай культуры абслугоўвання пакупніноў».

Развіваюцца і вельмі зручныя для насельніцтва пазамагазінныя формы гандлю. Толькі ў мінулым годзе было праведзена 623 кніжныя базары, 187 тэматычных выставак. У распаўсюджванні літаратуры прынялі ўдзел 453 кніганошы, 2.870 грамадскіх распаўсюджвальнікаў, 168 школьных кааператываў. Кнігі можна набыць у 75 сельскіх бібліятэках.

Актыўна праходзілі арганізаваныя кааператарамі сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі: І. Шамякіным, А. Гаўрылкіным, Б. Сачанкам, А. Макаёнкам, М. Даніленкам, Л. Прокшам, М. Федзюковічам і іншымі, у час якіх ішла сур'ёзная размова пра сучасную літаратуру, а кнігалюбы набывалі творы з аўтографамі пісьменнікаў.

Кніжнымі магазінамі пастаянна камплектуюцца тэматычныя бібліятэчкі, якія рассылаюцца для патрэб спецыялістаў розных профіляў у сельскія Саветы, калгасы і саўгасы.

Шмат у Гомельскай вобласці сапраўдных энтузіястаў кніжнай справы, якія любяць кнігу і ўмела яе прапагандуюць. Сярод іх старшыя таваразнаўцы па кнізе Рагачоўскага і Веткаўскага райспажыўсаюзаў Ала Сасонка і Тамара Мялейнікава, загадчыкі кнігарань у Жыткавічах — Святлана Шадрына, у Карме — Надзея Чваркова, у Васілевічах — Ганна Мялейнікава, кніганошы: загадчыца бібліятэкі Буда-Кашалёўскага раёна Антаніна Мальцава, сястра-гаспадыня Рагачоўскай бальніцы Аляксандра Эндалс, грамадскія распаўсюджвальнікі — Святлана Казмерчук — піянерважатая Баршчэўскай сярэдняй школы Хойніцкага раёна, Іван Аніневіч — загадчык кабінета палітасветы Веткаўскага райкома партыі і многія іншыя.

У гэтыя дні, калі савецкі народ прыступіў да ажыццяўлення рашэнняў XXV з'езда КПСС, ва ўсіх кнігарнях і спецыялізаваных аддзелах універмагаў спажывецкай кааперацыі вобласці ўвагу пакупнікоў прыцягваюць яркі афармленыя стэнды, прысвечаныя планам партыі. На асобных паліцах і стэлажах размешчаны кнігі, брашуры, плакаты, якія расказваюць аб працоўных поспехах савецкіх людзей за гады дзевятай пяцігодкі, матэрыялы XXV з'езда КПСС, мастацкі творы, якія апавядаюць аб гераізме і патрыятызме нашага народа. Гэта літаратура карыстаецца ў пакупніноў асабліва вялікім попытам.

Г. КАПЦЕЛАЎ.

# ПРЫЗВАННЕ

Дзень яго пачынаецца з клопатаў. Зранку неабходна дамовіцца ў калгасе наконт транспарту, каб адвезці апаратуру ў суседнюю вёску. Пасля трэба і павесіць афішу, абысці брыгады, пагутарыць з людзьмі. Што і гаварыць, неспакойная работа ў сельскага кінамеханіка асабліва калі ён, як Іван Іосіфавіч Кавалеўскі, працуе на перасоўцы.

Жыве Кавалеўскі на Стаўбцоўшчыне, у вёсцы Вялікія Навікі. Яго маршрут, працягласцю 9 кіламетраў, праходзіць праз чатыры сялы. Даводзіцца выязджаць і на сенакос. Там, каля рэчкі, выбярэ два дрэвы, між якіх расцягне экран, схавае электрарухавік, каб ягоны шум не заглушаў галасоў кінагерояў.

У снежні 1958 года Кавалеўскі дэмабілізаваўся з арміі, а праз месяц ужо працаваў на перасоўцы. Лёгка даліся яму мудрасці кінамеханікі: дапамагалі веды, атрыманыя за час службы ў арміі. І вось ужо 10 гадоў як Івану Іосіфавічу прысвоены вышэйшы кваліфікацыйны разрад, які дазваляе працаваць у кінатэатры любога тыпу. Але ён, выдатнік кінафікацыі, уладар грамат і дыпломаў, ударнік камуністычнай працы, па-ранейшаму на самым клопатным участку.

З дзесяці чалавек брыгады, якую ён узначальвае, дзевяць працуюць на стацыянарных устаноўках. Кожны мае графік паказу фільмаў, план валавога збору. Па выніках пяці месяцаў бягучага года брыгада на першым месцы ў раёне.

Ведае Іван Іосіфавіч — вельмі важна зацікавіць людзей новай кінастужкай. Чытае ён рэгулярна часопісы «Кінамеханік», «На экранах Беларусі», дзе асаблівую ўвагу звяртае на анатацыі на фільмы, некаторыя нават занатоўвае сабе ў блакнот. Раскажа ён калгаснікам пра акцёраў, змест фільма, ды так раскажа, што абавязкова заінтрыгуе, каб захацелася чалавеку яго абавязкова сёння паглядзець.

Цягнуцца да Кавалеўскага людзі. Асабліва дзеці. Вось ідзе ён па вясковай вуліцы і не паспявае адказваць на пытанні:

— Іван Іосіфавіч, а цікавае сёння будзе кіно?

— Іван Іосіфавіч, а калі прывязеце новыя мульцікі «Ну, пачакай!»?

Кінамеханік лагодна ўсміхаецца і, абкружаны дзятвой, пачынае лагодна расказваць пра дзіцячыя фільмы, абяцае абавязкова прывезці нешта новенькае, яшчэ тут не паказанае.

Кожны з шасці працоўных дзён гэтага чалавека адзначаны кіламетрамі пракручанай кінастужкі. Калі расказвае пра сябе, Іван Іосіфавіч пазбягае слова «прызванне». Але не цяжка здагадацца, што не толькі шматгадовая прывычка вымушае сельскага кінамеханіка добрасумленна выконваць свае абавязкі.

Для вяскоўцаў сустрэча з Кавалеўскім заўсёды радасная. Жаданы госць ён у школьнікаў. Нарады хлебаробаў не абыходзяцца без дэманстрацыі фільмаў на сельскагаспадарчую тэматыку. І калі сабралася багата народу і фільм спадабаўся, дык самому прыемна.

**С. БЕРАСЦЕНЬ.**

## ПАЭТЫЧНАЕ СЛОВА МАЛАДЫХ

*Наваполацк. Горад на левым беразе Заходняй Дзвіны. Сусед і малодшы брат старажытнага Полацка. Яму няма яшчэ і дваццаці, а ў яго ўжо ёсць свая гісторыя, свой лёс. Працоўныя справы — будаўнікоў, нафтавікоў, хімікаў — услаўляюцца ў кнігах, фільмах, вершах.*

*Мясцовыя паэты горача адгукаюцца на ўсе падзеі, на ўсе пераўтварэнні, што адбываюцца на старажытнай зямлі Полаччыны.*

*Прапануем увазе чытачоў некалькі твораў маладых аўтараў.*

### Валерый СТАРЫНСКІ

#### ПАМЯЦЬ

Па Верхнядзвіншчыне ідуць жыты
Прагрэтымі палямі, як салдаты.
Праз рэчкі, праз густых лясоў
гурты,
І ахінаюць строем вёсак хаты.
Яны на котлішчах абкураных
стаяць,
І цяжка каласам у гімнасцёрках.
Што ж не выходзіш, маці,
іх страчаць,
Сынам махаеш хмаркаю
з пагорка?

А дзе ляжаць пад травамі браты,
І пісьмы дзе, што нам яны пісалі?
Стаяць жыты і кратаюць платы
Салдацкімі зрудзелымі вусамі.
Маўчаць жыты, а вецер-генерал
Рады зярнят загадамі гартае.
Ты, памяць, расхіні мой родны
край,
Пералічы ўсіх, хто стаў жытамі.
Тут васілёк, шукае Васіля.
Ён быў кірпаты, нос у рабацінні.
Яго закрыла матухна-зямля,
А ён выходзіць збожжавым
націннем.
Рамана тут рамоначка знайшла.
За плечы абдымае і казыча:
— Мой любы, я кахання і цяпла
Табе прынесла, сонейка не зліча.
Далей шыпоўнік колкі, як шынель.
Накрылі ім байца навекі спаці.
Яго галубіць ціха тонкі хмель,
Як рукі сіратлівага дзіцяці.
Іван-ды-мар'я — кветкі на мяжы.
Ён кулямётчык быў, яна —
сястрычка.
Гурган іх бомбай разам
палажыў —
На месцы тым вадой звініць
крынічка.
Мы прад жнівом хвіліну
памаўчым,
Камбайны глушым, ходзім
збажыною.
Аддай нам, поле, памяці ключы,
Хай пахне хлеб жыццём,
а не вайною!

#### КРЫНІЦА

Як мне тут не спыніцца,
Прыпыніць хаду,
Дзе струменіць крыніца
З цішынёй у ладу.
Згадаю вуснаў горыч,
Удыхну пах травы,
І плыве з хмаркай побач
Чуб маёй галавы.
Як тут мне не спыніцца,
Дзе дзяцінства цвіло,
Да зямлі не схіліцца,
Паглядзець на сяло.
Вось і стома прапала
Ад крынічнай вады.
А зязюля гукала:
«Ты яшчэ малады!».

●

На залатым чоўне,
Па зорных хвалях нябёс
Плыве маладая поўня
Без кропак і без палос.
Яна, нібы маладуха,
Свой танец першы вядзе:
То пойдзе воблачным кругам,
То ў хмарных бярозах ідзе.
За следам нябеснага чоўна
Успеніцца млечны шлях,
І згубіць цудоўна поўня
Пацеркі рос на палях.

### Уладзімір АРЛОЎ

●

Засумуем з сябрам па пакосах,
Па старой буслянцы на страсе,
Па шумлівых ад гракоў бярозах,
Па сцюдзёнай ранішняй расе.
І прыедзем, ледзьве сонца
ўстане,
У фортку загрукочам, а ў адказ
Крыкне цётка: «Зараз выганяю!»
З пастухамі блытаючы нас.
Запытаю ціха: «Нечакана?»
«Дзетачка, — адкажа цётка,—не,
Кот учора мыўся мо ад рання
І тырчэў да цёмнага ў акне».
...Мянтузоў цягаем з плыткай
рэчкі,
Робім гаць, як дзесяць год назад,
Гутарым з суседам, дзедам
вечным,
Хоць з дзяцінства смаліць
самасад.
А ўвечары, стаміўшыся шчасліва,
Косамі набіўшы мазалі,
Слухаем мы конікаў —
вось дзіва! —
Песню засынаючай зямлі.

●

Пакуль жыву — люблю Айчыну,
Яе лясы і мурагі,
І смех сланечнікаў ля тыну,
І мовы водар дарагі.
Нясу я ў сэрцы казку маці,
З якой калыску калыхала,
І тонкі пах аеру ў хаце,
І нашы песні на Купалле.

# ДЗВЕ СПРАВЫ СУДДЗІ ЗЯЛЕНСКАГА

Справа другая

## «МАРШРУТЫ» СПЕКУЛЯНТА

НА ПАПЯРЭДНІМ следстве ён адмаўляў усё, тэатральна біў сябе ў грудзі кулаком і заклікаў да справядлівасці. Потым наогул адмовіўся даваць паказанні, падпісваць пратаколы і напісаў заяву начальніку следчага аддзела: «Следства вядзецца прадузята, маёй віны няма. З павагай Стаднік». У яго павазе ніхто не меў патрэбы, але ён выказваў яе і ў наступных скаргах у вышэйшыя інстанцыі. Пастанову аб прыцягненні да крымінальнай адказнасці ў якасці абвінавачваемага (шэсць няпоўных старонак тэксту) ён чытаў дзве з паловай гадзіны! Рабіў выпіскі, шапацеў старонкамі крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага кодэксаў. Ён абвінавачваўся ў злачынствах, прадугледжаных чатырма артыкуламі крымінальнага кодэксу, але ні ў чым вінаватым сябе не прызнаваў. Такім і прадстаў перад судом.

Зяленскі гартаў два пульхныя цяжкія тамы крымінальнай справы, якія ляжалі перад ім, вывучаных, перш чым ён прыняў іх да «вытворчасці», ад радка да радка. Ужо тады суддзя думаў аб тым, што многія сведкі, якія праходзяць па справе, заслугоўваюць таго, каб заняць месца побач з падсудным. Заслугоўваюць — імем нашай маралі. І суд сумлення ішоў над імі: не ўсе з іх асмельваліся зірнуць у вочы людзям. Не, яны не рабілі таго, што рабіў Стаднік—інакш яны сядзелі б з ім побач, але з іх маўклівай згоды ён рабіў тое, што рабіў. Іх баязлівасць, іх абыякавасць, іх маральная непераборлівасць спрыялі жорсткасці, нахабнасці таго, каго яны нядаўна бесклапотна звалі Славікам і з кім ішлі, куды ён пакліча. Між іншым, суддзя абавязаны кіравацца літарай закона, а не асабістымі пачуццямі, і Мікалай Давыдавіч зноў схіляўся над крымінальнай справай.

У свае трыццаць тры гады Стаднік паспеў атрымаць дванаццаць гадоў пазбаўлення волі. Цяжкі і ганебны цяжар трох судзімасцей ужо вісеў над ім да таго, як ён прадстаў перад Зяленскім.

...10 красавіка 1959 года народны суд Ленінскага раёна Мінска слухаў справу пра групавы, значыцца—заведама арганізаваны крадзеж. Стаднік і два яго прыяцелі зламалі замок і вынеслі са склада ДСТ «Спартак» два паляўнічыя ружжы, спартыўны пісталет, тры секундамеры і судзейскі касцюм. Стадніку было тады шаснаццаць з паловай гадоў.

Не будзем прадузятымі да падсуднага. Суд—гэта вышэйшая справядлівасць, увасабленне законнасці, абарона маральных і матэрыяльных устояў грамадства. І суддзя — сцвярджальнік справядлівасці. Цяпер ён спрабуе разабрацца ў прыродзе першага злачынства Стадніка.

Нарадзіўся пад Сталінградам у неверагодна цяжкім для Радзімы сорак другім годзе. Бацька ваяваў. Пасля вайны ў сям'ю не вярнуўся. Не вярнуўся таму, што пайшоў да другой жанчыны, і ні разу за тры дзесяткі гадоў не ўспомніў пра сына. Перад апошнім арыштам Стаднік сам адшукаў яго ў Бярдзянску. Бацька, вядома ж, не пазнаў яго, а калі той назваў сябе: «Сын жа я твой, сын!»—Бацька недарэчна ўзмахнуў рукамі і пацікавіўся: «Гэта ж які — сталінградскі?» Але вернемся ў дзяцінства. Маці, пакінуўшы дзіця ў бабулі, паехала ў Маскву вучыцца. Потым, калі вывучылася на канструктара і ў другі раз выйшла замуж, прывезла сына да сябе. Айчым заканчваў кансерваторыю. Любоў да музыкі сумяшчалася ў яго з чэрствым сэрцам: яго не ўзрушыла дзіцячая абяздоленасць. Вось што ён паказаў у часе следства па справе: «Уладзіслаў ставіўся да мяне, як да чужога. У сувязі з гэтым і я ў яго жыццё не ўмешваўся, не цікавіўся, чым ён займаўся, як ён жыў». Халодныя, бяздушныя словы кідаў суду бацька—няхай не родны, але ж бацька. Школу Славік кінуў — нікога гэта не хвалявала, пайшоў вучнем сталяра. Аднак майстар, што вучыў Стадніка, не захацеў узяць яго ў сваю брыгаду, — адштурхоўваў неўтаймаваны, наравісты характар хлопца. І юнак яшчэ больш заўпарціўся, затаіў у душы злосць.

За крадзяжы суд пазбавіў яго волі на тры гады. У калоніі ён ідзе на новае злачынства — да трох гадоў пазбаўлення волі дадаецца яшчэ пяць. А потым тэрмін павялічваецца яшчэ на год.

На волю ён выходзіць дарослым, зусім самастойным чалавекам. Жэніцца. Былая жонка і цяпер нядрэннай пра яго думкі.

Больш ясна і катэгарычна выказваюцца іншыя сведкі па справе—незалежныя ад Стадніка людзі, не звязаныя з ім ні сваяцкімі, ні іншымі пачуццямі.

Галіна Юдкіна, тады яшчэ прадаўшчыца магазіна «Матацыклы»: «Энергічны, але злосны, не задаволены жыццём чалавек. Імкнецца падначаліць сабе людзей, старыя сябры цураюцца яго».

А. П. Касцюкевіч (пра яго мы даскажам ніжэй): «Трэба асцерагацца такіх людзей, як Стаднік. Крумкачом будзе вісець над абранай ахвярай».

І гэтак далей, і да таго падобнае.

Мабыць, злосць да людзей нарадзілася ад безбацькоўшчыны пры двух жывых бацьках, калі ён меў патрэбу ў бацькоўскай ласцы, а натыкаўся на халодны, абыякавы позірк чужых вачэй? Маці з айчымам зачынілі перад ім дзверы свайго дома, нават замкі памянялі ў кватэры, каб ён не надакучваў ім. Мабыць...

Але ніхто і ніколі не апраўдвае злачынства. Якім бы ні аказаўся бацька, якім бы чужым ні быў айчым, ты цяпер—дарослы чалавек і нясеш адказнасць за кожны свой учынак.

Ды і людзі навокал—у любую мінуту гатовы прыйсці на дапамогу. Яго стараліся падтрымаць. Захацеў стаць слесарам - інструментальшчыкам — вучыся на здароўе! Ён вывучыўся і кінуў, пайшоў у пажарнікі. Калі ласка,—усякая праца ў нас у пашане. Потым надумаў сесці за руль — вывучылі і на шафёра. А ён—зноў кінуў. Яшчэ раз дапамаглі,—авалодаў прафесіяй вадзіцеля малагабарытных суднаў. Але ўсё гэта ішло на шкоду грамадству. Як устанавіў суд, з часу вызвалення са зняволення да затрымання (а гэта 6 гадоў 7 месяцаў) Стаднік, па-першае, пяць разоў мяняў месца работы і, па-другое, на працягу 2 гадоў 5 месяцаў наогул не працаваў. З апошняга месца—з аўтабазы Мінскага гарадскога аддзела аховы здароўя—звольнены за сістэматычныя парушэнні працоўнай дысцыпліны. Пагарда да працы, імкненне да лёгкага бесклапотнага жыцця, запоўненага папойкамі, забавамі, і прывялі Стадніка да новага злачынства. Асноўнай крыніцай існавання стала для яго спекуляцыя.

Ён выпрацаваў уласнае «крэда»: «Рабіць грошы, не працуючы». Але, усведамляючы злачыннасць сваіх камерцыйных аперацый, рыхтаваў сябе не толькі да ўдачнага зыходу: «Буду мець усё або нічога». Гэта асцярожнае рэалістычнае «або» палохала яго самога—ён з усіх сіл стараўся не пакідаць слядоў, не прыцягнуць увагу органаў, якія стаяць на варце законнасці.

У галерэі падсудных, якія прайшлі перад суддзёю Зяленскім за ўсю яго багатую практыку, Стаднік вылучаецца нейкай адчайнай нахабнасцю, усёпаглынальнай страсцю выкалаціць хоць капейку з кожнага, з кім зводзіў яго лёс.

Пачынаў асцярожна, з малога: на рынку літоўскага гарадка Алітус прадаў рублёвую маторную «зорачку» да матацыкла за два рублі, а шасцірублёвы акумулятар — за дзевяць рублёў. Дэфіцытны тавар (нават самая дробязь—тая ж рублёвая матацыклетная «зорачка») — што замкнёнае кола: каб не пераплочваць, трэба купіць у магазіне, але яе там няма, значыцца—даводзіцца пераплочваць. Вось і жывіцца адзін спекулянт за кошт дзесяткаў і соцень сумленных людзей, якія маюць патрэбу ў дэфіцытных таварах. Першая здзелка дала толькі чатыры рублі прыбытку, але яна натхніла. Стаднік паверыў у камерцыйны бізнес. І — пайшло, паехала...

Купіўшы ў мінскім магазіне «Аўтамабілі» чатыры аўтапакрышкі з камерамі па 62 рублі, ён прадаў іх па сотні за штуку, паклаў ва ўласную кішэню 152 рублі. Адзінаццацірублёвыя парасоны ішлі па дваццаць пяць рублёў. Гэта яшчэ што! Нават калі выгада складала 20—30 капеек, Стаднік энергічна займаўся купляй-продажам.

Рынкі збыту ён меў у Літве і Грузіі. Аднак значная аддаленасць ад месцажыхарства навяўленага бізнесмена патрабавала надзейнага і хуткага перамяшчэння, такой жа надзейнай і хуткай дастаўкі тавараў. Злачынная вытанчанасць Стадніка, здавалася, не ведала межаў.

У пенсіянера А. Гурбо, пра якога Стаднік ніколі не чуў, якога ніколі не бачыў, падышла чарга на машыну. А грошай пад рукой, як на грэх, не аказалася. Выручыў пляменнік — Вячаслаў Касцюкевіч. Купіў пенсіянер за яго грошы машыну — новенькія «Жыгулі». Але тут пляменнік на паклон прыйшоў: дай, просіць, пакуль паезджу. І Гурбо напісаў даручэнне, засведчыў яго ў натарыяльнай канторы: маўляў, давяраю тав. Касцюкевічу карыстацца машынай на працягу 20 дзён—да 24 чэрвеня («июня»). Ну, а за пляменніка ўзяўся Стаднік. Дваццаць дзён праляцелі хутка. Стаднік (машынай кіраваў ужо ён, бо заваяваў поўнае давер'е ў Касцюкевіча) і не падумаў вяртаць аўтамабіль гаспадару. У слове «июня» на даручэнні ён выправіў «н» на «л» і працягваў смела катацца на чужых «Жыгулях». Маршруты ранейшыя — Літва, Грузія. Туды вёз тавар, назад — грошы. Спекуляваў, чым давядзецца, што трапляла пад руку: імпартнымі анучамі—халатамі, джынсамі, трусамі, падцяжкамі, айчынным шырпатрэбам—кававаркамі, чаем, шкарпэткамі; больш саліднымі рэчамі — паляўнічымі ружжамі, транзістарамі, абуткам, але пераважна аўтамотазапчасткамі. Вывучаны судом спіс адабраных пры затрыманні Стадніка тавараў, прызначаных для перапродажу, заняў адзінаццаць старонак тэксту!

Агідны твар дзялка-камбінатара адкрыўся поўнасцю, калі разам з запчасткамі ён пачаў гандляваць... дзяўчатамі. Сам вельмі несумленны ў адносінах да жанчын, Стаднік вазіў на поўдзень маладых прыяцелек і ўладкоўваў іх да знаёмых і незнаёмых мужчын. Зразумеўшы сапраўдны намер Стадніка, дзяўчаты без аглядкі ўцякалі з каўказскіх узбярэжжаў.

Але вось закончыўся тэрмін фальшывага даручэння на «Жыгулі». Стаднік фабрыкуе новае, ужо на сваё прозвішча. Штампы і пячаткі ён наносіць спосабам вільготнага капіравання з фотапаперы.

Першым затрымалі Касцюкевіча. Заразіўшыся ад Стадніка прагай нажывы, ён папаўся на брудных справах у Адэсе і там жа быў асуджаны. З кватэры Касцюкевіча Стаднік крадзе дакументы і ездзіць на чужой машыне. Вось калі маці Вячаслава Касцюкевіча піша ў міліцыю: трэба асцерагацца такіх людзей, як Стаднік...

А той купляў анучы, запчасткі, матацыклы і ва ўсю гандляваў імі. Здаралася і так, што пакупнікі ўрэшце не бачылі ні грошай, ні тавару, ні Славіка.

Абмяркоўваючы пытанне аб меры пакарання, суд улічваў грамадскую небяспеку зробленага, асобу злачынцы, яго антыграмадскі, паразітычны лад жыцця, ранейшыя судзімасці. Тры гады пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў калоніі строгага рэжыму, канфіскацыяй маёмасці і спагнаннем у карысць дзяржавы 527 рублёў 77 капеек—такі прыгавор народнага суда.

Крымінальная справа № 9080 па абвінавачванню Стадніка Уладзіслава Іванавіча ў спекуляцыі, камерцыйным пасрэдніцтве і падробцы дакументаў з мэтай асабістай нажывы перададзена ў судовы архіў. У Зяленскага—новыя справы, новыя клопаты. І ўсё ж я прашу Мікалая Давыдавіча зноў вярнуцца да справы Стадніка. Я ўжо ведаю: кожная справа ў суддзі захоўваецца ў памяці ва ўсіх дэталях, таму што кожная справа—велізарная работа, якая вымагае значнага інтэлектуальнага і фізічнага напружання.

Суд вынес прыгавор злачынцу, а мне хацелася пачуць прыгавор, які Зяленскі вынес, калі можна так сказаць, злачынству. Адкуль яны ў нас бяруцца, гэтыя Стаднікі, што садзейнічае іх нахабнасці і подласці?

Злачынца саджае дзяўчат у машыну, і яны спакойна едуць з амаль незнаёмым чалавекам за тысячы кіламетраў. Разам п'янствуюць, гуляюць. У крытычны момант абураюцца яго бруднымі намерамі і ўцякаюць. Зрэшты, не ўсе абураліся і не ўсе ўцякалі. На захаванне да прыяцеляў і прыяцелек Стаднік прыносіць чамаданы, пакункі. Усе ведаюць, што гэта — «тавар», але паслухмяна захоўваюць і маўчаць. П'янства, лёгкае, вясёлае жыццё — на гэта ішлі ахвотна. Жыве на непрацоўныя даходы? Так, і пра гэта ведалі, але маўчалі: не наша справа. І баяліся злоснага, помслівага Славіка. А ўвогуле ж, кожнага ў кампаніі Стадніка непакоіў толькі ўласны дабрабыт. Ніхто не адмаўляўся выпіць і пажывіцца за чужы кошт. Ён шукаў менавіта такіх людзей, далёкіх ад нашай маралі. Калі злачынцу цяпер вельмі цяжка, практычна немагчыма знайсці сабе актыўнага памочніка, то вось такіх, раўнадушных, яшчэ шмат. Вялікая стаўка рабілася Стаднікам на разявак. Не задумваючыся, перадаюць яны ледзь не першаму сустрэчнаму буйныя сумы грошай на набыццё дэфіцытных тавараў. І застаюцца, як кажуць, з носам. І няхай асуджаны адзін Стаднік — на лаве падсудных сёння п'янства, баязлівасць, амаральшчына, галавацяпства, якія жывяць стаднікаў. Вынясем жа ім наш бязлітасны прыгавор.

Герман КРУГЛОЎ.

г. Мінск.

Заканчэнне. Пачатак гл. у № 24 за 11 чэрвеня.

# ЧАСОПІСЫ Ў ЛІПЕНІ

**«ПОЛЫМЯ»**

Закончана друкаванне вершаў з кнігі народнага паэта Беларусі М. Танка «Дарога, закалыханая жытам» (пачатак у № 9, 1973, № 9, 1974, № 8, 1975).

Паэзія прадстаўлена таксама вялікай падборкай Г. Пашкова «Чырвоны жаваранак».

Змешчаны апавяданні М. Вышынскага «Трэцяя сустрэча» і «Развітанне», лясная казка Н. Кедалавай «Брат мой рыжык».

«Новыя пераклады»... У гэтым раздзеле вершы П. Нэруды ў перакладзе А. Вялюгіна і Г. Кляўко, а таксама апавяданні польскіх празаікаў — Я. Івашкевіча «Апавяданне з сабакам», Э. Брыля «Мыццё ног», Т. Ружэвіча «На дыпламатычным пасту», Э. Кабатца «Баран пані Матусовай», Т. Новака «Сад», Л. Прорака «Пярсцёнак», Ю. Кавальца «У родным доме» (пер. Я. Брыля).

Друкуецца заканчэнне нарыса І. Дуброўскага «У пошуках залатога дна».

У раздзеле «Навука» артыкул акадэміка АН БССР, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі А. Вочара «Біхімія на гарозонтах будучыні».

Урывак з дзённіка П. Глебкі «Дарога выпрабаванняў» падрыхтавала да друку жонка паэта Н. Глебка.

В. Івашчанка напісаў творчы партрэт В. Адамчыка — «Жыццё, выказанае словам».

Л. Арабей у артыкуле «Песні гневу і барацьбы» піша пра Цётку («Цётка ў рэвалюцыі 1905—1907 гадоў»).

В. Бечык рэцэнзуе кнігу «Балады мужнасці і адвагі», якая выйшла ў Кіеве — «Голас душы народнай», В. Каваленка — выбранае Ул. Юрэвіча «Абрысы» — «Сталыя абрысы творчай біяграфіі», Б. Бур'ян—паэтычны зборнік А. Грачанікава «Начная змена» — «Каб выпраменьваць энергію».

**«БЕЛАРУСЬ»**

Трыццацідвухгоддзю з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прысвечан рэдакцыйны артыкул «Са славай бацькоў герояў».

Вялікая падборка матэрыялаў «На арбіце пяцігодкі».

Змешчаны артыкулы кандыдата эканамічных навук Б. Ульянні «Эканамічная стратэгія партыі», Ул. Федарэнчыка «Компас у лабірынце ведаў», кандыдата філасофскіх навук А. Краснова «Падчыстка рэлігіі», кандыдата юрыдычных навук, пракурора горада Мінска Л. Дзядкова «Хуліганства—сацыяльнае зло», рэпартаж Бр. Ліс «Абновы Наднямоння», нарыс А. Шлега «Дарога ў Прасняк».

Проза прадстаўлена творамі А. Куланоўскага, І. Стадольніка, нямецкага пісьменніка В. Кольхаза.

Друкуюцца вершы Я. Янішчыц, П. Марціновіча, А. Мазура, В. Шымука, А. Русецкага, Дз. Паўлычкі, якога пераклаў Ю. Свірка.

Слова пра Ул. Юрэвіча з нагоды 60-годдзя пісьменніка гаворыць Ул. Анісковіч — «Апантаны працай, акрылены словам».

Пра ансамбль «Харошкі» расказваецца ў нататках Л. Аляксеевай.

Кнігі Г. Кісялёва «Паплечнік Каліноўскага», Г. Далідовіча «Цяпло на першацвет», Хв. Жычкі «Партызанскі праспект», Ю. Сапажкова «Несущие свет» рэцэнзуюць Ю. Бажко, М. Досін, К. Камейша, А. Шаўня.

ГРОДНА. Драматычны тэатр.

Фота Ул. КРУКА.

# ПЕЧКІН ЯРАМІР АЛЯКСАНДРАВІЧ

Беларускае савецкае мастацтва панесла цяжкую страту. На 51 годзе жыцця, пасля цяжкай і працяглай хваробы памёр член Саюза мастакоў БССР, вядомы скульптар Ярамір Аляксандравіч Печкін.

Я. А. Печкін нарадзіўся 5 мая 1926 года ў Ленінградзе. У 1952 годзе скончыў Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна Акадэміі мастацтваў СССР. З 1958 года актыўна ўдзельнічаў у культурным жыцці рэспублікі. Яго скульптурныя творы з поспехам экспанаваліся на ўсесаюзных і рэспубліканскіх выстаўках.

У галіне манументальнай пластыкі Я. А. Печкін выканаў помнік У. І. Леніну ў Рослаўлі, Ф. Э. Дзяржынскаму ў Бабруйску, Герою Савецкага Саюза Ф. А. Смалячкову ў Быхаве, абеліск камсамольцам-падпольшчыкам ў Обалі і іншыя. Ён з'яўляецца адным з саўтараў манумента воінам Савецкай Арміі, партызанам і падпольшчыкам у Віцебску.

Разам з творчай работай Я. А. Печкін займаўся педагагічнай дзейнасцю ў Беларускім дзяржаўным політэхнічным інстытуце.

Светлая памяць аб чулым чалавеку і таленавітым мастаку назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

**Праўленне Саюза мастакоў БССР.**

*Пенсіі кансультацыі*

# Матэрыяльная адказнасць рабочых і служачых

**1. У якіх выпадках прадпрыемства, арганізацыя мае права спісваць з балансу прычыненыя страты?**

Прадпрыемства, арганізацыя маюць права спісваць з балансу маральна састарэлыя, паношаныя і непрыгодныя для далейшага выкарыстання абсталяванне, транспартныя сродкі, інвентар і інструмент, калі аднаўленне гэтай маёмасці немагчыма або эканамічна немэтазгодна і яно не можа быць рэалізавана. Для гэтага загадам кіраўніка ствараецца кампетэнтная камісія, якая пасля старанага агляду складае адпаведны акт.

Акты на спісанне, па якіх сума страт складае больш за 500 рублёў, прадпрыемства накіроўвае на зацвярджэнне міністэрству або ведамству.

Прадпрыемства мае права спісваць у страту, з паведамленнем пра гэта органу, якому падпарадкоўваецца:

дэбіторскую запазычанасць, па якой сышла іскавая даўнасць;

прысуджаныя даўгі, па якіх вернуты выканаўчыя дакументы з зацверджаным судом актам аб неплацежаздольнасці адказчыка і немагчымасці спагнаць з яго маёмасці;

іншая запазычанасць, прызнаная прадпрыемствам безнадзейнай;

недастачы каштоўнасцей звыш нормы трат, страты тавараў, матэрыялаў і прадукцыі — у межах да 100 рублёў, калі канкрэтныя віноўнікі не ўстаноўлены;

даўгі па недастачах таварна-матэрыяльных каштоўнасцей на суму да 100 рублёў, у спагнанні якіх адмоўлена судом з прычыны неабгрунтаванасці іску.

Спісваць з балансу страты можна толькі пасля старанной праверкі (з удзелам грамадскіх арганізацый) прычын страт, выяўлення вінаватых у гэтым асоб.

Калі ёсць вінаватыя асобы ў прычыненні ўрону, адміністрацыя абавязана ўжыць захады, каб іх спагнаць. Парадак спагнання такі.

Калі ўрон не перавышае $^1/_3$ тарыфнай стаўкі (акладу) работніка і ёсць яго пісьмовая згода на ўтрыманне, то адміністрацыя ў двухтыднёвы тэрмін робіць утрыманне сваёй уладай. У астатніх выпадках яна абавязана прад'явіць іск у судзе.

Іскі прад'яўляюцца:

у месячны тэрмін з дня выяўлення ўрону — пры спагнанні не больш чым $^1/_3$ тарыфнай стаўкі, аклада (калі работнік не даў пісьмовай згоды);

у гадавы тэрмін — у астатніх выпадках.

**2. У якім памеры на работніка можна ўскласці матэрыяльную адказнасць за страту музычнага інструмента?**

Заканадаўствам устаноўлена два віды матэрыяльнай адказнасці: абмежаваная і поўная.

Што датычыць адказнасці за страту інструмента, то на работніка, вінаватага ў страце, ускладаецца поўная матэрыяльная адказнасць.

**3. У выніку аўтаварыі вадзіцель прычыніў страту арганізацыі, паламаўшы аўтамашыну. Якую матэрыяльную адказнасць ён нясе за гэта?**

Гэта залежыць ад шэрагу акалічнасцей. Калі вадзіцель за аўтаварыю прыцягваўся да крымінальнай адказнасці або зрабіў яе не пры выкананні працоўных абавязкаў, то ён нясе поўную матэрыяльную адказнасць. Калі ж аварыя зроблена пры выкананні працоўных абавязкаў хоць і па віне работніка, але без дапушчэння крымінальна-карных дзеянняў, то з яго можна спагнаць страты ў памеры не больш як $^1/_3$ тарыфнай стаўкі (а не сярэдняга заробку).

**А. ХВАСТОЎ,**
**кандыдат юрыдычных навук.**

# *Надрукавана ў «Настаўніцкай газеце»*

**Нумар газеты за 23 чэрвеня пачынаецца перадавым артыкулам «Дзейнасць» эстатычнага выхавання». На першай старонцы друкуецца справаздача з VI з'езда пісьменнікаў СССР.**

**Пад рубрыкай «Пошук, творчасць, ініцыятыва» змешчан артыкул настаўніка біялогіі Бараўлянскай сярэдняй школы Мінскага раёна К. Піліпюка «Выпрацуй густ», пад рубрыкай «Наш лад жыцця» — артыкул кандыдата філасофскіх навук, дацэнта Мінскага педінстытута замежных моў А. Краснова «Шчасце, якое яно?»**

**Пра экзамены ў школах рэспублікі расказваецца ў карэспандэнцыі старшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР М. Ціханчука «Дзень сённяшні — дзень заўтрашні».**

**Пытанням прафарыентацыі прысвечан артыкул старшага навуковага супрацоўніка Інстытута філасофіі і права АН БССР, кандыдата філасофскіх навук М. Бароўскага «Твая дарога ў акіяне прафесій».**

**З артыкулам «Педагог расце ў калектыве» выступае намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Баравіцкай сярэдняй школы Кіраўскага раёна, заслужаная настаўніца БССР А. Назарчук. Пра агляд-конкурс пазашкольных устаноў рэспублікі расказваецца ў замалёўцы «Шчыруюць юннаты» спец. карэспандэнта газеты М. Шлыка.**

**На апошняй старонцы друкуецца артыкул заслужанага дзеяча культуры БССР Д. Жураўлёва «Мастацкі кіраўнік», у якім гаворыцца пра педагога, кіраўніка хору школы № 115 г. Мінска М. Хаўхлянцава.**

**Пад рубрыкай «Часопісы ў чэрвені» расказваецца пра змест часопісаў «Народная асвета», «Беларусь», «Рабочая смена» і «Вясёлка».**

# ХАЦЯ ПІСЬМО І НЕ АПУБЛІКАВАНА

Старшы лабарант Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі Акадэміі навук БССР Ф. Левін даслаў у рэдакцыю пісьмо, у якім цікавіцца, ці будзе выдавацца ў рэспубліцы папулярная серыя «Нашы выканаўцы» пра выдатных спевакоў Беларусі і ў прыватнасці пра Л. Александроўскую, І. Балоціна, М. Дзянісава, Р. Млодэк, Т. Ніжнікаву і іншых.

Пісьмо гэта было накіравана ў Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Намеснік старшыні камітэта Ф. Барушка паведаміў рэдакцыі, што выдавецтвы «Беларусь» і «Мастацкая літаратура» за апошнія гады выпусцілі кнігі М. Модэля «Л. П. Александроўская», Ул. Няфёда «У. Уладамірскі» і «П. Малчанаў», Я. Рамановіча «Народны артыст СССР Б. Платонаў», А. Скібнеўскага «Народны артыст СССР А. Ільінскі» і іншыя. Рыхтуецца да выдання кніга ўспамінаў Л. Александроўскай.

Выдавецтва «Беларусь» мае намер пазнаёміць чытачоў і аматараў мастацтва ў першую чаргу з калектывамі выканаўцаў і іх мастацкімі кіраўнікамі. Пасля завяршэння гэтай работы і па меры паступлення рукапісаў выдавецтва пачне рыхтаваць кнігі пра асобных найбольш выдатных выканаўцаў.



На ціхай рачулцы.

Фотаэцюд В. БЫСАВА.

# Віцебскае музычнае вучылішча

**аб'яўляе прыём навучэнцаў на 1976/77 навучальны год на першы курс дзённага аддзялення па спецыяльнасцях:**

**1. Фартэпіяна;**

**2. Струнныя інструменты — скрыпка, альт, віяланчэль, кантрабас;**

**3. Духавыя і ўдарныя інструменты — флейта, кларнет, габой, фагот, валторна, трамбон, туба, труба, ударныя інструменты;**

**4. Народныя інструменты — баян, домра, цымбалы, балалайка, акардэон;**

**5. Вакальнае аддзяленне (спевы);**

**6. Харавое дырыжыраванне;**

**7. Тэорыя музыкі.**

**Вучылішча рыхтуе выкладчыкаў дзіцячых музычных школ; артыстаў аркестра і хору, кіраўнікоў самадзейнага духавога аркестра, аркестра народных інструментаў, дырыжораў хору, выкладчыкаў спеваў у агульнаадукацыйнай школе.**

**У музычнае вучылішча на дзённае аддзяленне прымаюцца грамадзяне СССР абодвага полу ва ўзросце да 30 гадоў, якія скончылі няпоўную сярэднюю школу (8 класаў), а таксама пры наяўнасці асобых музычных дадзеных — поўную сярэднюю школу (10—11 класаў). На вакальнае аддзяленне музычнага вучылішча прымаюцца асобы, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту.**

**Паступаючыя ў музычнае вучылішча на ўсе аддзяленні, акрамя вакальнага, павінны мець музычную падрыхтоўку, якая адпавядае аб'ёму ведаў дзіцячай або вячэрняй музычнай школы.**

**Заявы аб прыёме ў музычнае вучылішча прымаюцца з 1 чэрвеня па 5 ліпеня.**

**Уступныя экзамены праводзяцца з 6 па 20 ліпеня.**

**Залічэнне ў склад навучэнцаў праводзіцца з 21 па 24 ліпеня.**

**Заява аб прыёме падаецца на імя дырэктара музычнага вучылішча па адзінай форме. У заяве павінна быць указана абраная паступаючым спецыяльнасць. Да заявы прыкладаюцца:**

**— дакумент аб васьмігадовай або сярэдняй адукацыі (у арыгінале);**

**— медыцынская даведка па форме № 286, выдадзеная школьным урачом або лячэбна-прафілактычнай установай па месцу жыхарства;**

**— чатыры фотакарткі (здымкі без галаўнога ўбору, памерам 3×4 см);**

**— выпіска з працоўнай кніжкі, завераная начальнікам аддзела кадраў або кіраўніком прадпрыемства, установы, арганізацыі, прадстаўляецца маючымі стаж практычнай работы не менш як два гады.**

**Пасля прыбыцця ў навучальную ўстанову паступаючы прад'яўляе асабіста: пасведчанне аб нараджэнні або пашпарт, ваенны білет (ваеннаабавязаныя запасу) або прыпісное пасведчанне (асобы прызыўнога ўзросту), аб чым робіцца адпаведны запіс у асабістай справе паступаючага.**

**Паступаючыя ў музычнае вучылішча здаюць прыёмныя экзамены па наступных дысцыплінах:**

**1. Спецыяльнасць;**

**а) выкананне праграмы;**

**б) праверка ведаў музычна-тэарэтычных прадметаў (сальфеджыо і музпісьменнасць);**

**2. Руская мова (дыктант);**

**3. Руская мова і літаратура (вусна).**

**Заўвага: скончыўшыя 10 класаў сярэдняй школы здаюць экзамены па рускай мове і літаратуры (сачыненне) і па гісторыі СССР (вусна). Ад здачы экзаменаў па спецыяльнасці ніхто з паступаючых не вызваляецца.**

**Прыёмныя экзамены ў музычнае вучылішча праводзяцца ў наступным парадку:**

**выкананне праграмы,**

**праверка ведаў музычна-тэарэтычных прадметаў,**

**руская мова (дыктант),**

**руская мова і літаратура (вусна).**

**Асобы, якія не вытрымалі экзамена па спецыяльнасці, да далейшай здачы экзаменаў не дапускаюцца.**

**Яўка на экзамен па выніку вучылішча.**

**Навучэнцы забяспечваюцца стыпендыяй на агульных падставах.**

**Іншагароднія інтэрнатам не забяспечваюцца.**

**Кансультацыі для паступаючых з 25 чэрвеня згодна з раскладам.**

**Адрас вучылішча: г. Віцебск, вул. Савецкая, 23-а.**

# СУСТРЭЧЫ. ПОШУКІ. АДКРЫЦЦІ.

П'ЕСА ПРА НЕЗАБЫЎНЫЯ ГАДЫ

●

«СТВАРЭННЕ СВЕТУ» НА ПОЛЬСКАЙ СЦЭНЕ

●

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

## ПРЫЗНАННЕ І АПЛАДЫСМЕНТЫ

Як вядома, кожныя два гады ў польскім горадзе Лодзі адбываюцца міжнародныя Балетныя сустрэчы. Сёлета савецкую харэаграфію на іх прадстаўлялі артысты Дзяржаўнага Вялікага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР. Крытык Павел Хіноўскі апублікаваў у газеце «Жыце Варшавы» (№ 139) артыкул-агляд «Фестывальнае спаборніцтва». Гаворачы пра дасягненні нашых артыстаў, аўтар піша пра вялікі і заслужаны поспех нядаўняй прэм'еры ў Мінску балета «Стварэнне свету» на музыку А. Пятрова ў інсцэнізацыі Валянціна Елізар'ева і заўважае, што эксперыментатарскі пошук характарызуе гэтага харэографа і ў нумарах, што выконваліся ў Лодзі перад надзвычай патрабавальнай аўдыторыяй. У прыватнасці, крытык дае высокую ацэнку «Кармэн-сюіце» з музыкай Р. Шчадрына, спектаклю, «па-майстэрску скампанаванага маладым мінскім пастаноўшчыкам». У поспеху праграмы вялікая заслуга выканаўцаў — Людмілы Бржазоўскай, Людмілы Сінельнікавай, Людмілы Цярэнц'евай, Юрыя Траяна, Уладзіміра Камкова і Уладзіміра Іванова. Асобна падкрэслена віртуознасць Віктара Саркіс'яна, які паводле П. Хіноўскага «сваёй адмысловай тэхнікай танца, якая мяжуе момантамі з акрабатыкай, надзвычай спадабаўся гасцям фестывалю». Такое прызнанне поспеху на спаборніцтве міжнароднага маштабу сведчыць пра плённыя творчыя шуканні нашай балетнай сцэны.

Б. ГУК.

## Падарунак генерала

Стаіць у Бабруйскім краязнаўчым музеі бюст Уладзіміра Ільіча Леніна. Ён па-майстэрску выразаны з дрэва — чорнага дуба — самадзейным скульптарам Парфірыем Логінавічам Раманенкам. Вельмі цікавая гісторыя гэтага музейнага экспаната.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны Парфірый Логінавіч падарыў бюст У. І. Леніна свайму брату — генералу Чырвонай Арміі Пракопу Логінавічу Раманенку.

48-я армія, якую ўзначальваў генерал, граміла гітлераўцаў пад Масквой і Сталінградам, дабівала ў «Бабруйскім катле», пад Познанню і Берлінам.

Калі адгрымелі салюты Перамогі, браты Раманенкі ўрачыста святкавалі радасную сустрэчу ў родным горадзе Бабруйску. І тут баявы генерал з паходнага чамадана дастаў братаў падарунак — бюст Уладзіміра Ільіча, з якім не расставаўся ў доўгія гады вайны.

Пасля смерці Пракопа Логінавіча Раманенкі жонка і брат яго падаравалі бюст Бабруйскаму краязнаўчаму музею.

В. ЛАУРЫНОВІЧ.

## «СВІЦЯЗЬ» ЕДЗЕ Ў ЧЭХАСЛАВАКІЮ...

Для ўдзелу ў традыцыйным Міжнародным фестывалі фальклорных самадзейных калектываў у Чэхаславакію выехаў народны ансамбль песні і танца «Свіцязь» з Навагрудскага раёна.

— Наш калектыў створан у 1966 годзе, — сказала ў гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА мастацкі кіраўнік ансамбля Е. Шафарэвіч. — У яго складзе — рабочыя, калгаснікі, служачыя, студэнты, школьнікі. Ансамбль выступаў у Маскве, Мінску, Польскай Народнай Рэспубліцы. Тры гады назад яму было прысвоена званне народнага.

У брацкай Чэхаславакіі калектыў пакажа абноўленую праграму, у якую ўваходзяць беларускія народныя танцы «Крыжачок», «Мініта», музычная кампазіцыя «Свята пад Свіцяззю», вакальна-харэаграфічная сцэна «Дажынкі» і іншыя нумары. Акрамя ўдзелу ў фестывалі, ансамбль зробіць гастрольную паездку па краіне.

БЕЛТА.

# «І ЛІТАРАТУРА — ГЭТА НАСТАЎНІЦТВА...»

Васіль Гарбацэвіч. Варта толькі назваць гэтае імя, як у кожнага тэатрала ў думках адгукнецца назва адной з першых беларускіх савецкіх п'ес — «Чырвоныя кветкі Беларусі». Паэтычная, акрыленая назва! Так, гэта яна была пазначана на афішы Першага БДТ, які цяпер носіць імя Янкі Купалы, у снежні 1923 года. Тады на прэм'еру ішлі гледачы, якія пазнавалі ў персанажах п'есы і спектакля сябе, сваіх таварышаў па барацьбе, суседзяў. Праўда, са сцэны часам гучалі падкрэслена агністыя, па-мітынговаму ўзнёслыя словы герояў, але і гэта было ў духу часу, калі маладое мастацтва маладой савецкай рэспублікі па гарачых слядах падзей на ўвесь голас славіла змагароў за ленінскія ідэалы. Гэта была драма: аднаўлялася дзейнасць геройчных дукорскіх партызан, падпольшчыкаў - камсамольцаў ва ўмовах варожай акупацыі, было паказана класавае расслаенне ў выпрабаваннях грамадзянскай вайны. Пастаўлены Еўсігнеем Міровічам у дэкарацыях Аскара Марыкса спектакль быў прасякнуты песнямі той пары, меў рэалі, якія пераконвалі гледачоў у праўдзе таго, што адбывалася на сцэнічных падмостках.

Дарэчы, даследчык драматургіі доктар мастацтвазнаўства А. Сабалеўскі слушна адзначае, што жанр меладрамы, аб якім так зацікаўлена гаварыў А. Луначарскі, у рэвалюцыйныя гады, на бурных этапах народнага жыцця, найбольш эфектыўна ўздзейнічае на масы, якіх вабіць наогул «тэатр кантрастаў, шырокай позы, гучнага слова, напружанага хараства і карыкатурнай акрэсленасці». І першыя творы нашай драматургіі 20-х гадоў мелі на сабе выразны адбітак гэтых якасцей. Прасякнутыя рамантыкай барацьбы, рэзка падзяляючы персанажаў на тых, хто з намі, і на тых, хто супраць нас, такія п'есы і спектаклі на раннім этапе станаўлення сцэнічнага мастацтва адыгрывалі важнае значэнне.

Цяпер, калі прыгадваеш шлях беларускага савецкага тэатра, дык у саміх гэтых фактычных дадзеных — год 1923, «Чырвоныя кветкі Беларусі» на сцэне першага ў гісторыі прафесіянальнага тэатра беларусаў — адчуваеш штосьці сімвалічнае. А сама тэматыка твора Васіля Гарбацэвіча стала адной з вядучых у нашым мастацтве наогул. Гады грамадзянскай вайны, паход Антанты супраць маладой савецкай дзяржавы, а потым выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны — сама рэчаіснасць падказвала Я. Коласу і К. Крапіве, В. Сташэўскаму і М. Грамыку, А. Макаёнку і А. Маўзону, В. Быкаву і К. Губарэвічу, аб чым трэба пісаць, каб раскрыць крыніцы патрыятычных подзвігаў славутых і безыменных герояў падполля, партызанскіх рэйдаў. І тут сярод першых вопытаў была і застаецца п'еса «Чырвоныя кветкі...»

Па прафесіі і па прызванню Васіль Савіч Гарбацэвіч — настаўнік. Ён душой адчувае патрэбу перадаваць свае веды, адкрываць вочы на хараство і складанасць жыцця, далучаць да глыбінь навукі юныя сэрцы і юны розум. Заслужаны настаўнік Беларускай ССР, ён ганарыцца сотнямі сваіх вучняў. Для яго і літаратурная творчасць з'яўлялася і з'яўляецца працягам настаўніцтва. У вобразнай форме, праз эмацыянальнае ўздзеянне на чытача і на гледача драматургія робіць тое ж самае, што і ўрок — у школе, у студэнцкай аўдыторыі, на лекцыі. Так думае сам В. Гарбацэвіч. Чалавек ён дасведчаны і чулы, таму да яго і цяпер, калі яму за 80 гадоў, цягнуцца душы прагных да ведаў маладых і сталых людзей. Мудры і відушчы, ён падзеліцца тым, што ведае, дасць параду, падкажа кніжкі, дзе можна падрабязна прачытаць аб тым, што цябе хвалюе і цікавіць.

А колькі радасці — сустрэчы з былымі тваімі выхаванцамі, што не забываюць дарогі ў хату дзядзькі Васіля, любімага настаўніка, і часта пераступаюць яе парог у Дукорах. Вось і гэты здымак замацаваў на фатаграфічным адбітку такую сустрэчу. Справа налева — Герой Савецкага Саюза У. Е. Лабанок, В. С. Гарбацэвіч, заслужаны настаўнік Беларускай ССР І. Ц. Зяневіч; на другім плане — карэспандэнт «Тэатральнага Мінска» І. Я. Гарбацэвіч.

В. ШЫПІЦА.

## ГЕРОІ НЕ ПАМІРАЮЦЬ

Восенню мінулага года вучань Гадылёўскай сярэдняй школы Быхаўскага раёна Міхаіл Барысевіч знайшоў магілу савецкіх воінаў, якія мужна абаранялі Дняпроўскі рубеж у грозным 1941 годзе. Пры перазахаванні астанкаў быў выяўлены медальён. У ім добра захаваўся адрас лейтэнанта Паўла Янаўлевіча Дубавога. Пачаліся пошукі родных і блізкіх загінуўшага. Адно з пісем рабят было надрукавана ў газеце «Савецкая Украіна». На яго адгукнулася сястра П. Я. Дубавога — Ганна Янаўлеўна Крыкунова. Потым паведамілі пра сябе дачка і сын загінуўшага лейтэнанта Лідзія і Анатоль, якія жывуць у Адэскай вобласці. Ад іх стала вядома, што жонка лейтэнанта Дубавога з'яўляецца стрыечнай сястрой маці героя — мападагвардзейца Алега Кашавога.

І вось дзеці лейтэнанта П. Я. Дубавога — Лідзія Паўлаўна і Анатоль Паўлавіч — прыехалі разам з сем'ямі на магілу бацькі. З незвычайнай цеплынёй сустракалі жыхары пасёлка Гадылёва дарагіх гасцей. Каля помніка, дзе пахаваны мужны афіцэр, адбыўся шматлюдны мітынг.

Затым дзеці лейтэнанта Дубавога пабывалі на месцах жорсткіх баёў, якія вёў 292-гі стралковы полк былой 187-й стралковай дывізіі, у якой мужна змагаўся іх бацька, наведалі музей школы.

М. ЛЕУЧАНКА,
супрацоўнік раённай газеты «Маяк Прыдняпроўя».

ГОСЦІ МІНСКА

Народны артыст СССР лаўрэат Ленінскай прэміі С. Рыхтэр выступіў нядаўна ў Дзяржаўнай філармоніі з сімфанічным аркестрам Беларускай ССР.

НА ЗДЫМКУ: С. Рыхтэр.

Фота Ул. КРУКА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 01235

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33 44 04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24 62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33 24 62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24 62, аддзела пісем і масавай работы — 33-22-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Хведар ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Барыс БУР'ЯН,
Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ,
Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Ігар ДАБРАЛЮБАЎ,
Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА,
Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара),
Уладзімір НЯФЁД, Віктар ПРАТАСЕНЯ,
Іраіда САНКОВА, Мікола ТКАЧОЎ,
Юлія ЧУРКО, Віктар ШЫМУК (адказны сакратар),
Рыгор ШЫРМА